Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ШТОТЫДНЁВІК

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 6 красавіка 1990 г. № 14 (3528) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

Унумары:

НЕМЫЯ ЗВАНЫ
Чарнобыль: зямля і людзі
3

НЕФАРМАЛЬНЫЯ КАМУНІСТЫ?
З канферэнцыі «Дэмакратычнай платформы ў КПСС»
2—3

Апавяданне
Г. ДАЛІДОВІЧА

Вершы
Ю. ГОЛУБА, М. ДУКСЫ
8—12, 13

«МІНСКАЯ ВЯСНА»-90
Інтэрв'ю напярэдадні падзеі
10—11

УВАГА: ЖЫЦЦЁ ЧАЛАВЕКА!
Нататкі пракурора
12

ПАДЗВІЖНІКІ
Гісторыя стварэння аднаго музея
14

«Песняры» святкуюць юбілей... Нават не верыцца, што ўжо два дзесяткі гадоў не сыходзіць з музычнай эстрады суполка пад кіраўніцтвам Уладзіміра Мулявіна. 20 гадоў — за такі час гадуецца, выпраўляецца ў дарослае жыццё новае пакаленне. 20 гадоў на эстрадзе — гэта рэкорд даўгалецця: неспадзявана хутка тут мяняюцца павевы моды і прыхільнасці, сутыкаюцца паміж сабою размаітыя захапленні, густы. Успыхваюць, блякнуць ды знікаюць паціху чарговыя шлягеры, чарговыя куміры...

Як жа не зразумець сур'ёзнасць, не ацаніць унікальнасць мастацтва «Песняроў»! Як не ўспомніць пачатак 70-х, калі самыя розныя людзі — ад пажылых вяскоўцаў да сталічных школьнікаў і іх інтэлігентных бабуль — узрушана слухалі па радыё новы ансамбль. Беларуская песня ў выкананні хлопцаў з электрагітарамі — гэта была не проста нязвыклая, свежая, сучасная з'ява ў музыцы, у папулярным жанры. Для нас тады гэта быў смелы, прынцыповы грамадзянскі ўчынак. Нездарма ж, не жартам казалі, што «Песняры», маўляў, зрабілі для беларускай мовы больш за многіх літаратараў ды навукоўцаў...

«ЛіМ» ніколі не пакідаў без увагі творчасць гэтых музыкантаў, спраўна адгукаўся і на буйныя работы апошніх гадоў. Неўзабаве чытачы сустрэнуцца на нашых старонках з народным артыстам БССР У. Мулявіным, мастацкім кіраўніком ансамбля. А сёння на здымку — У. Мулявін (справа) і саліст І. Пеня ў час выступлення на юбілейным творчым вечары Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры».

Урачыстасць адбылася ў зале філармоніі 1 красавіка, і прыйшлі сюды слухачы розных пакаленняў. Музыканты выканалі новую праграму, прысвечаную 500-годдзю Скарыны, нагадалі песні са свайго «залатога фонду». Артыстаў віталі міністр культуры БССР Я. Вайтовіч, старшыня праўлення СТД рэспублікі М. Яроменка, маскоўскі кампазітар А. Пахмутава... Прысутнічалі на вечары першы сакратар ЦК КПБ Я. Сакалоў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР М. Дземянцей, другі сакратар ЦК КПБ А. Камай.

Фота Ул. КРУКА.

«АБ'ЯДНАЦЦА ВАКОЛ ДОБРЫХ СПРАЎ»

4 красавіка ў праўленні Саюза пісьменнікаў Беларусі адбылася сустрэча з госцем з Аўстраліі, віцэ-прэзідэнтам савецка-аўстралійскай фірмы «Развіццё» Аляксандрам ДЖАМІРЗЕ. У сустрэчы прынялі ўдзел старшыня праўлення СП БССР Максім Танк, першы сакратар праўлення Васіль Зуёнак, Васіль Быкаў і інш.

Прозвішча Джамірзе многія ў нашай краіне ўжо ведаюць. Пра дабрачынную дзейнасць гэтай вялікай сям'і (браты і сёстры Джамірзе — дзеці эмігрантаў з Савецкага Саюза) не раз пісалася ў цэнтральнай прэсе, паведамлялася па ЦТ. Члены сям'і Джамірзе пабывалі з місіяй міласэрнасці ў Арменіі пасля страшнага землетрасення, дапамагаюць дзецям-сіротам у Маскве. У час візіту М. І. Рыжкова ў Аўстралію Джамірзе прысутнічалі на ўрачыстай вячэры ў яго гонар.

А. Джамірзе ахвотна пагадзіўся адказаць на пытанні нашага карэспандэнта.

— Што прывяло вас на Беларусь?

— Мы, наша сям'я, не маглі застацца ўбаку ад чарнобыльскай трагедыі. Калі мы з радыёперадачы даведаліся пра сітуацыю ў вашай рэспубліцы, нам стала ясна: нельга сядзець склаўшы рукі. Думаю, самае страшнае, што можа быць у сучасным свеце — абыякавасць. Трагедыя Чарнобыля тычыцца нас усіх. АЭС ёсць у многіх краінах. І ніякія межы, цяпер ясна, не ўратуюць людзей пры выпадку аварыі.

Што можна рэальна зрабіць? Фірма «Развіццё» гатова пастаўляць у вашу рэспубліку высокакаларыйныя, высакаякасныя прадукты харчавання, якія проста неабходныя хворым і аслабленым радыяцыяй дзецям, — мёд, чай, сухафрукты, арэхі. Першая партыя гэтай прадукцыі ўжо чакае адпраўку з Аўстраліі... Але ёсць яшчэ шмат нявырашаных праблем. Патрэбны сховішчы на месцах, транспарт. Патрэбна і дапамога грамадскіх арганізацый, якія заняліся б, у прыватнасці, размеркаваннем прадуктаў. Мы разлічваем на падтрымку з боку Саюза пісьменнікаў Беларусі. Дэталі магчымага супрацоўніцтва абмяркоўваліся, дарэчы, на сённяшняй сустрэчы. Але праблем, падкрэсліваю, яшчэ шмат. Асабліва калі маем справу з вашымі афіцыйнымі ўстановамі.

— Значыць, дабрачынная дзейнасць сутыкаецца з перашкодамі?

— На жаль, гэта так. Нас далёка не ўсе і не заўсёды сустракаюць у вашай краіне добразычліва. У прынцыпе, гэта можна зразумець — наша дзейнасць прымушае чыноўнікаў рухацца, прымаць рашэнні. А гэта часам выяўляе некампетэнтнасць, няўменне працаваць. Але ж міжнароднае супрацоўніцтва жыццёва неабходнае. Мы павінны аб'яднацца вакол добрых спраў.

— Калі ласка, некалькі слоў пра фірму «Развіццё». Што яна з сябе ўяўляе?

— Фірма «Развіццё», маскоўскі філіял якой я ўзначальваю, займаецца распрацоўкамі ў галіне будаўнічых матэрыялаў, будаўніцтвам сельскагаспадарчых аб'ектаў, рэкультывацыяй зямель, а таксама маркетынгам і г. д. Мы спрабуем стварыць асацыяцыю (садружнасць) дробных і сярэдніх прадпрыемстваў Аўстраліі і Савецкага Саюза. У Мінску, напрыклад, плануем стварыць арганізацыю па развіцці гандлю. І, зразумела, мы зацікаўлены ў развіцці культурных сувязей паміж нашымі краінамі.



У ГОНАР СЛАВУТАГА ЗЕМЛЯКА

Выканком Віцебскага гарадскога Савета народных дэпутатаў прыняў рашэнне аб правядзенні падрыхтоўчай работы па камплектаванні фондаў і зборы сродкаў для арганізацыі музея Марка Шагала. З гэтай мэтай пры аддзеле культуры гарвыканкома адкрыты спецыяльны рахунак. Усіх жадаючых заклікаюць прыняць удзел у стварэнні музея. На рахунак № 200700328 у аблупраўленні жылсацбанка могуць пералічвацца сродкі асобнымі грамадзянамі, прадпрыемствамі, установамі, кааператывамі і іншымі арганізацыямі з адзнакай: «У фонд музея М. Шагала». Інвалютныя паступленні прымаюцца Знешэканамбанкам БССР па адрасе: Беларуская ССР, г. Мінск, Знешэканамбанк, аддзел культуры Віцебскага гарвыканкома (для музея Марка Шагала).

Матэрыялы, якія маюць адносіны да жыцця і дзейнасці мастака, накіроўваць на адрас аддзела культуры гарвыканкома: 210005, БССР, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 15.

ЯКОЙ БЫЦЬ ПАРТЫІ

З партсходу СП БССР

Сёння гэтае пытанне нельга абысці, ухіліцца ад прамога і шчырага адказу на яго. Наша грамадства нібы збілася з прамога і, здавалася, адзіна правільнага шляху і ў разгубленасці прыпынілася, каб разгледзець гарызонты, знайсці новыя арыенціры. На гаманкіх плошчах і шумных стадыёнах, дзе гудуць мітынгі, у залах і аўдыторыях, дзе ідуць спрэчкі і дэбаты, людзі шукаюць адказы на нялёгкія пытанні жыцця. Яны стаміліся ад няпэўнасці, доўгага стаяння на краі бездані, палахлівага шарахання ў бакі. Вось чаму так горача і зацікаўлена абмяркоўваецца сёння ў працоўных калектывах Платформа ЦК да маючага адбыцца з'езда партыі і праект Статута КПСС. Фактычна вырашаецца сёння лёс нашай краіны, нашай партыі. Абмеркаванне названых дакументаў адбылося 28 сакавіка і ў Доме літаратара на сходзе камуністаў СП БССР. З дакладам выступіў сакратар парткома В. Супрунчук. Сваімі меркаваннямі па Платформе ЦК КПСС і праекце Статута КПСС выказалі А. Жалязоўскі, В. Жуковіч, А. Махнач, В. Аколава, В. Хомчанка, І. Дуброўскі, Э. Валасевіч, А. Вольскі, С. Элькінд, У. Якутаў, А. Сілянкоў, Н. Пашкевіч і інш.

Думкі былі розныя. Адны з іх лічаць, што патрэбна адна партыя, моцная і здаровая, каб прадухіліць хаос і неразбярыху ў краіне. Іншыя ж стаяць на пазіцыях многапартыйнасці, маўляў, толькі гэта можа быць гарантам нашага руху наперад. Выказвалася прэтэнзія да тых, хто адною нагою ў партыі, а другою—у БНФ. Гучалі заклікі разабрацца ў сабе, вызначыць кожнаму сваю пазіцыю, азначыць сваю платформу. Выступаючыя выказалі сваё непаразуменне тым, што БНФ, які існуе рэальна, да гэтага часу не зарэгістраваны як правадзейная арганізацыя. Выказваліся думкі, што кіраўніцтву рэспублікі трэба пайсці на дыялог з БНФ.

У нас няма чалавека, сказаў у сваім выступленні А. Махнач, хто б не вітаў тое добрае, што робіць народны фронт. Аднак пазіцыі кіраўніцтва ў адносінах да яго незразумелыя. А трэба сесці і пагаварыць. Пагаварыць карэктна, каб не дапусціць раз'яднання нашага народа. Сёння нам нельга быць паасобку.

Вострай крытыцы падверглася і пазіцыя некаторых партыйных выданняў, у прыватнасці, газеты «Вячэрні Мінск» і часопіса «Политический собеседник». Хто і як кіруе гэтымі партыйнымі выданнямі? Ці тут пазіцыя неўмяшання? З гэтымі і іншымі пытаннямі камуністы звярнуліся да загадчыка

НЕФАРМАЛЬНЫЯ КАМУНІСТЫ?

Нататкі з адной канферэнцыі

Устаноўчая канферэнцыя «Дэмакратычнай платформы ў КПСС» пачалася на паўгадзіны пазней вызначанага часу. Старшыня аргкамітэта А. Жыватнюк пажартаваў: «Паколькі мы нефармалы, то нам даруецца». За жартам стаіць сумная рэчаіснасць. Да самой ідэі дэмакратычнага руху ў межах Камуністычнай партыі мясцовыя партыйныя ўлады паставіліся, мякка кажучы, насцярожана. За дзень да канферэнцыі арганізатарам было адмоўлена ў абяцаным Доме палітасветы. Сярод 200 дэлегатаў (а прадстаўлялі яны звыш чатырох тысяч камуністаў Беларусі) значыліся толькі адзін член абкома, два сакратары гаркома і 26 вызваленых партработнікаў. Запрашэнні, разасланыя ў высокія партыйныя ўстановы, былі па сутнасці праігнараваны.

Тон жа задавала тэхнічная і навуковая інтэлігенцыя. Гучалі шматлікія абрэвіятуры—НДІ, СКБ, НПА, КБТМ — і такія найменні, як «Гарызонт», «Інтэграл», «Гомсельмаш», БДУ імя Леніна, інстытут культуры, інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, Брэсцкі педінстытут, Віцебскі тэлевізійны завод і іншыя. Некаторыя з выступаючых, як дэлегаты, так і госці, прадстаўлялі партыйныя клубы рэспублікі.

Як жыць далей? Заставацца паслухмянай большасцю ці ўсё ж выйсці з палітычнай спячкі? Пытанні, якія прагучалі ў адным з выступленняў, рана ці позна ўстаюць перад кожным сумленным камуністам. І ад таго, якім будзе адказ, у многім залежыць лёс перабудовы, лёс народаў СССР.

Удзельнікі канферэнцыі ўзялі за аснову праект «Дэмакратычная платформа да XXVIII з'езда КПСС», які надрукавала газета «Правда» ў рамках дыскусійнага лістка. Мэта аб'яднання — дэмакратызацыя партыі, ператварэнне яе з таталітарнай у парламенцкую, а бліжэйшая задача — прамыя альтэрнатыўныя выбары на з'езд. На канферэнцыі гаварылася пра палітызацыю народа, пра рост актыўнасці радавых камуністаў, гучала крытыка лініі ЦК КПБ, прыводзіліся прыклады прымітыўнага маніпуліравання грамадскай думкай на старонках партыйнага друку.

Было адзначана, што ўсе грамадскія працэсы ў Беларусі праходзяць на фоне Чарнобыля — нашай нацыянальнай катастрофы. Удзельнікі канферэнцыі прынялі адпаведную рэзалюцыю, дзе гаворыцца, у прыватнасці, пра забарону ўсіх відаў гаспадарчай дзейнасці на заражанай тэрыторыі. Камуністы Гомеля выступілі з ініцыятывай адлічваць 50 працэнтаў партыйных узносаў у фонд пацярпеўшых ад аварыі.

Гаварылася і аб тым, што плюралізм, не знаходзячы легальнага выхаду, можа ператварыцца ў выбуховую сілу. Прынцып дэмакратычнага цэнтралізму паралізуе ўсё ўнутранае жыццё КПСС, робіць яе тормазам у перабудове. Няма адзінага шляху для ўсіх народаў, падкрэсліў і Ю. Шышко з ПА «Мінгандальаўтатранс». Ён выступіў за самастойнасць КПБ і рашуча сцвердзіў: не партыя і нават не ЦК КПСС былі ініцыятарамі перабудовы, а М. С. Гарбачоў.

Паколькі дэмакратычны рух у КПСС успрымаецца некаторымі як імкненне да фракцыйнасці, то, натуральна, узніклі спрэчкі пра адзінства партыі і небяспеку расколу. Тут меркаванні разышліся. Адзінства партыі давяло яе да сённяшняга стану, сказаў дацэнт Брэсцкага педінстытута І. Катляр. Апарат укамплектаваны тымі самымі асобамі, якія не так даўно ўмацоўвалі застой. Дык ці трэба з імі кансалідавацца?

Не было аднадушша і ў наступным пытанні: ці патрэбна ўсім несці груз віны за мінулыя «памылкі»? Прывяду цытаты,

РЭПЛІКА

«СИЛ БЫЛО ДОСТАТОЧНО...»

Сучасная тэхніка можа калі не ўсё, дык многае. Той, хто быў 25 лютага на шматтысячным мітынгу ў Мінску, мог пераканацца ў гэтым, убачыўшы рэпартаж аб ім па Беларускім тэлебачанні. З дапамогай камеры з шырокавугольным аб'ектывам стваралася ўражанне, быццам на паўпустой плошчы сабралася маленькая купка людзей. Справа тут, зрэшты, не ў тэхніцы, а ў тым, хто ёй карыстаецца. Важна, хто глядзіць у вока тэлеабо кінакамеры і, галоўнае, — што ў ім бачыць. На жаль, зрок, бывае, падводзіць і вопытных журналістаў.

У тым, што адбывалася ў Мінску і ў многіх іншых гарадах 25 лютага, можна, канечне, убачыць усяго толькі «страсці натоўпу». І назваць тыя падзеі, як гэта робіць А. Майсеня ў сваім артыкуле «Когда опасен экстремизм?» («Советская Белоруссия», 3 красавіка г. г.) разгулам нацыянал-шавінізму і палітычнага экстрэмізму.

Узнікае пытанне — можа, у А. Майсені і падобных яму журналістаў ёсць нейкі рэцэпт хімічна чыстай дэмакратыі? Дэмакратыі, калі можна так сказаць, без свабоды слова і сходаў, без мітынгаў і маніфестацый. Як мы маглі нядаўна пераканацца, нават на радзіме парламенцкай сістэмы — у Англіі — здараюцца бурныя дэманстрацыі. Нават з бойкамі і крушэннем вітрын у рэспектабельным Лондане. Добра гэта? Ну, зразумела, вельмі і вельмі блага. Але ж чамусьці нават у лонданскай паліцыі не ўзнікла і думкі пра тое, каб хоць часова скасаваць права на дэманстрацыі.

Зразумела, было б добра, калі б не ўзнікала прычын для мітынгаў і маршаў пратэсту. Было б лепш, каб палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і нацыянальныя праблемы вырашаліся не на плошчах і вуліцах, а ў дзяржаўных установах. А калі гэтыя праблемы не вырашаюцца гадамі? (Апошняй акалічнасці, дарэчы, не адмаўляе і аўтар артыкула). Лепш бы кіраўніцтву рэспублікі і БНФ высвятляць адносіны, скажам,

ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ А. Русецкага.

Выказаны заўвагі і пажаданні ў адрас кіраўніцтва рэспублікі наконт таго, што перабудова ідзе вельмі цяжка і марудна, вялікі яшчэ разрыў паміж словамі і справамі.

У праекце Статута запісана, гаварыў В. Жуковіч, што КПСС добраахвотная арганізацыя аднадумцаў. Якія ж мы аднадумцы, калі да нашага голасу па-ранейшаму не прыслухоўваюцца. Пра гэта сведчыць многа фактаў. Думка радавых членаў партыі ігнаруецца. Нашым партыйным кіраўнікам вельмі цяжка зірнуць уніз.

Адзначалася, што залішне многа райкомаў у горадзе, можна мець і меней іх.

Зноў, як і на папярэдніх сходах, падымалася пытанне аб тым, на што і куды ідуць партыйныя ўзносы камуністаў. У праекце Статута запісана, што пярвічныя партыйныя арганізацыі могуць пакідаць у сябе да 50 працэнтаў узносаў. На сходзе прапанавана ўдакладніць гэтае палажэнне, запісаць — 50 працэнтаў.

І зноў гаварылася аб набалелым, што абысці ніяк нельга. Прайшло чатыры гады з часу аварыі на Чарнобыльскай АЭС. І, здаецца, толькі нядаўна многія ўсвядомілі велічыню трагедыі, якая спасцігла наш народ. Адкрываюцца новыя і новыя жахлівыя факты, ёсць медыцынскія назіранні і заключэнні. Пра гэта яшчэ раз сведчыць артыкул пісьменніка М. Матукоўскага ў газеце «Известия» «Катастрофа». Чарнобыль — гэта наш боль. Была выказана прапанова — прасіць (ці патрабаваць!) поўнага закрыцця Чарнобыльскай атамнай станцыі.

Напярэдадні надыходзячага з'езда СП БССР выказана была трывога за яго лёс. На думку некаторых, зараз ідзе раскол інтэлігенцыі, які вядзе да непажаданых адносін варожасці і адчужанасці. Ёсць намаганні раскалоць і пісьменніцкае асяроддзе. Выказваюцца думкі, што наогул не патрэбен Саюз пісьменнікаў. На думку выступіўшых на сходзе, трэба не дапусціць гэтай сітуацыі, не даць разбурыцца нашаму саюзу, а зберагчы яго.

На сходзе выступіў і загадчык ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ А. Русецкі. Ён адказаў на шматлікія пытанні.

В. ІВАНОВА.

...ся сведчаць пра напрамак дыскусіі. «Мне не падабаецца, калі пра мяне як пра камуніста гавораць блага»,—прама заяўляе адзін. «Аўтарытэт згубіла не партыя, а партапарат», —удакладняе другі. А трэці, сам кіраўнічы работнік, з болем прызнаецца: «Я не крывіў сваім сумленнем, і для мяне крыўднае ахайванне апарату». Відавочна, мы маем справу з нейкім парадоксам. Задумаемся, аднак, над тым, ці могуць асабістыя якасці радавых членаў нашай партыі мець вызначальнае значэнне ў яе стратэгіі і тактыцы? І калі пра партапарат гавораць, як пра нешта асобнае, аўтаномнае, то што мы ўвогуле лічым партыяй у нашых умовах?

Пытанне ставілася і так: мы называем сябе камуністамі і пазбягаем слова «камунізм». Як, можа, мы ўжо сацыял-дэмакраты і не рашаемся сабе ў тым прызнацца?

Пра неабходнасць карэнных змен у партыі, яе структуры і складу, пра велізарную колькасць партыйцаў, выхаваных мінулым, гаварыў член-карэспандэнт Акадэміі медыцынскіх навук М. Місюк. У яго прамове, як і ў іншых, лейтматывам праходзіла думка: партыя павінна існаваць не для партыі, а для таго, каб народ па-чалавечы жыў.

З прапановай супрацоўніцтва звярнуліся да прыхільнікаў дэмакратычнай платформы ў КПСС прадстаўнікі нядаўна створаных іншых грамадскіх фарміраванняў: асацыяцыі «Дэмакратычная згода» і сацыял-дэмакратычнай платформы ў КПСС. Выступілі таксама госці з Ленінграда і Варкуты.

Канферэнцыя ўвогуле праходзіла канструктыўна і досыць карэктна. Праўда, зала двойчы выявіла непрынятце: калі з непрадуманымі заявамі выступіў журналіст С. Барыс і калі на трыбуну выйшла загадчык ідэалагічнага аддзела гаркома Н. Іванова. Хоць трымалася яна мужна, але паразумення з аўдыторыяй так і не знайшла.

Не абышлося без кур'ёзаў. Па тым, як група таварышаў нязменна галасавала «супраць» па ўсіх прынцыповых пытаннях, камуністы «вылічылі» двух работнікаў Ленінскага райкома сталіцы, якія хутчэй за ўсё прысутнічалі ў якасці «пятай калоны». Дарэчы сказаць, госці (а іх было амаль столькі ж, колькі і дэлегатаў) не знікалі к канцу пасяджэнняў і дысцыплінавана выседзелі ўсе два дні канферэнцыі.

Пераважнай большасцю галасоў, хоць і не без процідзеяння «гасцей», былі прыняты рэзалюцыі, у прыватнасці «Аб адносінах да БНФ».

Утворанае аб'яднанне камуністаў Беларусі «Дэмакратычная платформа ў КПСС» абмянялася прывітальнымі тэлеграмамі з аналагічнай канферэнцыяй, што праходзіла на Украіне, у Харкаве.

На заканчэнне прывяду колькі дадзеных, якія характарызуюць склад удзельнікаў. Палова дэлегатаў мела ўзрост да сарака гадоў. 82 працэнты ад агульнай колькасці — людзі з вышэйшай адукацыяй. Чвэрць складу — людзі з дваццацігадовым партыйным стажам.

Наш кар.

у тэлестудыі. Тварам да твару. Але зноў жа ўзнікае пытанне: ці была такая прапанова з боку рэспубліканскага кіраўніцтва? Мала таго. Як бы ні ацэньваць колькасць удзельнікаў «вялікага сходу» на плошчы Леніна — у 5 ці 50 тысяч,—усё ж такі гэта была значная падзея. Чаму ж не вялася трансляцыя ці хоць бы запіс па трансляцыі? Няўжо нельга было папярэдне правесці перамовы з арганізатарамі мітынгу? У выніку ж, як нагадвае нам А. Майсеня, адбыўся «поход» на тэлецэнтр, «осада здания, переговоры з позиции силы и, наконец, выступление лидеров БНФ в прямом эфире».

Праўда, не зусім зразумела, на чыім баку была сіла? Прывядзём яшчэ адну цытату. «Как же так, почему милиция не смогла отстоять (!) государственное телевидение, — скардзіцца А. Майсеня,— тем более, что сил было достаточно, да и толпа, как мне показалось, вела себя... неагрессивно». Ці не шкадуе аўтар, што не былі ўжыты дубінкі і слезацечныя газы?

Ва ўсякім выпадку ён прыходзіць да вельмі цікавай высновы. Аказваецца, «милицейских начальников держит в оцепенении «комплекс вины» за 30 октября 88 г. ...» Можа, гэта і так. Але нешта мы не чулі, каб нехта з тых начальнікаў прынёс публічныя прабачэнні пацярпеўшым. Не кажучы ўжо аб юрыдычнай адказнасці за свае дзеянні.

У сваім артыкуле А. Майсеня выступае нібыта супраць экстрэмізму і канфрантацыі ў грамадстве, супраць напальвання страсцей і эмоцый. Гаворыць ён і аб высокай цане слова ў сённяшняй сітуацыі. Слушна. Асабліва ж высокую цану мае слова, якое прагучала не на мітынгу, у натоўпе, а выказана ў рэспубліканскай газеце. Ці не так?

Віталь ТАРАС.

Чарнобыль: зямля і людзі

НЕМЫЯ ЗВАНЫ

У КРАСНАПОЛЬСКАЙ раённай бальніцы чакалі гасцей. З Аўстрыі і сваіх, з Мінска. Дактары, медсёстры, санітаркі прыбралі ў дзіцячым аддзяленні, пераапранулі ў чыстае дзяцей. Нарэшце, пасля паўдня, цэлы картэж легкавікоў зруліў з дарогі да дзіцячага аддзялення. З аўстрыйцамі прыехала маладая бойкая жанчына Барбара Херман, ці проста Барбара, як па-свойску звяртаюцца да яе і беларусы, і аўстрыйцы. Яна — за пераклад чыцу, пераказвае пачутае ад мясцовых людзей тэлеаператару, журналістам. Трошкі асобна ад іх стаяць два маладыя святары і пратадыякан Леанід Антонавіч Бажко, прадстаўнік Мінскай Епархіі. Менавіта яны разам з Міністэрствам аховы здароўя рэспублікі, Беларускім фондам міласэрнасці і здароўя, Таварыствам Чырвонага Крыжа звярнуліся да міжнароднай грамадскасці аб дапамозе дзецям Чарнобыля. Дабрачынны фонд «Народная дапамога» Аўстрыйскай сацыял-дэмакратычнай партыі, Венская Епархія рускай праваслаўнай царквы адгукнуліся першымі, на ахвяраванні насельніцтва закупілі падарункі дзецям Чарнобыля. Гэта ўжо другі прыезд аўстрыйцаў. У пачатку лютага некаторыя раёны Гомельшчыны, Магілёўшчыны наведаў Віктар Шылоўскі, намеснік прэзідэнта дабрачыннага Фонду, ён жа — пратадыякан Свята-Мікалаеўскага кафедральнага сабора ў Вене. Цяпер дэлегацыю ўзначаліў Фрыц Гофман, прэзідэнт Фонду. Прывезлі яны васемнаццаць тон падарункаў для дзяцей радыеактыўных раёнаў.

Госці з цікаўнасцю першаадкрывальнікаў аглядваюцца, распытваюць з дапамогай Барбары пра дзяцей, пра бальніцу. Тэлеаператар водзіць камерай наўкруг сябе, стараецца нічога не прамінуць.

Галасок Барбары журчыць і журчыць. Ёй цікава ведаць, калі была пабудавана бальніца, колькі трэба людзей адсяляць з раёна, куды. Ахвотна расказвае і пра сябе, тлумачыць, за што куплены падарункі, як збіраліся грошы для гэтага. Скардзіцца:

— У нас вельмі мала ведаюць пра трагедыю Чарнобыля. Калі б ведалі лепей, то і людзей адгукнулася б больш. А так прывезлі тое, што сабралі похапкам: падарункі, пяць тысяч аднаразовых шпрыцаў, некалькі дазіметраў.

Яна не адчувае сябе госцяй. Проста выхаваным, цікаўным чалавекам, які ведае, што ён робіць і дзеля чаго прыехаў з няблізкага свету.

Раздаўшы дзецям падарункі ў бальніцы, едзем у саўгас «Халмянскі». Вязём з сабой у «хуткай дапамозе» 45 пакункаў — дзецям саўгаснага садзіка.

Узровень радыяцыі ў двары садзіка — шэсць кюры. Пастаялі крыху, пачакалі, пакуль разгружаюцца пакункі. Потым заходзім у пакой, дзе за нізенькімі столікамі пасадзіла сваіх гадаванцаў Валянціна Фёдараўна Несцяровіч. Белагаловыя, ціхмяныя, яны слухаюць Барбару, мала разумеючы, што гэта за Аўстрыя, дзе яна, хто і чаго прыехаў да іх. Фрыц Гофман, распакаваўшы адзін з пакункаў, разам з Барбарай тлумачыць не столькі дзецям, колькі супрацоўніцам садзіка, прызначэнне той ці іншай рэчы.

Садзік саўгаса — адзін з лепшых у раёне. Але аздабленне пакоя, мэбля, цацкі—беднаватыя, казённыя. Тэлеаператар няспынна здымае ўсё, але ніхто на тое не зважае — няхай здымае, што ўжо тут утойваць?

— Дзякуй, што вы прыехалі да нас, што ведаеце пра нашу бяду, — гаворыць В. Несцяровіч шчыра і сардэчна, як чалавек, згаладнелы на добры чалавечы ўчынак. — Няхай будзе мір, дабрыня і міласэрнасць на зямлі, — скончыла яна ўзрушана, сціснуўшы на грудзях рукі.

Усе зразумелі, адчулі, што гэтыя словы — не фармальная даніна сустрэчы з замежнымі гасцямі, што імі выказана падзяка за спагаду, за жаданне пачуць і адчуць чужы боль.

Паследствы Чарнобыля нарастаюць, набываюць агульнанацыянальныя маштабы. Патрэбна дапамога. Невымерна большая, чым дасюль. Прыслухаемся ж да закліку Валянціны Фёдараўны, не бог ведае якога дзяржаўнага дзеяча, краснапальчанкі, што ўжо чатыры гады разам з тысячамі такіх, як сама, чакае збавення ад бяды, у якой ні адзін беларус не вінен...

Дарогай назад Барбара ў адной вёсцы папрасіла спыніцца, каб пагутарыць з вяскоўцамі, але запярэчыў пратадыякан Леанід Бажко: «Ніякіх прыпынкаў. Нас чакаюць у Магілёве, у архіепіскапа Максіма. Там і роспыты, і абед, і вячэра».

У Краснаполлі ўсё ж спыніліся.Барбара і аператар здымалі — вуліцу, парк, пасля гурт жанчын ля гандлёвага ларка, размаляванае акно-вітрыну гастранома. Барбара загаманіла з жанчынамі. Тыя на словы бойкія, іх не бянтэжыла, што здымае аўстрыйскае тэлебачанне, што Барбара, перакладаючы на сваю мову, запісвае на стужку сказанае імі.

— ...Куды мы паедзем? Ці ж я кіну дом, кватэру і паеду ні з чым? Дзе нас хто чакае?

І тут жа:

— Дзеці хварэюць. Ой, адкуль жа ведаем, чаго? Днём дзіцёнку абавязкова трэба паспаць, бо вялы такі. Таблеткі нейкія ў садзіку даюць. А што, для чаго? Нам, бацькам, ніхто нічога не гаворыць. Даюць і ўсё. Мо каму і не трэба даваць. І кроў з носа ідзе. Свінец у крыві знаходзяць...

Яны не просяць дапамогі, яны толькі расказваюць Барбары пра сябе, пра сваё гора.

З ДЗВЯРЭЙ КАВЯРНІ выглядвае жанчына — у гадах, поўная, з ненатуральна чырвоным тварам. Цяжка ступаючы, падыходзіць да тых, што гамоняць з Барбарай. Трохі паслухаўшы, пачынае расказваць:

— Гіпертанія ў мяне. Баляць галава і рукі. Во тут як сцісне, — датknулася да лба, — ісці не магу. І слепну, у вачах мутнее. Во, бачыце, тут чырвоная плямка, — паказала пальцам на шчацэ. — Адсюль кроў пырскае фантанчыкам. — Яна ўсхліпнула. — Кажуць, усё ад радыяцыі. Божа мой божа, а мы ж ніякага ліха нікому не зрабілі, нікога век не прасілі. Два франты перанеслі: туды немец ішоў і назад. На людзі трохі ўзбіліся, пажыць хочацца, паглядзець. Тут — паміраць трэба? За што? Так цяжка раслі, гадаваліся. Дваццаць пяць гадоў у налгасе адрабіла, век нікому не жалілася. Тут і інвалідам стала. Пяцьдзесят шэсць рублікаў пенсіі далі. А налгасны стаж мой прапаў. Ніхто не ўлічыў, нікому не трэба. Пайду ў сабес, а й слухаць не хочуць: «Табе і без таго дабавілі». Едзь, кажуць. А куды? А хату каму? Раней раён выкупляў, а цяпер не бяруць. Даведку давалі, што не можна жыць у радыяцыі з-за хваробы, кампенсацыю аплочвалі: едзь. Хто паспеў — выехаў. А цяпер такіх даведак не даюць. І не ехаць страшна. Колькі людзей памірае! Вунь Маліна. Маладая, здаровая жанчына, сорак сем гадоў. Вечарам добра ўсё, а ноччу прахапілася: «Ой, ой, плоха мне!» Захрапла і — усё. І Спадабаеў, шафёр. І Раманенкава жонка. Або Карпаленка... Ну, гадоў на пяць мо старэй за мяне. Дні за два ідзе і кажа: «Пайду, Анюта, вып'ю трохі. Нешта жалудак баліць». Пасля спускаецца: «Выпіў. Палегчала, бачыш». А тады чую — памёр! На ранні дранікаў папрасіў спячы. І блага зрабілася. Захроп таксама і пакаціўся. Паралізавала. Пакуль «скорая», пакуль укол які — памёр...

ПА ТЭЛЕБАЧАННІ паказваюць адкрыццё нечарговага трэцяга З'езда народных дэпутатаў СССР. М. С. Гарбачову, відаць, нялёгка. Гэта ўгадваецца па ягоным твары, мімалётных жэстах, словах. Праблем шмат. Сярод іншых — чарнобыльская бяда.

На сесіі Вярхоўнага Савета СССР пытанне аб ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай аварыі пазначана дваццаць першым пунктам. У час тэлетрансляцыі я назіраў за тварам М. С. Гарбачова і думаў, ці ўспомніў ён у гэты момант пісьмо, пасланае яму Алесем Адамовічам і акадэмікам Велехавым? Яны, удзельнікі Чарнобыльскага шляху, гаварылі ў пісьме аб «взрывоопасной ситуации», пра тое, што «...даже такой уравновешенный человек, как белорус..., способен взорваться в любую минуту». А, можа, згадаў ён, як нацята слухалі ўдзельнікі І З'езда народных дэпутатаў выступленні-сведчанні дэпутатаў З. Ткачовай са Слаўгарада і А. Грахоўскага з Гомеля? А, можа, згадаў трывожныя падзеі красавіка-мая 1986 года, сваё выступленне з нагоды Чарнобыля, калі спачуваў, абяцаў дапамагчы ахвярам трагедыі? А мо перад ім прамільгнулі сотні, тысячы пісьмаў-скаргаў, што дасылаліся яму з радыеактыўных вёсак?..

Пакуль што саюзным урадам мала што зроблена, каб спыніць наступленне Чарнобыля. Не выкананы, да прыкладу, пастановы аб адсяленні вёсак, дзе «насыпана» і 40, і 80, і 100, і 400 кюры... Горка ўсведамляць, што, расчараваўшыся ў здольнасці Масквы дапамагчы нам, мы, беларусы, вымушаны звяртацца да народаў свету з просьбай аб дапамозе.

Трэба, нарэшце, паглядзець праўдзе ў вочы, вызначыць ва ўсёй паўнаце сапраўдную пагрозу Чарнобыля не толькі для нас, а і для нашых нашчадкаў таксама. Так, сёе-тое робіцца. Вызначаны пэўныя льготы жыхарам атручаных раёнаў, дадатковыя пуцёўкі ў санаторыі, яшчэ нешта. Але як гэтага мала! Не хапае настаўнікаў у школах, дактароў у бальніцах, не хапае прадуктаў у магазінах...

У радыеактыўных раёнах Беларусі жывуць людзі. Трывожныя званы Чарнобыля, як і званы Хатыні, не сціхаюць.

М. ВАРАВА.

□

Нарыс А. Казловіча «Аўтабіяэкалаграфія», змешчаны ў «ЛіМе» 9 сакавіка г. г., напомніў мне даўнюю размову з паэтам Аляксеем Пысіным. Было гэта гадоў пятнаццаць таму — у лесе каля станцыі Друць. Паўсюль былі відаць сляды неахайнай дзейнасці меліяратараў. На месцы ўчарашніх балот — кучы пяску. А ў летнім лесе — суш. Мох ажно трашчаў пад нагамі. Аляксей Васільевіч расказаў мне тады пра пісьмо, якое ён паслаў у ЦК КПСС і ў якім пратэставаў супраць неабдуманых планаў суцэльнай меліярацыі Палесся. Праз нейкі час, расказваў пісьменнік, яго выклікалі ў ЦК КПБ. Але гаварыць з ім наконт пісьма не пажадаў ніводзін загадчык аддзела, удалося сустрэцца толькі з нейкім дробным чыноўнікам. Той, мяркуючы па размове, што адбылася ў яго кабінеце, не зразумеў, ці не захацеў зразумець аргументаў пісьменніка. Афіцыйнага адказу з Масквы Пысін так і не атрымаў.

Ведаю, што Аляксей Васільевіч пры жыцці не раз дзяліўся думкамі, выказанымі ў тым пісьме, з дваюрадным братам Міхаілам, а таксама з Віктарам Карамазавым і іншымі пісьменнікамі. Ведаю і тое, што пісьмо знаходзіцца зараз у архіве ЦК КПБ. Ці не прыйшоў час абнародаваць яго? Як сказаў паэт: пакуль зямля жывая — і ты жывы.

В. АРЦЕМ'ЕЎ, краязнавец.

□

Стала вядома, што значная колькасць ракетных баз Узброеных Сіл СССР размешчана на тэрыторыі Беларусі («Аргументы и факты», № 6, 1990). Мы, безумоўна, разумеем, што Беларусь павінна ўносіць пэўны ўклад у абарону ўсяго Саюза ССР. Аднак выклікае здзіўленне колькасць ракетных баз, несувымерная ні з агульнай колькасцю рэспублік, ні з доляй БССР у агульнай тэрыторыі ці насельніцтве СССР.

У перадвыбарчай платформе Беларускага экалагічнага саюза ёсць пункт пра аб'яўленне Беларусі зонай, свабоднай ад ядзернай зброі і атамных станцый. Зыходзячы з рэалій сённяшняга дня, мы лічым за неабходнае на першым этапе рэзкае скарачэнне ракетных баз на тэрыторыі рэспублікі да ўзроўню, які адпавядае долі БССР у агульнай тэрыторыі Еўрапейскай часткі СССР.

Мы ставім таксама пытанне аб канкрэтных захадах, што робяцца кіраўніцтвам суверэннай саюзнай рэспублікі для забеспячэння парытэтнага ўдзелу астатніх рэспублік Саюза ССР у агульнай абароне.

Нарэшце, улічваючы рэзкае скарачэнне, а ў перспектыве — і поўны вывад, Узброеных Сіл СССР у Венгрыі, Чэхаславакіі, Польшчы, лічым за неабходнае задаць пытанне: ці не будуць яны дыслацыраваны на тэрыторыі Беларусі? У сувязі з гэтым хацелася б таксама атрымаць інфармацыю аб агульнай плошчы, якую займае ў БССР Міністэрства абароны СССР у параўнанні з суседнімі рэспублікамі (Літвой, Расіяй, Украінай).

Р. ГАРЭЦКІ, акадэмік;
Я. ПЯТРАЕЎ, прафесар;
Л. ТАРАСЕНКА—віцэ-прэзідэнты Беларускага экалагічнага саюза.

□

З заявы Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ад 29 сакавіка 1990 г. мы ўрэшце даведаліся аб лёсе «спрадвечна беларускіх тэрыторый», якія ў выніку рашэння вышэйшых органаў СССР і Літоўскай ССР былі перададзены гэтай рэспубліцы. Цяжка паверыць, але ўрэшце загучаў голас праўды, які даў аб'ектыўную ацэнку двухбаковаму «Дагавору аб перадачы Літоўскай рэспубліцы горада Вільня і Віленскай вобласці...» ад 10 кастрычніка 1939 г., што быў заключаны паміж Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР і Прэзідэнтам Літоўскай рэспублікі «без паведамлення і згоды Беларускай ССР». Як слушна адзначаецца ў Заяве, дагавор гэты быў вынікам заключэння пакту Молатава — Рыбентропа і страціў сілу ў момант нападу Германіі на СССР.

Але ўсё гэта можа служыць фармальнай падставай для перадачы г. Вільні і Віленшчыны... Рэспубліцы Польшчы, бо гэтаму дзяржаўнаму ўтварэнню дадзеныя тэрыторыі, дзе палякі складалі пераважную большасць насельніцтва, належалі да 1939 года. Праўда, Польшча дагэтуль не выстаўляла ніякіх патрабаванняў адносна згаданых тэрыторый. Дзякуючы рашучай заяве Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР цяпер такая неабходнасць адпала.

Калі што і можна закінуць вярхоўным беларускім уладам, дык гэта тое, што яны будуць «вымушаны настойваць на вяртанні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы беларускіх зямель» толькі цяпер і толькі ў сувязі з выхадам Літвы з СССР. А хіба ж памянёныя землі перастаюць быць беларускімі ад таго, застаецца ці не Літоўская рэспубліка ў складзе СССР? Калі ўжо дзеялася несправядлівасць у адносінах да беларусаў паўночнага захаду Беларусі, дык ці варта было чакаць 50 гадоў і пакорліва лічыць сябе звязанымі «ўсімі законамі, указамі і іншымі актамі адносна перадачы Літве часткі беларускіх зямель» — замест таго, каб даўно заняць адпаведную пазіцыю? Надта агульна і цьмяна гучаць заключныя словы Заявы: «будзем вымушаны настойваць на вяртанні... беларускіх зямель». У якім выпадку? Толькі калі Літва аддзеліцца? Ці ўвогуле будзем настойваць на сваім?

Як бы там ні было, Заява гэтая будзе ўспрынята літоўцамі як пагроза. Клін паміж народамі, адвечнымі суседзямі і сябрамі, убіты «своечасова» і надзейна.

Ю. ВАШКЕВІЧ.

г. Мінск.

□

З 25 сакавіка людзі на Беларусі пачалі жыць па часе, набліжаным да іх біялагічнага часаадлічэння. Многія, калі не пераважная большасць грамадзян рэспублікі, з адабрэннем успрынялі такое рашэнне Дзяржаўнай камісіі адзінага часу і эталонных частот СССР. Але, разам з тым, у гэтым новаўвядзенні ёсць і заганныя моманты.

Хоць і былі неаднаразовыя звароты розных людзей адносна ўвядзення «беларускага часу» (пра гэта неаднойчы пісаў і «ЛіМ»), але пра рашэнне было абвешчана досыць нечакана. Гэта выклікала немалыя складанасці з пераводам на новыя расклады пасажырскага транспарту рэспублікі.

Але найбольшае непаразуменне стварыла ўжыванне здвоенага маскоўска-мясцовага часаадлічэння на вакзалах і ў аэрапортах Беларусі. На Прывакзальнай плошчы ў Мінску, напрыклад, на гадзіннику будзе адзінаццаць, а ў будынку вакзала стрэлку гадзінніка трэба перавесці на гадзіну наперад. Зноў жа, з мінскага аўтавакзала, калі хто едзе ў Віцебск ці Ліду, адправіцца а трынаццатай. Разам з гэтымі аўтобусамі ад перона адыдзе аўтобус на Рыгу. Але час адпраўлення яго будзе пазначаны ўжо на гадзіну пазней. У той час у Рыгу ён прыбудзе па «беларускім часе», арыентавацца ж давядзецца на «маскоўскі». Гэтаксама ўзнікаюць складанасці з паездкамі на электрычках. На гадзіннках мільёнаў жыхароў Беларусі будзе мясцовы час, у раскладзе ж і па радыётрансляцыі паведамляецца зусім іншы. Ці не парадокс гэта?

Думаецца, што было б прыдатным для людзей арыентавацца на мясцовы час кожнай канкрэтнай рэспублікі або вобласці. Кожны будзе ведаць, што, накіроўваючыся, скажам, у Маскву, Кіеў ці Бранск з Мінска, Гомеля, Брэста, на цягнік або аўтобус неабходна патрапіць па «беларускім часе». Пераехаўшы мяжу, чалавек усяго толькі перавядзе стрэлкі гадзінніка на гадзіну наперад і на пункт прызначэння прыбудзе па тамтэйшым часе. Накіроўваючыся ў прыбалтыйскія рэспублікі і вобласці, кожны ведае, стрэлкі пераводзіць не трэба. У раскладзе руху пасажырскага транспарту адпраўленне і прыбыццё неабходна пазначыць згодна з часам пунктаў адпраўлення і назначэння. У такім выпадку, думаецца, ні ў каго пытанняў узнікаць не будзе.

Вопыт такі ўжо маецца. Некаторыя рэгіёны краіны ўжо год праіснавалі з мясцовым часам. Нашаму Савету Міністраў трэба было б пераняць іх вопыт, скарэкціраваўшы яго на мясцовыя ўмовы.

І. ЧАРНЯЎСКІ, археолаг.

г. Мінск.

□

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб узмацненні адказнасці за парушэнне патрабаванняў рэжыму радыяцыйнай бяспекі ў мясцовасцях, якія падверглісь радыеактыўнаму забруджванню» выклікае не адно пытанне. Здзіўляе, скажам, мізэрнасць пакаранняў за парушэнні рэжыму радыяцыйнай бяспекі. Памяркуйце самі: самы вялікі штраф, які пагражае асобе за такое злачынства, — усяго 100 рублёў.

Нам не зразумела, чаму ў Віцебскай вобласці спынены дазіметрычны кантроль за транспартам, які прыбывае з радыеактыўных раёнаў рэспублікі. Па-ранейшаму носіць хаатычны характар перасяленне да нас людзей з пацярпелых мясцін. На прылаўках нашых магазінаў з'явіліся гомельскія прадукты. Нам, пакупнікам, гаворацъ, што нормы радыяцыі ў іх гранічна дапушчальныя. Але так гэта ці не так — мы не ведаем. Нас запэўніваюць і ў тым, што радыяцыйная абстаноўка ў рэспубліцы спрыяльная. Але мы хочам самі ў гэтым пераканацца з дапамогай высакаякасных дазіметраў, якіх пакуль што вельмі мала.

Прапануем адкрыць дабрачынны рахунак у Дзяржбанку і на атрыманыя сродкі закупіць дазіметры. Спадзяёмся на дапамогу ў гэтай справе кааператараў, іншых арганізацый і ўстаноў, якія могуць заключаць дагаворы на іх пастаўку замежнымі фірмамі. Пакуль нашы праектныя інстытуты распрацуюць і запусцяць дазіметры ў масавую вытворчасць, імі не будзе каму карыстацца. І так страчана ўжо амаль 4 гады.

І апошняе. Зараз у многіх гарадах устаноўлены электронныя табло, якія паказваюць час і тэмпературу паветра. Трэба, каб такія табло паказвалі і ўзровень радыяцыі.

Работнікі абласнога ўпраўлення дзяржбанка М. ЛІТВІНОВІЧ, В. ПЯТРЭНКА, Э. ВОЛІК, Л. КАРАТКЕВІЧ і іншыя— усяго 24 подпісы.

г. Віцебск.

□

Нас вельмі ўразіў адзін з тэлевыпускаў «Кроку», у якім згадваўся дакумент 4-га ўпраўлення Міністэрства аховы здароўя СССР аб сакрэтнасці дадзеных па выніках радыеактыўнага заражэння людзей пасля чарнобыльскай аварыі. Уявіце сабе толькі: у загадзе гаворыцца пра ўвядзенне сакрэтнасці на інфармацыю аб ступені паражэння людзей, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі аварыі і якія цяпер жывуць у небяспечных зонах і назапашваюць у сваім арганізме смерць. І аб гэтым нельга гаварыць?! Урачам дыктуецца загад: трымаць у сакрэце ступень захворваемасці людзей, а пры звароце ў бальніцу ні ў якім разе не звязваць хваробу з Чарнобылем.

Хіба маем мы права маўчаць аб тым, калі плача і стогне наш народ, які жыве дагэтуль там, у небяспечнай зоне? Будаваліся пасёлкі, а — дзе яны будаваліся? Чаму мільёны рублёў страчаны дарэмна і незваротна згублены час? Гэта таксама вынік сакрэтнасці, некампетэнтнасці, абыякавасці тых людзей, якія нібыта «стараліся памагчы». Засакрэчвалі, гаварылі, высвятлялі ды і цяпер яшчэ выясняюць: хто гэта напісаў першы, хто гэта сказаў? А трэба сёння ж, у першую чаргу пры жаданні самастойнага пераезду даваць кампенсацыю і свабодны білет. Трэба аб'явіць гэтыя зоны Беларусі зонамі бедства. Інакш вырашэнне гэтых пытанняў, упэўнены, расцягнецца на многія гады.

Л. МАХНОВІЧ, І. АНДРЭЕЎ, В. ТАЛАТАЙ, С. АМЯЛЬЧУК, С. КОТАЎ. (Усяго 212 подпісаў рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў Белаазёрскага энергамеханічнага завода).

□

На жаль, выбары ў нашай Лермантаўскай акрузе № 13 не далі выніку. Галасаваў жа я за Міхася Аляксандравіча Ткачова, загадчыка рэдакцыі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

Мне падалося, што праграме майго кандыдата была ўласціва глыбіня і маштабнасць, адчуванне вострых праблем нашага жыцця. М. Ткачоў— буйны вучоны, гісторык і публіцыст. Яго галоўная думка: «Гісторыя дала нам апошні шанц!» Калі такі чалавек з'яўляецца адным з лідэраў БНФ, то гэта робіць гонар руху.

Між тым, у ходзе барацьбы зрываліся партрэты Ткачова, у грубай форме падкрэслівалася яго прыналежнасць да нефармальнай арганізацыі. Агітатары-«баевікі» ўрываліся напярэдадні выбараў у кватэры, размахваючы свежавыпечанымі экземплярамі «Вячэрняга Мінска» з артыкулам «Запявалы закуліснага хору», прыпісвалі Ткачову сімпатыі да «ворага беларускага народа» — госця з Вялікабрытаніі А. Надсана.

На гэтай публікацыі «вячоркі» хацелася б спыніцца крыху падрабязней. Цяжка адмовіцца ад думкі, што гэты артыкул быў спешна арганізаваны і прымеркаваны да другога туру галасавання. Публікацыя абсалютна бяздоказная, пабудаваная на брудных інсінуацыях. Не ведаю ўзросту аўтара, але думаю, што яна не была ў ваенным горане, кепска альбо зусім не знаёма з падзеямі тых гадоў.

Аўтар артыкула выступае нібыта з пазіцый вярхоўнага суддзі, усіх граміць, звысоку паплёўвае на гістарычныя сімвалы Беларусі. Ёй ніпачым ні высокі рэлігійны сан прыбыўшага да нас А. Надсана, ні шчырая міласэрнасць нашага суайчынніка, ні яго сустрэчы з рэлігійнымі дзеячамі, вучонымі АН БССР, культурнай грамадскасцю, таварыствам клуба «Спадчына», ні малебен у Кальварыйскім касцёле...

Т. Бумажкова персанальна пералічвае ўсіх: дзе і хто прысутнічаў на розных сустрэчах, якой часткай цела і да чаго дакранаўся, якой рукой і ў які бок жагнаўся. Асабіста ж мне хацелася б прасіць аўтара артыкула знайсці хоць бы аркуш у спецархівах (калі яна мае да іх доступ) аб ахвярах масавага генацыду ў Курапатах. Такія дадзеныя проста неабходныя таварыству «Мартыралог Беларусі».

І ўсё ж хочацца спадзявацца, што людзі навучаюцца адрозніваць праўду ад хлусні. Трэба думаць, прыедуць да нас, і яшчэ не раз, госці з многіх краін — нашы землякі.

В. ПАШУК.

г. Мінск.

З пошты «ЛіМа»

- **«Будзем вымушаны настойваць...»**
- **Па сваім часе**
- **Прыедуць да нас госці**

Мікола КАВАЛЕЎСКІ

Год 1937-мы. Курапаты

1. Галасы забойцаў:

Стрэлаў не чутна. Магілы
схаваны.
Сосны — не сведкі:
яны прамаўчаць.
Хутка астынуць ад працы
наганы —
можна збірацца вячэраць ды
спаць.

Служба у нас—не сказаць, што
цяжкая.
З плугам у вёсцы, вядома,
цяжэй.
Контру ўсялякую спраўна
страляем:
ці—у патыліцу, ці—між
вачэй.
Робім мы гэта даволі
будзённа:
з турмаў выводзім, прыводзім
сюды...

Хай спадзяваюцца, што
эшалоны
іх паімчаць за краты Калымы.
Смешна глядзець, як таропка
збіраюць,
ладзяць у клункі пажыткі свае.
Смешна глядзець, як варожая
зграя
сіліцца верыць, што смерць
абміне.
Дзіўныя людзі — ні страху,
ні крыку.
Вусны бялеюць, а вочы гараць...

Ну ды нічога, «троцкистскую
клику»
знішчым дашчэнту, такую іх
маць.

Вельмі разумнымі, бачыш ты,
сталі—
мкнуцца да нейкіх
вытокаў, ідэй.
Сіла ж — за намі, за намі сам
Сталін —
Бацька, Настаўнік, Надзея
людзей.

...Стрэлаў не чутна. Магілы
схаваны.
Сосны — не сведкі: яны
прамаўчаць.
Вось і астылі ад працы наганы—
трэба збірацца вячэраць ды
спаць...

2. Галасы ахвяр:

Сябры. Матулі. Жонкі. Дзеці.
Пачуйце нас! Паверце нам,
пакуль мяжу жыцця і смерці
не скасаваў яшчэ наган.

Жахліва ведаць, што ніколі
больш не пакрочым па зямлі,
дзе светлы сцяг народнай волі
ўздымалі шчыра і няслі.
Жахліва ведаць, што
спадманам,
людской тугой, людской
крывёй —
наш сцяг змяняецца тыранам—
на німб над постаццю сваёй.

Жахліва ведаць праўду гэту...
Аднак не страх, а гнеў святы
за перакрэсленую мэту,
ВАМ перадаць павінны МЫ.

Наш лёс — трагедыі пачатак,
бяды вялікай чорны Знак.
Па ўсёй краіне Курапаты
сплятуцца ў жудасны ГУЛАГ.
Бяда не пройдзе недзе
воддаль:
Вам не мінуць яе сякер.
Рэпрэсіі, застой. Чарнобыль —
свой першы крок бяруць
цяпер...

...Сябры. Матулі. Жонкі. Дзеці.
Пачуйце нас! Паверце нам,
пакуль мяжу жыцця і смерці
не скасаваў яшчэ наган...

●

Дзве вёскі—Літва, Палачаны,
як сёстры на роднай зямлі.
Мне з імі сустрэчы жаданы,
бо ў гэтых краях карані.

...Здаецца, што толькі ўчора
Купалы тут значыўся крок,
а ціхі суседні Аборак
успомніў Мацей Бурачок...

Літвіны мы ці палачане?
З'яднаны мы доляй адной.
Мы ўсе як адзін — грамадзяне
сваёй Беларусі святой.

Спазнаць адчуванне Айчыны —
вялікае шчасце ў жыцці.
...Дай, божа, нам сілы
нясхільнай
яго да дзяцей данясці...

ЯК «АЧАЛАВЕЧЫЦЬ» ГІСТОРЫЮ БЕЛАРУСІ

Побач з раскладам заняткаў па гісторыі БССР на дошцы аб'яў Віцебскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў вісеі тэмы рэфератаў, з якімі прапанавалі слухачам выступіць па заканчэнні курсаў. Тэматыка рэфератаў разнастайная, але назва аднаго з іх —«Як «ачалавечыць» гісторыю БССР»—мне вельмі спадабалася. Па-першае, ўсе занепакоеныя тым, што з падручнікаў, асабліва школьных, знік не проста «малы» чалавек, але і тыя гістарычныя асобы, якія складаюць гонар беларусаў. Па-другое, калі ў рэспубліцы пачалося адраджэнне нацыянальнай свядомасці, тэма чалавека ў гісторыі Беларусі—адна з найважнейшых.

Курсы пазнаёмілі нас з сапраўднымі настаўнікамі гісторыі. Хацелася б прыгадаць Клімента Кажана з вёскі Германавічы Шаркоўшчынскага раёна. Увесь свой вольны час ён праводзіць у архівах і бібліятэках Вільнюса, Рыгі, Масквы, Ленінграда. Выкладаць гісторыю ён можа не па сціплых сучасных падручніках, а на аснове глыбокага ведання гістарычных сведкаў мінулага. Думаю, што з настаўнікаў рэспублікі званне «народны настаўнік» у першую чаргу трэба надаваць такім, як К. Кажан, бо сваёй працай ён вярнуў беларускаму народу імёны тых, кім мы ганарымся.

Ці вось малады настаўнік з Мёраў Вітольд Ермалёнак. Яго гурток «Арганаўты мінулага» робіць не толькі археалагічныя даследаванні, але вучыць любіць свой край, сваю старонку, цікавіцца яе гісторыяй, людзьмі, што там жылі...

З прыходам на курсы кансультанта Віцебскага абкома партыі Віктара Акуневіча разгарэлася спрэчка, на якой мове чытаць лекцыю па гісторыі Беларусі. Трэба аддаць належнае —ён чытаў па-беларуску, пры гэтым стараўся адлюстраваць тыя новыя погляды, што з'явіліся ў гісторыі Беларусі апошнім часам у даследаваннях М. Ермаловіча і іншых сучасных гісторыкаў.

Вернемся да спрэчкі. Большасць настаўнікаў патрабавала ад В. Акуневіча: «Читайте лекции на языке межнационального общения — русском»; ці: «У нас государственный язык пока что русский, его никто не отменял» і г. д.

Мне прыгадаліся словы А. Салжаніцына з Нобелеўскай лекцыі аб тым, што кожная нацыя — скарб чалавецтва і самая малая з іх мае свой асаблівы колер. Знікненне нацыі—гэта трагедыя чалавецтва наогул. Здавалася б, каму, як ні інтэлігентам (у перакладзе з лацінскай мовы — ведаючым, тым, хто разумее) усвядоміць, што мы, беларусы, якраз і знаходзімся каля той мяжы, за якой нам пагражае знікненне як нацыі ў рознакаляровым сусветным суквеццi.

На жаль, гэтая ж большасць слухачоў курсаў з захапленнем слухала старшага выкладчыка Магілёўскага педінстытута Якава Трашчанка. Чытаючы лекцыі па гісторыі Беларусі, ён выказаў меркаванне, што Беларусі ніколі не існавала, яе прыйшлося стварыць у 1918—1919 гг., як буфер паміж Усходам і Захадам. Плюралізм поглядаў — кожны мае права выказваць сваю думку. Толькі не хацелася б, каб настаўнікі з такімі думкамі, меркаваннямі прыходзілі ў клас да вучняў.

Дык як жа «ачалавечыць» гісторыю Беларусі? Безумоўна, першым крокам на гэтым шляху будзе вяртанне ёй роднага слова. Па-другое, гэта вяртанне ў падручнікі па гісторыі БССР самага маленькага (уклад якога ў гісторыю — ягонае існаванне на гэтым свеце) і вялікага (унёсшага ўклад у гістарычнае, культурнае развіццё беларускага народа) чалавека. Чаго пакуль што няма. Ці будзе?

Пакуль гісторыкі спрачаюцца і толькі збіраюцца пісаць поўную, праўдзівую гісторыю Беларусі, пісьменнікі ўжо робяць гэта сваімі творамі. Таму хацелася б выказаць падзяку ўсім ім, хто ўслед за Уладзімірам Караткевічам дапамагаюць мастацкімі сродкамі «ачалавечыць» нашу родную гісторыю. І ўстаюць перад намі полацкі князь Уладзімір у час роздуму («Дзень, калі ўпала страла» У. Арлова), Вячка, што з мячом у руках абараняецца ад крыжакоў («Меч князя Вячкі» Л. Дайнекі), асветніца Ефрасіння («Прадслава» В. Іпатавай, «Спакуса» Т. Бондар), палачанін Алекса («За морам Хвалынскім» В. Іпатавай). Любы з твораў Васіля Быкава дасць багаты матэрыял да скупых радкоў падручніка пра гераічныя і трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны або калектывізацыі.

І апошняе, што хацелася б выказаць. Чалавечнасць гісторыі ў значнай ступені залежыць ад асобы таго, хто выкладае яе. А выкладаць кожны можа так, як сам ставіцца да роднай мовы, літаратуры, нашага мінулага і будучыні. У будучым на курсах па гісторыі БССР спадзяюся на сустрэчу з археолагам З. Пазняком, гісторыкамі М. Ткачовым, М. Ермаловічам, А. і В. Грыцкевічамі, сучаснымі пісьменнікамі, якія пішуць на гістарычныя тэмы, а не толькі са старшым выкладчыкам Магілёўскага педінстытута.

Тамара ГРУДНІЦКАЯ,
настаўніца гісторыі.
г. Наваполацк.

НІКЕЛЕВЫ БЛЯСК. КОЛЬКІ ЁН КАШТУЕ?

Той, хто працуе ў гальванічных цэхах прадпрыемстваў, ведае, што работа там не з лёгкіх, умовы працы — далёка не бяскшодныя. Калі ж мець на ўвазе адходы тых цэхаў, дык наносяць яны нашай прыродзе непапраўную шкоду.

Неяк я гутарыў з дацэнтам кафедры тэхналогіі электрахімічных вытворчасцей Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С. М. Кірава Л. Варапаевым, які шмат гадоў займаецца праблемай забруджвання нашых вадаёмаў каляровымі металамі. «Добра вядома, — адзначыў ён, — што па шкодным уздзеянні на арганізм чалавека кадмій, свінец, іншыя элементы больш небяспечныя за пестыцыды, што выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы, ці за вокіс вугляроду, якім атручвае паветра аўтатранспарт. Парушэнне кальцыевага абмену, хваробы крыві і іншыя цяжкія захворванні часткова выклікаюцца спажываннем з вадой ці ежай каляровых металаў. Штогод гальванічныя вытворчасці рэспублікі «дораць» прыродзе каля паўтары тысячы тон каляровых металаў. А, між тым, толькі адной тоны іх дастаткова, каб забрудзіць звыш дапушчальнага ўзроўню каля мільёна кубаметраў вады. Як жа яны туды трапляюць? Справа ў тым, што многія прадпрыемствы не маюць ачышчальных збудаванняў. Напрыклад, у Мінску не ачышчаюць скарыстаныя воды маторны і электрамеханічны заводы. Апошні выкідае за год са сцёкамі каля дзесяці тон злучэнняў хрому. Заўважу, што ачышчальныя збудаванні, якія ёсць у нашых гарадах, маральна састарэлі і не забяспечваюць выдалення металаў з вады».

Мой субяседнік адзначыў, што незбходна правесці эканамічную і тэхналагічную экспертызу гальванічных вытворчасцей. Наогул, на многіх заводах можна скараціць маштабы выкарыстання металічных пакрыццяў, паколькі часта гэта не дыктуецца тэхналагічнай неабходнасцю. Скажам, на Мінскім мотавелазаводзе плошча гальванічных пакрыццяў складае амаль мільён квадратных метраў у год. Блішчаць нікелем і хромам ці не ўсе дэталі веласіпедаў і матацыклаў. А ці заўсёды і апраўданы гэты бляск? Змаглі ж на ВАЗе, праектуючы новыя «Жыгулі», абысціся без бліскучых бамперaў і каўпакоў, іншых дэталей. Шмат дзе можна выкарыстоўваць палімерныя, аксідныя, фасфатныя і іншыя танныя і экалагічна больш бяспечныя пакрыцці. Дарэчы, вады на атрыманне аднаго квадратнага метра пакрыцця ў нас выкарыстоўваецца ў дваццаць пяць разоў больш, чым у развітых індустрыяльных краінах. І гэта пры дэфіцыце водных рэсурсаў! Ці мае права на існаванне такая, з дазволу сказаць, «тэхналогія»?

Зрэшты, хвалюе не толькі тэхнічны бок справы. У гальванікаў няма зацікаўленасці ў вырашэнні экалагічных праблем. Галоўнае, за што яны адказваюць, — гэта якасць пакрыццяў і план.

«Супрацоўнікамі нашай кафедры, — апавядаў далей Л. Варапаеў, — распрацаваны працэс рэгенерацыі растораў траўлення пячатных плат. Працэс эфектыўны, не патрабуе для рэалізацыі складанага абсталявання. Яго ўкараненне на прадпрыемствах краіны дазволіла б атрымаць значны эканамічны эфект. Новая тэхналогія выпрабоўвалася на Мінскім заводзе вузлоў ЭВМ — буйнейшым «пастаўшчыку» таксічных адыходаў у раку Свіслач. Але, нягледзячы на станоўчыя вынікі выпрабаванняў, завадчане не спяшаюцца ўкараняць новую тэхналогію ачышчэння травільных растораў. А навошта спяшацца? За забруджваннем нашых рэк каляровымі металамі амаль ніхто не сочыць (у тым ліку і Дзяржкамприроды).

У многіх краінах распрацаваны сістэмы выдалення каляровых металаў са сцёкавых вод. Прапанаваў аналагічныя распрацоўкі і тэхналагічны інстытут. На жаль, гэтыя новаўвядзенні выкарыстоўваюцца толькі за межамі нашай рэспублікі. Мы гатовы супрацоўнічаць з любым прадпрыемствам, зацікаўленым у забеспячэнні чысціні навакольнага асяроддзя. Спадзяёмся, што нашымі саюзнікамі выступяць і Саветы народных дэпутатаў, і грамадскія аб'яднанні — усе, каму дарагая будучыня роднага краю».

В. ХУРСІК.
г. Мінск.

Я ДОЎГА Ў ЯГО ВЕРЫЎ...

Барыс Сачанка ў сваім артыкуле «Ад шчырага сэрца» («ЛіМ», № 8 за 1990 г.) напісаў пра тое, як вядомы празаік зазначыў: маўляў, пра Сталіна пісалі раней і зноў пішам пра яго, а ўсёй праўды так і не сказалі.

Я добра памятаю пасляваеннае пісьмо Сталіну ад беларускага народа, якое «ад душы» складалі вядомыя беларускія пісьменнікі. Пісаў і я пра Сталіна, але ўжо пасмяротную оду.

У той 1953 год я служыў у Савецкай Арміі ў Хабараўскім краі. І вось — б сакавіка... Краіну агарнуў смутак: памёр вялікі і любімы правадыр...

І сёння нібы бачу нашага нампаліта роты лейтэнанта Валянціна Замяціна, які адкрыў жалобны мітынг і непрыхавана змахваў з вачэй слёзы. Выступаў і я, але як ні стараўся выціснуць слязіну, яна ніяк не выціскалася, хоць у душы перажываў смерць правадыра. Пасля заканчэння мітынгу накіраваўся ў сваю канцылярыю (я быў пісарам), бо мне прыйшло ў галаву напісаць пасмяротную оду Сталіну. У мяне ўжо на мітынгу нараджаліся радкі. Пісалася лёгка і хутка, амаль без паправак. Былі ў маёй одзе такія, напрыклад, радкі:

Ты с Лениным вместе
Державу создал.
Пути к коммунизму
Ты нам начертал.
Ты много трудился
Во имя всех нас,
Луч твоего солнца
Нам светит сейчас.

У гэты час у канцылярыю зайшоў нампаліт. Я даў яму пачытаць верш.

— Крупко, — сказаў лейтэнант, — у цябе ж талент! Вось табе звальняльная запіска і хутчэй — у горад, у рэдакцыю.

Праз паўгадзіны я ўжо быў у рэдакцыі. Прозвішча маё там было знаёма, бо я часам пасылаў у газету карэспандэнцыі. Я нясмела паклаў свой верш на стол загадчыка аддзела — ведаў, што верш слабы, але, як высветлілася, хваляваўся дарэмна.

— Дарагі, — усклікнуў загадчык аддзела, — гэта ж цудоўна! У даны момант ты для нас проста знаходка.

І мой верш здалі ў набор.

На другі дзень прыносяць газеты. Верш мой быў надрукаваны на першай старонцы пад партрэтам Сталіна...

У штаб батальёна я хадзіў штодзённа раніцай. І на гэты раз прыйшоў як звычайна, але ўбачыў незвычайнае — усе моўчкі слухалі радыё. А перадавалі, што Берыя — вораг народа, што ён арыштаваны. Я здаў свае паперы і заспяшаўся ў роту, бо быў упэўнены, што там навіну гэтую не ведаюць. Зайшоў у канцылярыю (я служыў ва ўнутраных войсках, а Берыя быў нашым міністрам), там былі камроты і нампаліт. Я зірнуў на партрэт Берыя, паставіў табурэтку і пачаў здымаць са сцяны свайго міністра.

— Навошта ты здымаеш?! — закрычаў нампаліт.

Я нічога не адказаў і кінуў партрэт на падлогу. Нампаліт ледзь вымавіў:

— Што ты нарабіў?! У турму захацеў?!

— Ён не аднаго адправіў не толькі ў турму, але і на той свет, — адказаў я. — І гэта ж трэба так прымазацца да правадыра, увайсці ў яго давер, што той і не падазраваў.

— Навошта яму было яго падазраваць? — між іншым спытаў камандзір роты Вараб'ёў.

Я здагадаўся, што капітан Вараб'ёў даўно не верыў у Сталіна. А я верыў як у сапраўднага правадыра і пасля яго смерці, аж да XX з'езда нашай партыі. І толькі калі мне давялося сустрэцца з людзьмі, якія былі незаконна рэпрэсіраваны пры Сталіне, вера ў «бацьку ўсіх народаў» памерла.

П. КРУПКО,
электрык Мінскага завода халадзільнікаў.

Кнігапіс

Р. БАРАВІКОВА. Пад небам першага спаткання. Вершы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1990.

Паэзія Раісы Баравіковай — пяшчотная і роздумная, прасветленая і шчырая. Разам з тым у ёй адчуваецца і грамадзянская напоўненасць, а лірычная гераіня паўстае нашай сучасніцай, што жыве, кахае, гадуе дзяцей. У гэты зборнік, прадстаўлены ў серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі», увайшлі лепшыя творы з ранейшых кніг паэтэсы.

Я. РАДКЕВІЧ. Закон прыцяжэння. Раман. Для старэйшага школьнага ўзросту. Мінск, «Юнацтва», 1990.

У рамане Яўгена Радкевіча «Закон прыцяжэння» адлюстраваны асобныя моманты з жыцця П. Лепяшынскага — палымянага рэвалюцыянера, саратніка Уладзіміра Ільіча Леніна. Пісьменнік, выкарыстоўваючы багаты фактычны матэрыял, расказвае аб тым, як ажыццяўлялася рэвалюцыйнае пераўтварэнне грамадства, усталёўваліся новыя адносіны між людзьмі.

І. КЛІМАШЭЎСКАЯ. Лісты аб шчасці. Нарысы. На рускай мове. Для старэйшага школьнага ўзросту. Мінск, «Юнацтва», 1990.

Ірына Клімашэўская вядома як аўтар публіцыстычных кніг, адрасаваных юным чытачам і моладзі, у якіх, як правіла, гаворка вядзецца аб важных маральных каштоўнасцях, пошуку чалавекам свайго месца ў жыцці. У гэтым сэнсе чарговы зборнік пісьменніцы — не выключэнне. І на гэты раз у ім можна знайсці адказ на многія пытанні, якія хвалююць тых, хто ўпершыню адкрывае для сябе вартасць ісцін паўсядзённасці.



У. АРЛОЎ. Асветніца з роду Усяслава. Мінск, «Навука і тэхніка», 1989.

Пісьменнік, выкарыстоўваючы багаты матэрыял, у тым ліку і звесткі, якія сталі вядомы нядаўна, падрабязна расказвае як Ефрасіння Полацкая, абганяючы свой час, клапацілася аб адукацыі, прымала самы актыўны ўдзел у грамадска-палітычным і культурным жыцці Полацкага княства. Гаворыцца таксама аб тым, як памяць аб ёй захоўваецца ў народзе. Кніга выйшла ў серыі «Нашы славутыя землякі».

«АДНА ЗЯМЛЯ, АДЗІНАЕ ЖЫЦЦЁ...»

Леанід Галубовіч. Споведзь бяссоннай душы. Лірычны дзённік. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1989.

ПАЧНУ з прызнання: даўно люблю вершы Леаніда Галубовіча. Люблю за нязмушанасць, акрыленасць лірычнага пачуцця, арганічнасць голасу, за мужчынскую грунтоўнасць, трываласць характару, здольнасць узяць на сябе чужую бяду. З вершамі Галубовіча душы неяк спакайней, і зусім не таму, што яна не баліць і не хвалюецца, а таму, што такая паэзія дае духоўную апору, веру, магчымасць узаемнай споведзі і разумення. Душа баліць, але не безвыходнасцю, бо ў складаным працэсе «сотворчества» (А. А. Патабня), якім з'яўляецца ўспрыманне сапраўднай лірыкі, найбольш цяжкая і пакутлівая ноша належыць усё ж паэту.

Л. Галубовіч ніколі сябе не шкадаваў, не «няньчыў» сваю душу, гэта паэт з выразным пачуццём уласнай годнасці. З аднадушна ўхваленага крытыкамі яго першага зборніка «Таемнасць агню» выявілася, як неабходны нам шчырасць, натуральнасць — вышэйшая (ад Бога) адзнака таленту, якую не падробіш ніякім майстэрствам версіфікацыі. Рэцэнзенты згаджаліся і яшчэ ў адным: «Галубовічу ўсё баліць» (А. Васілевіч, І. Рубін), яму «дадзена разуменне чалавечай душы» (В. Палтаран). Сам паэт падкрэсліваў: «Ты — боль, паэзія...», і праз гэта пачуццё знаходзіў шлях да сэрцаў.

За шэсць гадоў, якія мінулі з часу выхаду першай кнігі паэта, у жыцці Л. Галубовіча змянілася многае: ён атрымаў філалагічную адукацыю ў Маскве, актыўна выступаў у друку з вершамі (зусім неаднароднымі па мастацкім узроўні, што прыхільная да паэта крытыка, здаецца, і не заўважыла, акрамя С. Кавалёва), выдаў кнігу вершаў у перакладзе на рускую мову, пабыў аглядальнікам паэзіі ў «ЛіМе», свядома ці незнарок прымераўшы на свой сціплы сялянскі твар маску літаратурна-крытычнага мэтра. І разбурыўся той удалы і кідкі «імідж» электрыка з вёскі Вароніна, які, прызнаемся, усё ж даваў дадатковую эмацыянальную «падсветку» таленавітым вершам. Паступова стварылася ўражанне: калі і можна ў чым папракнуць Л. Галубовіча, дык толькі ў тым, што, кажучы словамі Б. Пастэрнака, «быть знаменитым некрасиво».

І вось другая кніга паэта, «Споведзь бяссоннай душы». Выдадзеная так, як звычайна выдаюцца выбраныя творы калі не класікаў, то паэтаў «абоймы»: з залатым цісненнем, абстрактнымі малюнкамі Ф. Кашкурэвіча, падзагалоўкам «лірычны дзённік» і рознакаліберным штрыфтам. Адчуванне грунтоўнасці і трываласці, якое заўсёды было ўласціва Л. Галубовічу, тут заяўлена нават знешне, і гэта можна толькі вітаць. Але ці абмінула гэтую кнігу небяспека другаснасці, якая бывае ўласціва другім па ліку паэтычным зборнікам? Як правіла, менавіта другая кніга паэта атрымлівае ў нас літаратурную прэмію (найчасцей Лебёс». Чытаеш радкі: «Да новых Бастылій, прыспаны герой!.. Засеем палеткі духоўнай красы!» — і, як глытка паветра, чакаеш самаіроніі. Дык не ж — на поўным сур'ёзе верш заканчваецца рыторыкай: «Зямля чалавека — бяссмерце маё».

Уласціва Л. Галубовічу і санінскага камсамола) і ўсё ж нярэдка ўступае дэбюту па свежасці і непаўторнасці лірычнага пачуцця. Мо таму, што першая кніга пішацца як бы сама, а другое дыханне прыходзіць не адразу і не «на лаўрах», а пасля пакутлівай і доўгай працы.

У большасці вершаў пра паэзію выразна адчуваецца другаснасць зместу і дэкларатыўнасць, рытарычнасць фармулёвак: «Паэзія — Прарочы храм», «Я сейбітам паэта ўяўляю...», «Паэт павінен быць зямным». Не ратуе нават жарт з Музай:

Плачу за яе любоў,
(Не дзеўка — не йдзе задарам.)

Нішто сабе жарты... Л. Галубовіч хіба першы з беларускіх паэтаў так «абламаў» сваю Музу. А яна — жанчына разумная — адпомсціла такімі адкрыта слабымі і рытарычнымі радкамі, наіўна падкрэсленымі шрыфтам:

Бо, напэўна, той дастойны звання
ПАЭТ,
хто здолее якраз
Нам даць на вечныя пытанні —
ЖЫЦЦЯ І СМЕРЦІ — свой адказ.

І не раз адпомсціла... З якіх часін, скажыце, такія лексіка, фразеалогія і сінтаксіс:

Ад напалму гарыць зямля.
Нехта шчэрыцца ў Вашынгтоне.
Б'юць званы!
Будзе позна пасля —
Устань сягоння!

Кніга датавана 1989 годам... Мусіць, фальшывыя «Званы трывогі» — пакаранне Л. Галубовічу і за яго шматлікія папрокі маладым паэтам у грамадзянскай пасіўнасці.

На жаль, рытарычныя і пустазвонныя і іншыя вершы з новай кнігі Л. Галубовіча: «Гарачы мой, віхурны, шумны век...», «Здабыў сваю волю», «Ода рукам», «Песнярам Айчыны», «Бель ад зямлі да нямалюбаванне, і «сціплая поза»: «Жыву на сваёй зямлі навідоку ўсёй планеты».

Л. Галубовіч, на мой погляд, нярэдка губляе адчуванне роднай мовы, і тады з'яўляюцца калькі з рускай: «прычасцен», «адначассе», «крыўда абуяе», «Айчыны бескарысны дар», «уставаў на зорцы (?)», «саромеўшыхся слёз»...

Першая кніга Л. Галубовіча па-свойму адкрывала нам свет вёскі, яе жыхароў — захавальнікаў народнай мудрасці і маралі. У «Споведзі бяссоннай душы» таксама ёсць добрыя вершы на гэтую тэму — «Люблю старых людзей...», «Дзеду чысцім калодзеж...», «Жыве Алімпа адзінока...», «Смерць суседкі». Але ўсё ж адчування адкрыцця мала нават у старанна «зробленых» радках: «Сухі апалы жоўты ліст грабуць няўцешныя удовы». А «Рукі спачыну не ведалі ў цёткі...» — прамое перапяванне танкаўскага верша «Мыццё бабкі Ульяны». Мусіць, тэма вёскі, «праблематыка трывалых каштоўнасцей у зменлівым свеце» (У. Гусеў) сёння для Л. Галубовіча вычарпана. Ці дасць пераезд у паўтарамільённы Мінск, дзе паэтам так цесна (па словах Галубовіча), новыя тэмы?..

У «Споведзі бяссоннай душы» адчуваецца работа над павышэннем філалагічнай культуры, авалоданне новымі для паэта формамі верлібра, элегіі, оды, белага верша. Але сказаць, каб у іх была абсалютная неабходнасць, нельга. Здзіўляць вытанчанасцю, зграбнасцю можа і верш традыцыйны.

Гарыць чырвоная сукенка
Сярод зялёнае травы...
— Прашу на танец вас, паненка.
Няўжо адмовіцеся вы?

Прыціхла стоена сукенка
У росным холадзе травы...
— Прашу дахаты вас, паненка.
Адна заблудзіцеся вы.

Патухла стылая сукенка.
І не прымяць сырой травы...
— Аб чым задумная, паненка?
— Аб тым не ведаеце вы.

Гарыць, як грэшніца, сукенка.
Світальна зяюць паплавы...
— Аб чым вы плачаце, паненка?
— Аб гэтым ведаеце вы...
(«Дзедаўскі прыпеў»)

Інтымная лірыка наогул удаецца Л. Галубовічу як паэту шчырага і паўнакроўнага пачуцця. Думаю, не адна чытачка пазайздросціць загадкавай Любові А-вай, якой прысвечаны лепшыя вершы пра каханне. «Вечная тайна», «спакуса недаступнасці» — вось што для паэта каханая:

На імгненне — імгненне шчасця...
І да смерці — мальба аб ім.

Усё ж згадзіцеся: талент калі ёсць, то ёсць, і ім асветлены нават і не самыя вялікія ўдачы паэта. А ў «Споведзі...» шмат вершаў проста выдатных, у якіх канкрэтная выразнасць, звычайнасць і непаўторнасць (адзінкавасць) малюнка вырастаюць у такое філасофскае абагульненне, што прад таямніцай паэзіі сціскаецца сэрца.

«Лістапад», «Ёсць два няведанні, у якіх вучуся...», «Дыялог жыцця», «Дарэмная мара» — гэта філасофскае спасціжэнне сэнсу жыцця, прасякнутае ўнутраным драматызмам, што вырас з «зёрнаў настальгіі і тугі», якія былі ў першай кнізе паэта. Не, ён не песміст і зусім не аздабляе свае вершы «налётам сусветнай тугі». Проста неабачліваму аптымісту наўрад ці ўдаліся б такія радкі:

І ў маладой бярозы, і ў старой
Вясной шуміць зялёны лістабой.
Адрозніць цяжка: дзе чыё лісцё —
Адна зямля, адзінае жыццё.

І восенню асыплецца на дол
І са старой лісцё, і з маладой.
Ідзеш, ступаеш па сухім лісці—
Не ведаеш, як старасць абысці.

І хаця некалькі гадоў назад на старонках «ЛіМа» Л. Галубовіч моцна здзіўляўся праявам «нейкай элегічнасці і песімізму» ў маладой паэзіі (нібы гэта яе найбольшая бяда!), у яго новай кнізе жывуць і горкі боль, і сучасныя трагедыі:

Не зачапіўшы за жывое,
Грыбніцу ціха абыду.
Хай узыходзіць маладое
З зямлі, ў якую сам сыду.

Л. Галубовіч даўно лічыць, што паэзія — справа прафесійная. Добра гэта ці дрэнна — можна паспрачацца, калі ўспомніш Купалава «я не паэта...»

За залатым цісненнем вокладкі гэтай кнігі чытач знойдзе залацінкі сапраўднай паэзіі. Яны ў вершах, народжаных **перажытым**, бо толькі яно, у адрозненне ад **пражытага**, можа быць прадметам творчасці.

В. РУСІЛКА.

г. Віцебск.

ЧЫТАЧ ДЗЕЛІЦЦА ЎРАЖАННЯМІ

Ад Дзвіны да Волгі

У мінулым годзе ў Волга-Вяцкім выдавецтве выйшаў зборнік вершаў Генадзя Бядняева «Арыенцір». Уступаючы ў вобразны свет яго твораў, чытач адчувае атмасферу маральнай чысціні і шчырасці. Лірычныя вершы і паэма «Арыенцір», што дала назву кнізе, увабралі ў сябе цэлае чалавечае жыццё з яго драматызмам — жыццё, асэнсаванае ў святле таго гарманічнага ўспрымання свету, якое ўласціва людзям, што прайшлі праз вялікія і цяжкія выпрабаванні лёсу і засталіся вернымі ўсяму святому, што вякамі захоўвае народ.

Аўтар зборніка «Арыенцір» — беларус, які даўно жыве ў Расіі. Ён віцябчанін і ў той жа час ніжагародзец, які ў сэрцы сваім парадніў Дзвіну з Волгай. Для яго ўжо немагчыма аддзяліць любоў да мацярынскага поля ад любові да волжскай зямлі, з якой лёс звязаў паэта глыбокімі чалавечымі сувязямі. Невыпадкова адзін з ягоных вершаў названы так: «Мой Пушкин из Витебска родом».

Уся паэзія Г. Бядняева, як ён сам піша, узнікае і жыве «на волне сближения людей». І ў вершы «У Вечного огня» паэт, адказваючы на жарт сябра аб тым, што ён стаў паўпрэдам Беларусі на Волзе, ужо ўсур'ёз піша:

Быть может на земле нижегородской
Порою впрямь полпредом выступаю,
Когда рабочим в перекур короткий
Я белорусские стихи читаю.

Лірычны герой паэзіі Г. Бядняева належыць да пакалення, якое са школьнай лаўкі ішло на франты Вялікай Айчыннай вайны і да часу рабілася дарослым «в первых битвах, в горестном начале». Вобразнаму стылю паэзіі Г. Бядняева ўласціва свайго роду шматзначная прастата, калі звычайная бытавая дэталь у мастацкім кантэксце твора набывае глыбокі сэнс, сімвалічны характар.

Побач з лірычным героем у вершах Г. Бядняева паўстае цэлая чарада тонка акрэсленых светлых чалавечых вобразаў. Гэта перш за ўсё кранальны вобраз маці паэта, да якой звернуты многія радкі зборніка; гэта журботны, але светлы цень рана памерлай жонкі.

Лірычны герой Г. Бядняева акружаны людзьмі цяжкага лёсу і гарачага чулага сэрца, тымі, што «прошли дорогою крутою в самый скорбный для Отчизны срок». Гэта Сцяпаныч, у мінулым беларускі партызан, сусед паэта Ягорыч, інвалід вайны, вялікі працаўнік і жыццялюб. Часам гэтыя людзі праходзяць у радках зборніка без імені, але мы адчуваем іх сэрцы. Не названы, але жывуць у вершах паэта тыя, хто, падаючы ад голаду, дзяліўся з ім апошняй крошкай, каго не зламаў фашысцкі палон.

Часам чытач скажа, што ўсё гэта даўно мінула. Не. Гэтыя людзі блізкія і неабходныя нам менавіта цяпер, блізкія сваёй сілай духу, неабыякавасцю да людзей, невычэрпнасцю веры ў чалавека. Ці ж можа паблякнуць і, так бы мовіць, знікнуць у тумане дзесяцігоддзяў вобраз юнага лейтэнанта, што ў фашысцкім палоне ў апошнія хвіліны перад расстрэлам імкнуўся «оцепенелой толпе» аднапалчан надаць мужнасці:

Своим «прощайте» словно обнимал.
И были у него глаза такими,
Что нас в самих себе приподнимал.

Асаблівасцю паэтычнага зборніка Г. Бядняева з'яўляецца тое, што пры ўсім драматызме жыццёвых фактаў, якія ляжаць у аснове многіх яго твораў, пануючай у ім застаецца тэма перамогі жыцця, дабра і прыгажосці. У якасці запеўкі ў зборніку дадзены цыкл вершаў, прысвечаных Пушкіну, які даўно стаў для нас сімвалам светлага гарманічнага ўспрымання свету. Жыццесцвярджальны пафас паэзіі Г. Бядняева заснаваны на ідэі братэрства людзей і яднання чалавека з прыродай.

І гэтым паэзія Г. Бядняева блізкая да традыцый беларускай класікі. І таму заканчэнне зборніка перакладамі з М. Багдановіча ўспрымаецца зусім натуральным.

А. ЛЕНСУ.

«Талент поўны і разнастайны...»

Спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Янкі НЁМАНСКАГА, мужны і светлы талент якога быў заўчасна загублены бязлітаснай сталінскай машынай вынішчэння.

Пісьменнік, вучоны, вядомы дзяржаўны дзеяч Іван Андрэевіч Пятровіч паходзіў з беднай сялянскай сям'і, што жыла ў вёсцы Шчорсы на Навагрудчыне (нарадзіўся 31 сакавіка (12 красавіка па н. ст.). Ужо тое, што ён сялянскі сын,— спадзеючыся толькі на ўласныя сілы, змог скончыць настаўніцкую семінарыю і паступіць у Пецярбургскі універсітэт, сведчыла пра яго вялікія здольнасці, прагу ведаў. Гэтыя веды, жыццёвы вопыт, набыты ім пазней ў гады рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, актыўнай рабоце ў Белнацкоме, ён цалкам прысвячае развіццю навукі, культуры, народнай гаспадаркі Беларусі.

Вярнуўшыся ў верасні 1922 года з Петраграда на радзіму, Мінск, Іван Андрэевіч Пятровіч адразу ўключыўся ў мірную стваральную працу. Ён быў прызначаны сакратаром Эканамічнага савета рэспублікі, намеснікам старшыні Дзяржплана БССР, абіраўся дэлегатам 8-га Усебеларускага з'езда Саветаў, быў членам ЦВК БССР 8—11 скліканняў, прымаў непасрэдны ўдзел у рабоце Інбелкульта. Пасля заснавання Беларускай Акадэміі навук абіраўся яе правадзейным членам, пазней неадменным сакратаром, членам Прэзідыума АН БССР, вучоным сакратаром Інстытута эканомікі.

1922 год наогул быў знамянальным для вучонага і пісьменніка. Першы нумар часопіса «Полымя», які пачаў выходзіць з гэтага года, адкрывала яго апавяданне «Над Кроманню». І затым ужо амаль штогод мастацкія творы Янкі Нёманскага друкаваліся ў перыядычных выданнях, выходзілі асобнымі кніжкамі, перакладаліся на рускую, украінскую, польскую мовы. Яшчэ ў 1918 годзе, у Маскве, быў выдадзены першы зборнік твораў беларускіх пісьменнікаў, дзе Я. Нёманскі змясціў артыкул, у якім пісаў: «Сучаснае наша пакаленне мае вялікую чэсць быць стваральнікам новага жыцця: наш час—час перабудовы ўсяго дзяржаўнага і культурнага ўкладу, які важкім каменем ляжаў на кожным працоўным чалавеку Расіі, беларуса ён прыгнятаў асабліва цяжка. З глыбокаю вераю ў сваё шчасце, якога ўжо дагэтуль у нас ніхто не адніме, мы смела і проста будзем глядзець у сваю будучыню». Падставы для гэтай веры былі створаны ўсеагульным уздымам першых гадоў рэвалюцыі, якая давала людзям сапраўды вялікія спадзяванні на свабоднае і шчаслівае жыццё. Надзейны грунт для пабудовы такога жыцця Я. Нёманскі бачыў у развіцці навукі, культуры, талентаў з народа, і, зыходзячы з гэтага, акрэсліваў першачарговыя задачы: «Беларусь бедная сапраўднай інтэлігенцыяй. У Беларусі не было вышэйшых навучальных устаноў, беднасць беларуса пазбаўляла яго магчымасці вучыцца хоць бы ў расійскіх універсітэтах, а тыя, хто меў магчымасць вучыцца, былі адарваны ад народа, яго мовы, духоўнага свету і запатрабаванняў беларуса. Каб гэта адарванасць згладзілася, трэба вялікая колькасць вучэбных устаноў, куды шырока былі б адкрыты дзверы для дзяцей народа, па-другое, выкладанне ў іх вялося б на роднай беларускай мове, з увядзеннем у кола агульных навук вывучэння літаратуры, нораваў і звычаяў Беларусі, яе нацыянальных асаблівасцей, гісторыі і прыроды краіны. Са спалучэннем простай народнай душы, са святлом навук запалымнее яркая зорка шматпакутнай Беларусі». (К культурна-прасветным задачам Беларусі. Зб. «Зажынкі», Масква, 1918, с. 102).

Літаратурная спадчына Я. Нёманскага вельмі багатая. Ён шмат друкаваў артыкулаў у «Дзянніцы», якую, дарэчы, выдаваў разам з Ц. Гартным, і дзе ўпершыню з'явіўся яго псеўданім «Я. Нёманскі». Асаблівую цікавасць выклікаюць працы, прысвечаныя эканамічнаму становішчу Беларусі, яе гісторыі, культуры («Эканамічнае становішча Беларусі», «Адзіны падатак і сялянская гаспадарка», «Аб планаванні мясцовай гаспадаркі», «Дзяржаўная прамысловасць Беларусі», «Нацыянальныя задачы Беларусі», «Інтэрнацыяналізм і нацыяналізм», «Будучыня сялянскай гаспадаркі на Беларусі» і інш.) У гэтых змястоўных артыкулах, публіцыстычных нарысах, навуковых працах вылучаюцца важныя для пісьменніка назіранні, думкі, ідэі, якія потым ён выкарыстоўваў у сваіх мастацкіх творах.

Характар грамадскай і палітычнай дзейнасці абумовіў праблематыку яго літаратурных пошукаў. У Нёманскага не было доўгага вучнёўскага перыяду—пісьменніцкай школай для яго было само жыццё. Першы зборнік апавяданняў празаіка з'явіўся ў 1925 годзе, а ў 1928 годзе быў перавыдадзены пад назвай «На зломе». На рускай мове гэты зборнік выйшаў у Ленінградзе ў 1930 годзе з уступным артыкулам С. Замбржыцкага. Аповесць «Партызан» і раман «Драпежнікі» друкаваліся на старонках часопіса «Полымя» ў 1927 — 1930 гадах.

М. Гарэцкі ў артыкуле «Творчасць Я. Нёманскага» трапна вызначыў характэрныя асаблівасці яго пісьменніцкай індывідуальнасці: «Піша Я. Нёманскі незвычайна проста і праўдзіва, не паганяючы за танным поспехам праз бульварныя эфекты, як гэта робяць, на жаль, некаторыя нашы маладыя пісьменнікі. І калі ў яго зборніку тым часам усё-такі смерць у большасці апавяданняў, дык гэта трэба тлумачыць характарам эпохі, у якую адбываецца дзеянне ў гэтых апавяданнях. Драматычныя моманты ў яго не надуманы, а выцякаюць самі з усяго ходу апавядання... Я. Нёманскі ёсць тыповы беларускі аўтар нацыянал-рэвалюцыйнага і паслякастрычніцкага перыяду—ён ахоплівае беларускае жыццё досыць разнастайна і поўна».

І сапраўды, пісьменнік бачыць і малюе перш за ўсё чалавека, а праз яго лёс выяўляе тое агульнае, чым жыве свет, эпоха. Падзеі, людзі, іх побыт, беларуская прырода—вось той жыццёвы матэрыял, да якога аўтар адносіцца надзвычай актыўна, з абвостранай зацікаўленасцю, бо гэта яго радзіма, яго народ, дзеля шчасця якога ён жыве, змагаецца. Адлюстроўваючы жыццё сваіх герояў на сумежжы старога і новага, выкрываючы негатыўнае ў іх побыце, свядомасці, пісьменнік паказваў простых людзей, надзеленых глыбокім, цвярозым розумам, спагадлівым сэрцам. Майстэрства Я. Нёманскага асабліва выявілася ў стварэнні побытавых сцэн, апісанні працы сялян, фабрычных рабочых, што было надзвычай каштоўным вопытам для развіцця новай беларускай прозы. Цудоўная прырода Беларусі выступае паўнапраўным героем яго твораў. Наогул, характэрнай адметнасцю прозы Я. Нёманскага з'яўляецца яе прывязанасць да беларускай геаграфіі. Амаль кожнае апавяданне мае канкрэтнае месца дзеяння, якое называецца дакладна (Кромань, Мінск, Лепельскае возера, Бярэзіна, Барысаў, Докшыцы, Петрыкаў, Тураўскія лясы, Віцебск, Чашнікі і г.д.). Жыццё глыбіннай Беларусі, якой Я. Нёманскі прысвячаў свае апавяданні, адкрывала перад пісьменнікам вялікае мноства тэм, характараў, праблем, сюжэтаў, якія ён рэалізаваў у аповесці «Партызан», рамане «Драпежнікі».

Калі аповесць, створаная ў неарганічнай для таленту Я. Нёманскага традыцыі маладнякоўскай прозы, з'явілася своеасаблівай данінай часу, то раман стаў адным з лепшых узораў беларускай эпікі. Аўтару ўдалося ўпершыню ў беларускай літаратуры ахапіць многія праблемы перадрэвалюцыйнага часу, паказаць у рэзкім кантрасце страшную галечу сялян, фабрычных рабочых і і неверагодную раскошу пануючага класа. Яшчэ ў 1919 годзе ў артыкуле «Рэвалюцыйная праца на Беларусі» Я. Нёманскі пісаў: «Беларускае сялянства—гэта наогул вялікі жабрак. Нідзе ў свеце няма такой беднасці, убогасці ўсяго сялянства, як на Беларусі. І побач з гэтым нідзе няма такіх вялікіх і багатых маёнткаў, як у той самай Беларусі. Вось гэта беднасць агулам усяго сялянства і падтрымлівала ў ім усягдашнюю незадаволенасць і складала атмасферу рэвалюцыйнасці, што чакала пабочнай сілы, якая б зрабіла штуршок і дала напрамак драмаўшым сілам». («Дзянніца», 1919, № 2 (46).

Храналагічна раман пачынаецца з 1907 года—часоў сталыпінскіх рэформ, заняпаду рэвалюцыйнага руху. Выкрываючы жыццё і дзейнасць драпежнікаў-эксплуататараў, у цэнтры якіх—два найбольш грунтоўна і шырока намаляваныя вобразы памешчыкаў Станіслава Ляскоўскага і князя Друцкага, як сімвалічна-тыповыя, Я. Нёманскі вылучыў каларытныя фігуры гандляра і спекулянта Майсея Ліўшыца, губернатара Курлава, кола яго падначаленых, розных прыслужнікаў, паліцэйскіх, дробных памешчыкаў, шляхты. Апісваючы іх узаемаадносіны, цесную пераплеценасць інтарэсаў, пісьменнік дае цікавыя падрабязнасці, сцэны асабістага жыцця арыстакратаў, падкрэсліваючы яго адмежаванасць ад народа. Побач з раскошай паўстае жыццё працоўнага люду: галеча, бяспраўе, жабрацкая аплата цяжкай працы, невыносныя пабытовыя ўмовы, смурод гарбарняў, сялянскія курныя хаты. Бесчалавечная эксплуатацыя рабочых, пралетарызацыя беззямельных сялян, раскол і хістанні ў падпольным рэвалюцыйным асяроддзі, барацьба розных партый і груп, упадак і бязвер'е перадавой інтэлігенцыі, узмацненне рэакцыі, аб'яднанне памешчыцкага і гандлярскага капіталу—вось тая жыццёвая канва твора, па якой можна прасачыць сюжэтныя лініі: прыватныя, грамадскія, палітычныя.

Другая частка гэтага цікавага твора не пабачыла свету. Надышоў 1937 год...

Цяпер, калі з'явілася магчымасць гаварыць і ведаць праўду пра сталінскія рэпрэсіі, і КДБ неахвотна, але прыадчыняе свае архівы, мне давялося пазнаёміцца з асабовай справай «ворага народа» І. А. Пятровіча. Хоць раней, напачатку 80-х, калі Інстытут літаратуры АН БССР распачаў працу па вяртанні спадчыны рэпрэсіраваных пісьменнікаў, і я пісала нарыс жыцця і творчасці Я. Нёманскага, рыхтавала збор яго мастацкіх твораў (Я. Нёманскі. Творы. Мн., «Мастацкая літаратура», 1984), то, памкнуўшыся тады ў КДБ, атрымала адказ: «Дела И. А. Петровича в наших архивах не имеется». І вось толькі ў 1990 годзе ветлівы чыноўнік вынес мне два таўшчэзныя тамы: следчая і судовая справа І. А. Пятровіча. Пасля доўгіх перагавораў, пісьмовых запатрабаванняў і просьб, у парадку выключэння мне далі ўсё ж магчымасць упэўніцца, нарэшце, што ў гэтых папках няма рукапісу другой часткі рамана «Драпежнікі». (Знайшліся ж у архівах КДБ дзённік Б. Мікуліча, «Творы з-за кратаў» Л. Калюгі!) Ці трэба гаварыць, з якім хваляваннем гартала я старонкі шматлікіх допытаў, пратаколаў, распазнаючы на кожнай з іх характэрны, прыгожы роспіс І. А. Пятровіча, мільганне прозвішчаў Чарвякова, Галадзеда, многіх іншых дзеячаў, пісьменнікаў Беларусі, «вочныя стаўкі», «стаянне на канвееры», бязглуздыя пытанні следчых (вось іх прозвішчы: Быхоўскі, Кац, Волчэк, Кунцэвіч, Матулевіч, Кудраўцаў, Кірылаў). Абвінавачвалі І. А. Пятровіча за тое, што ён «польскі шпіён», «нацдэм», і галоўнае, што некалі быў левым эсэрам. Сам І. А. Пятровіч прызнаваў:

«Документ о членстве в партии левых эсеров я имел только в течение месяца. Как только мне стало известно из газет о мятеже левых эсеров, я немедленно же и окончательно порвал с этой контрреволюционной партией. Но при вступлении в Коммунистическую партию я преуменьшил своё участие в лево-эсеровской организации, назвав себя сочувствующим, и этим самым совершил преступление перед КП(б)Б. Я решительно осуждаю это своё преступление, признаю, что заслуживаю сурового взыскания, но не исключения из рядов партии, так как последнее не вытекает из моей работы и жизни. Своей честной преданной работой почти в течение 3,5 лет в рядах Красной армии и затем 13 с лишним лет на видной советской работе, работе большой и напряженной, особенно в Госплане, я доказал, что заслуживаю быть членом Коммунистической партии и думаю, что искупил свою вину, свое кратковременное заблуждение—пребывание в партии левых эсеров в 1918 году».

(З хадайніцтва І. А. Пятровіча перад ЦК ВКП(б) аб аднаўленні ў партыі).

У пратаколе вобыску і арышту не пазначана, што была забрана другая частка рукапісу рамана «Драпежнікі» (Изъято: переписка разная, блокнотов 11 штук, 10 книг под редакцией Петровича и т.д.), хоць з хадайніцтва жонкі І. А. Пятровіча аб рэабілітацыі мужа відаць, што другая частка рамана «У віры» была ўжо збрашуравана, але свету не пабачыла з-за арышту аўтара. Дзе яна можа быць? Усе намаганні адшукаць рукапіс пакуль што не далі ніякіх вынікаў. Само ж хадайніцтва гэтай мужнай, шматпакутнай жанчыны наогул характэрны дакумент, які гаворыць пра сталінскую эпоху, апякаючы болем і суперажываннем трагічнаму лёсу сям'і так званага «ворага народа»:

«31 декабря 1937 года вместе с другими женами я была отправлена с этапом в Акмолинские исправительно-трудовые лагеря на 8 лет. Полностью отбыла свой срок. В декабре 1945 г. была освобождена и выслана в г. Вычугу Ивановской области. Старший сын Андрей (1922 г. рожд.) был тоже арестован в 1937 г. и отправлен в Пензу в колонию для несовершеннолетних. После совершеннолетия был отправлен в Свердловские исправительно-трудовые лагеря на 5 лет. Там умер от туберкулеза 12 февраля 1942 года. Двое младших детей—дочь Лидия (1923 г. рожд.), сын Леонид (1926 г. рожд.) находились в детском доме в с. Дарьевке Киевской области. В 1941 г. были эвакуированы в детский дом Саратова. Сын в 1943 г. из 10 класса был призван в Армию, погиб в 1945 г. Дочь окончила Станкоинструментальный институт в Москве, в 1948 г. была направлена на работу в г. Витебск, где с ней жила и я». (Дарэчы, Лідзія Іванаўна Міхайлава і цяпер жыве ў Віцебску).

І яшчэ адна выпіска з афіцыйнага дакумента КДБ:

«26 апреля 1937 года Петрович И. А. был арестован и Военной Коллегией Верховного суда СССР по ст. ст. 63—1, 69, 70 и 76 УК БССР необоснованно приговорен к исключительной мере наказания. Дата смерти 30 октября 1937 года в г. Минске. Реабилитирован Военной Коллегией Верховного суда СССР 16 марта 1957 года».

Дзе невядомая магіла гэтага таленавітага сына нашага народа? Мо яго расстралялі на ўскраіне парку Чалюскінцаў, дзе і многіх іншых пісьменнікаў? Ці мо яго прыняла зямля Курапатаў?

Лідзія САВІК.

Юрка ГОЛУБ

Пасмяротная балада

Татальны страх.
І жорсткі вырак.
Ты пылам стаў:
Душа — у вырай.

Заціх нібы
І вецер сіплы.
Цябе нябыт
Зямлёй засыпле.

Рыдлёўка «праў»
Не пух раняе
І духу прах
З зямлёй зраўняе.

Табе нішто
Цяпер пакуты.

Ты ў стынь, як шкло,
Цяпер закуты.

І над табой,
І пад табою
Сусветны боль
Не ўскрыкне болей.

Ды ты ідзеш,
Як белы прывід,
Туды найперш,
Дзе стогне крыўда.

Табе ж услед
З засаднай хаты
Глядзяць, як след,
Былыя каты.

А ты ідзеш,
Як ходзяць здані,

Займець найперш
Сабе заданне.

З усіх краін
Спыніць праз морак
Раку крыві
У слёзаў мора.

Позняе

Як шкада, што Ларыса Геніюш
Не дайшла да жаданых дзён,
Праўду скажуць калі пра «генія»,
Праўдзе гэтай і я жадзён.

І з Абезі да ружаў Зэльвы
Не ружовы, прынамсі, шлях.
Села памяць на хісткі зэдлік —
Мат канвойны раве ў вушах.

Як шкада, што Ларыса Геніюш
Не паспела на той абрад,
Воля дзе варухнула генамі,
Як паэтчыны, акурат.

Ёй не толькі ісці гародчыкам
І не толькі заслаць абрус,
А пяра бліскавічным росчыркам
Рашчапаць паняверкі брус.

Як шкада, што Ларыса Геніюш
Не сустрэне ўжо свой радок,
А таму і балада гэная
Напісалася назнарок.

Старыца

Нешта сталі старыцца
Крона і крыніца.
Зарастае старыца —
Зеллем караніцца.

Генрых ДАЛІДОВІЧ

ЧЫГІР

АПАВЯДАННЕ

Я К ТОЛЬКІ павярнуў у свой двор, адразу ўбачыў доўгую драўляную лаўку, а на ёй — пажылога, а то, бадай, і старога мужчыну.

Чалавек быў у адмысловай позе: адной рукой трымаў на каленях паношаны чорны, сям-там працёрты, дык з белымі плямінамі партфель, другую звесіў паўз лаўку, адкінуўся на спіну і выцягнуў ногі. Ягонага твару не было відаць: на яго аб'ехаў шэры капялюш.

Спачатку я, скажу шчыра, хацеў прайсці, не зважаць. Палічыў: прысеў і заснуў п'яны. Але і па наваксаваных чорных чаравіках, па ношаным, але адпрасаваным светла-зялёным касцюме, гальштуку і гэтым старым, але нічым не абпырсканым, акуратным партфелі я адчуў душой: не, гэта — не п'яніца: старыя і асабліва адзінокія жлуктачы апушчаныя, брудныя, нават часамі, выбачайце, ужо і гідкія, а гэты мужчына — інтэлігент. Можа, нават з роду дзівакоў, што маюць вышэйшую адукацыю, чымсьці вельмі захопленыя, нават звыш меры, выхавалі ў сабе культ кнігі, ведаў, з-за іх не бачаць ні свету, ні жыцця, шануюць, любяць доўга насіць сваё любімае адзенне і абутак. З іх, бывае, пасміхваюцца, а яны нібы не бачаць гэтага, жывуць, паводзяцца па-свойму. Яшчэ нядаўна, калі жыў у іншым доме, адзін з суседзяў па пляцоўцы быў якраз такі дзівак-пенсіянер, як гаварылі за вочы, «звіхнуты на летапісах». Можа, вось такі самы зайшоў сюды ці нават жыве тут — я перабраўся ў гэты стары, яшчэ хрушчоўскі дом з высокімі столямі ўчора, дык яшчэ нікога з насельнікаў не ведаў.

Агледзеўшыся, я заўважыў: двор наш не зусім бязлюдны. Блізка, каля агароджы дзіцячага сада і пад высокімі густымі таполямі, корпаецца ў маторы легкавіка малады мужчына ў джынсах і красоўках, а воддаль, каля майго пад'езда, дзе стаіць ужо новы дом, сядзіць дзед у светлым касцюме і капелюшы. Праўда, абодва, малады і стары, не паварочваюць галавы, быццам не заўважаюць гэтага, можа, ужо і нябожчыка.

«Значыць, усё ж п'яны»,— рашыў я, вагаючыся: падысці да небаракі ці не. Пажыўшы з дзесятак гадоў у горадзе, не раз і не два бачыў: гарадскія амаль заўсёды абыходзяць як тых, хто ад гарэлкі страціў усялякі чалавечы воблік, так і тых, хто не браў у рот і кроплі, страціў прытомнасць зусім па іншай прычыне. Зрэшты, я і сам прызвычаіўся ўжо прашмыгваць каля такіх грэшных ці нешчаслівых людзей.

Можа, і з-за таго, што быў у сваім двары, сёння я не змог абмінуць бедака, наблізіўся і моўчкі патармасіў яго за худы плячук. Чалавек захістаўся ўвесь — неўзабаве з яго галавы ўпаў капялюш і агаліў вялікую жаўтаватую, з карычневымі кропелькамі лысіну, высокі маршчыністы лоб, акуляры на даўгаватым і шырокім унізе носе, выгаленыя запалыя шчокі. Не, гэты чалавек не быў на малым ці вялікім падпітку, ён хутчэй за ўсё самлеў. Я хуценька падняў яго апушчаную руку, прыклаў вялікі палец да запясця — рука не была цёплая, але і не халодная, а праз колькі хвілін я адчуў і кволы пульс.

Тады я шпарка падняўся ў сваю кватэру на чацвёртым паверсе і пазваніў у «хуткую». Адтуль доўга, выклікаючы ўва мне абурэнне, распытвалі, хто я, дзе жыву, а пасля ўжо зацікавіліся і гаротнікам. Але калі я выйшаў на двор, запыніўся каля свайго «пацыента», то «хуткая» заявілася тут неўзабаве. За ёю амаль услед прымчала міліцэйская машына.

Спачатку непрытомнага агледзеў малады рыжы лейтэнант, а пасля да таго падышла немаладая жанчына ў белым халаце і белай шапачцы.

— Не, не п'яны,— сказала амаль адразу.— І пульс адчуваецца...

Цяпер, неяк дзіўна павёўшы бялёсымі бровамі, лейтэнант змераў з ног да галавы мяне:

— Вы — хто?

— Я жыву ў гэтым доме. Пазваніў вось у «хуткую»...

— Прозвішча хворага ведаеце?

— Не.

Лейтэнант схмурыўся, зірнуў на мяне неяк грэбліва, павярнуўся і гукнуў маладому чалавеку, які ўсё яшчэ не адыходзіў ад сваіх «Жыгулёў»:

— Грамадзянін-вадзіцель! Вы ведаеце гэтага чалавека?

— Не,— буркнуў той, амаль не азіраючыся.

— Жыльцы аднаго дома называецца!— злосна кінуў лейтэнант.

Я змаўчаў. Дзеля чаго апраўдвацца цяпер, калі звычайна так і бывае, як сказаў гэты міліцыянер.

Дзеда ў белым лейтэнант не зачапіў. Відаць, не паспадзяваўся на ўдачу.

Пасля, калі я, узрушаны, у чымсьці не паважаючы самаго сябе, вяртаўся дамоў, мяне нечакана запыніў стары. Як я ўбачыў, невысокі, таўсматы, некалі чорны, а цяпер спрэс сівы, з арлінымі носам і таўстагубы.

— Выбачайце, малады чалавек,— ён падаў голас па-руску, але нібы з нямецкім акцэнтам.— Гэта вы ўчора перабраліся ў наш дом?

— Я.

— Вы до-бра ведаеце, каму толькі што памаглі??? — у выцвілых вачах старога бліснулі пагрозлівыя агеньчыкі.

— Пажылому і хвораму чалавеку,— трохі з выклікам адказаў я.

— Эх вы, гуманіст!— усміхнуўся, але зноў незычліва дзед.— Ведайце: гэты «пажылы і хворы чалавек» — а д п е т ы н а ц ы я н а л і с т...

Прызнаюся, я не то ўспыхнуў ад гневу, не то заадно і разгубіўся: як тут адносіцца да аднаго і другога — — чыёйсьці хваробы і такога ліха?.. Па-другое, я не чуў, каб тут, у нашым горадзе, каб цяпер, у наш час, жылі і гэтыя самыя — маманты ці што! Іх жа, «хто не хацеў Кастрычніка», «хто нюхаўся з Пілсудскім і фашызмам», як вучылі мы па падручніках гісторыі, усіх пазводзілі, а калі хто ўцалеў, дык за мяжою і адтуль, «з падваротні», як яшчэ нядаўна пісалі, «брэша на нашу слаўную краіну, на нашы поспехі і жадае нам бяды і гора». І раптам... Што — гэты выжыў, цяпер, у адлігу, вылез з нары на свет?

— Разумееце,— свідраваў вачыма мяне дзед,— я болей пяцідзесяці ўжо гадоў кажу яму «здравствуйте», а ён мне сваё: «дзяньдобры»...

— Дык з-за гэтага сыр-бор?— непрыязна вырвалася ў мяне.

— Не толькі,— не сумеўся дзед.— Я ж кажу вам: ён — адпеты... Ён сядзеў. І ў наш час...

— Выбачайце, а вы хто?— запытаў я.

— Гэта не важна,— той схмурыў чорныя бровы і намерыўся адысці.— Я вас перасцярог: пабераж ыцеся, калі не хочаце мець непрыемнасцей... Перабудова перабудоваю, ад якой вы, маладыя, вельмі ж захмялелі, а такія рэчы... Ніякага спуску... Зразумелі?!— прыплюшчыўся.— Ці спачуваеш такім, плачаш па «мове»? Мо нефармал альбо з народнага фронту?

А Д СУСЕДЗЯЎ па пляцоўцы я даведаўся, што прозвішча хворага — Чыгір, што ён гадоў пятнаццаць ужо на пенсіі, жыве ў нашым доме ў аднапакаёўцы і што ён двойчы, пры Сталіне і пасля яго, сядзеў і нібы сапраўды за нацыяналізм.

«За што?»— спрабаваў я ва ўсіх дапытвацца.

«А бог яго ведае... — звычайна паціскалі плячыма ў адказ.— Кажуць: нацыяналіст, і мы кажам... А так ён чалавек адзінокі, ціхі, культурны, нікому ў доме нават вока не запарушыў...»

Што да дзеда ў светлым касцюме, дык мне сказалі, што ён таксама пенсіянер, у свой час быў урачом. Занядужае хто ў доме, дык, бывае, бягуць да яго, і ён не адмаўляецца, памагае.

Назаўтра ці праз дзень мяне паслалі ў камандзіроўку, пасля яе было нямала іншых клопатаў у газеце і ў сям'і, а таксама захапіўся будоўляй на дачным участку — карацей, не пастараўся знайсці Чыгіра, зайсці да яго ў бальніцу, а ў яго, як пасля даведаўся, быў ужо трэці інфаркт. Не, я не баяўся сустракацца з такім чалавекам. На жаль, мы, цяперашнія людзі, такія: пакуль свой камар не ўкусіць, не можам адчуць болю, лічым людскую бяду найперш чужой і далёкай нам, а свае звычайныя клопаты лічым самымі важнымі на свеце...

Сустрэліся мы з Чыгіром, можа, толькі на чацвёрты месяц пасля нашага знаёмства, ужо зімой, калі не адзін раз падаў, знікаў, зноў налятаў снег, то браўся, то адступаў мароз, калі адзін дзень было сыра, шмат вады, другі — шчыкліва, галалёдна, трэці — сухі мароз і белы снег, адным словам, ішла звычайная ў апошнія гады, няўстойлівая беларуская зіма. Дык вось, калі я аднойчы пазнавата, парыпваючы хрупкім снегам, крочыў дахаты, мяне пры святле блізкага ліхтара ўгледзеў Чыгір. Запыніў і падзякаваў за паратунак. Як і гаварыў дзед у светлым, размаўляў ён «на мове», і я, хоць быў невялікі знаўца, адчуў: Чыгір прамаўляе «чыста» — значыць, недзе з-пад Мікалаеўшчыны ці паблізу яе.

— Калі і вы ўмееце, хочаце размаўляць па-свойму, дык нас, такіх дзівакоў, будзе ўжо два ў доме, — усміхнуўся ён.

Спачатку, тыдзень-два, пры сустрэчы мы толькі віталіся, пасля пачалі загаворваць — то пра надвор'е, то пра публікацыі ў маскоўскіх газетах і часопісах.

— Паслухайце, Іван Аляксеевіч, — вырвалася аднаго дня ў мяне. — Я чуў, што вы прайшлі сталінскія і пазнейшыя лагеры. Давайце напішыце нам пра гэта.

Чыгір — а ён быў сярэдняга росту, у свой час, мусіць, каржакаваты, дужы мужчына, а цяпер высахлы, як вялены лешч, да таго ж кульгавы на правую нагу,— нічога мне не адказаў, толькі неяк раптоўна ўвесь нібы ўвайшоў у сябе, кроў быццам адліла ад ягонага твару, і ён вельмі бездапаможна ўжо абапёрся на самаробны кіёк. Бачачы, як за міг счах чалавек, я пакаяўся ўжо, што, захапіўшыся журналісцкім азартам, гэтак неабдумана ляпнуў пра тое, што ўявіў для сябе «цікавым», а што для Чыгіра было жыццём, і жыццём, канечне ж, нялёгкім.

— Выбачайце, Іван Аляксеевіч... — адступіў я.

— Вы, калі ласка, выбачайце, — адказаў ён, дастаў насоўку і выцер пот на лобе. — Не трэба...

Я цяпер змаўчаў.

— Па-першае, не магу, не хачу чапаць незагойную рану... Па-другое, вы не надрукуеце. Думаю, на мне ўсё яшчэ тое страшнае кляймо...

— Што да першага, Іван Аляксеевіч, то глядзіце самі, тут вас ніхто змушаць не будзе. А што да другога, то я гэта магу ўзяць на сябе...

— Ды я вызвалены, але нерэабілітаваны... — выдыхнуў ён з болем. — Адпаведна, вам знацца са мной небяспечна...

— А калі я сам хачу ва ўсім разабрацца? — запытаў я. — Цяпер рэабілітоўваюць і тых, на якіх яшчэ да нядаўняга, як вы кажаце, стаяла жудаснае кляймо...

— На мне жудаснае кляймо, дарагі мой чалавек. Нацыяналіста. А гэта, паверце, самае страшнае. Калі паставілі — то навек... За ўсё могуць дараваць, але толькі не за гэта... Чаму так — не ведаю, і вы ніколі не ўведаеце...

Пры апошніх словах са свайго пад'езда выйшаў знаёмы дзед — праўда, цяпер у белых ботах, у паліто з каракулевым каўняром і ў каракулевай папасе, адразу кінуў учэпісты позірк на нас — Чыгір замітусіўся, папрасіў у мяне выбачэння і борздка закульгаў у суседні пад'езд. Дзед буркнуў мне сваё «здравствуйте», затрымаў на хвілі-

Нешта нам нявесела
Ля сваіх ваколіц.
Галаву павесіла
Весялосць на волле.

Нешта нездаровіцца.
На душы — знямога.
Сэрца, бы ў сукровіцы.
Браце, не замнога?

Да вяршыняў велічы
Не дайсці — задуха.
Ходзім, голаў квелячы
Тым жа боскім духам.

Ды, напэўна, здарыцца
Нешта не з раскладу:
Забруіцца старыца,
Заспявае складна.

З светам повязь крэўная.
Ён у нас глядзіцца.
Загудзе па крэменю
Рэчка Маладзіца.

Вандроўка ў Варняны

Цуд, не больш і не менш,
пабачыць
(Час датла іх не ўсе расцёр)
Павёў мяне Рычард Балячыц
У Варнянскі касцёл.

Месц тамтэйшых і сын,
і знаўца,
Не дазволу ў бога прасіў —
Прапаноўваў высока ўзняцца,
Аж наколькі хапіла б сіл.

Дзіва ў зрэнках, напэўна,
стыла,
І задумваўся не на зло:
А якім памножаны стылем
Думкі дойліда на мазоль?

Лахманы крыжавога веку
Ураган растрос на рагах.
Пад панурым, як немач, векам
Не пра тое маўчаў арган?

Дык вядома, у дзікай драме
Неаднойчы. Хрыстос канаў.
Паднябессе стаяла ў храме,
Як падвешаны акіян.

Не расколаты доўбняй, працай,
Галасы з навакольных хат
Аціхалі ў высокім спраце
І знаходзілі душы спрат.

Тут пачуццям святла хапала,
Уздымаўся паволі лёс.
І за грудзі жальба хапала —
Хваля так абдымае плёс.

...Адплывала ў смугу званіца,
І гаёў зелянеў экран.
Немагчыма з дарогі збіцца,
Як вяртаешся да Варнян.

Кушляны. Восень

Кушляны. Восень. Жарабя.
Мацея Бурачка сядзіба.
Тут час ствалы не парубаў —
Навекі пасадзілі.

І камянёў, і каміноў
Стаяць жывыя цені,
Стаяць, як праўда над маной,
Або святло над цемрай.

...Дарога несла вараных,
А тыя — адваката:
Уцёк з паўстанцкай стараны,
Скрываўлены ад катаў.

Не паратунку ён шукаў —
Адчаем поўніў вока.
Маўляў, хто сеў на мужыка —
Не ўздымецца высока.

Штось фурман сціх на перадку
І гаспадар фальварка...
Не будзе прыязні радку? —
Ды толькі ў недавяркаў!

Яснавяльможныя бурчаць:
Ад зерня прэч палову!
Абсяг Мацея Бурачка.
Сусвет змаганскі слова.

ну-другую спадылбовы позірк і падаўся на сваю вячэрнюю прагулянку.

Што да Чыгіра, дык я яго, здаецца, зразумеў. Яшчэ нядаўна, пры Чарненку, я браў інтэрв'ю ў аднаго пісьменніка да яго сямідзесяціпяцігоддзя. Калі папрасіў расказаць трохі пра ягоную «дзекабрысцкую эпапею», дык той збялеў, затросся, счах і нічога не сказаў. Праўда, разы са два прыходзілася быць у былым пісьменніцкім доме творчасці, у Каралішчавічах, дык там сёй-той, узяўшы чарку і прагульваючыся пасля вячэры па цёмных лясных сцежках, разнявольваўся і расказваў пра тое, што мы чуем цяпер.

Я не ведаю, што і як было б у мяне з Чыгіром, каб не яшчэ адзін выпадак. На другі ці на трэці тыдзень пасля гэтага нечакана памёр таўстагубы дзед. Адна з бойкіх ці найбольш душэўных насельніц нашага дома абышла ўсе кватэры, сабрала па рублю на вянок і кветкі нябожчыку: казала, гэты Мірман апошні час жыў адзін (жонка яго пайшла на той свет некалькі гадоў назад, а дзеці з унукамі падаліся за мяжу), дык няма каму яго па-людску дагледзець. Канечне, я даў свой рубель. Але калі пасля праводзілі ад дома да жалобнага аўтобуса труну, то сярод тых, хто выйшаў на двор, я не ўбачыў Чыгіра. Увогуле ён не трапляў мне на вочы, можа, з тыдзень. Нават у свае шпацыры — старыя людзі, пенсіянеры звычайна выходзяць пахадзіць у адзін і той жа час. Я не вытрываў і пайшоў да яго — можа, не дай бог, зноў злёг.

Не. Як пазваніў, неўзабаве дзверы адчыніў сам гаспадар — у доўгай карычневай, нібы бальнічнай, піжаме, крыху смешнаватым каўпаку на галаве, у тапачках. Праўда, белы-белы, згорблены і, здаецца, разгублены.

— Заходзьце, — запрасіў ён, адступаючы ў вузкім калідорчыку, дзе чулася цяпло, але цяпло трошкі цяжкаватае. Можа, і ад таго, што кватэру амаль не праветрывалі.

— Выбачайце, — сказаў я, павітаўся. — Не бачу вас, ды падумаў: можа, вы зноў занемаглі.

— Але, чуюся кепска, — адказаў ён. — Дык і не выходжу.

Ідучы па калідорчыку, а пасля і па адзіным пакоі, я не пераставаў уражвацца: усюды амаль ніякай мэблі, тым больш мэблі шыкоўнай, дарагой, як цяпер амаль у кожнай гарадской кватэры. Самаробная вешалка ў калідоры, пару старых драўляных крэсел, даўняя канапа, стол і кнігі, кнігі, кнігі на самаробных паліцах.

— О, каб не тыя дваццаць пяць гадоў, што я прамарнаваў па свеце... — Калі я сказаў добрае слова пра яго бібліятэку, сумна захітаў ён галавой. — Гэта — трэці мой збор. Лічы, на пенсію. Першы знік яшчэ да вайны, другі — у дзяржаўнай бібліятэцы. Другога, канечне, мне не шкода, няхай чытаюць людзі, а вось першага, сабранага да трыццаць шостага... — Уздыхнуў. — Большая палова ў ім была з дарэвалюцыйных рэдкіх кніг. У тым ліку былі і летапісы, прыжыццёвыя скарынінскія кнігі.

Памаўчаў, узіраючыся скрозь тоўстыя шкельцы на запоўненыя амаль ад самай падлогі да столі стэлажы.

— А занядужаў я ад смерці Мірмана... — сказаў пасля. — Грэх гаварыць кепска пра нябожчыка, але мы з ім знаёмыя даўно ўжо і не вялікія прыяцелі. Пазнаёміліся яшчэ тады, калі былі студэнтамі: ён — на медычным, я — на філалагічным. Потым, пасля вучобы, дарогі нашы разышліся. Ён недзе знік, а я паступіў у аспірантуру.

Чыгір сёння, бадай, упершыню са мной разгаварыўся, падахвочваючыся расказаць пра сябе. Я слухаў і намагаўся ні лішне не міргнуць, ні як-небудзь не так не дыхнуць — каб не перапыніць гаспадара. А ён нечакана нібы спахапіўся:

— Ды вы сядайце, калі ласка, — паказаў на канапу. — Можа, вам гарбаты?

Я хуценька сеў і замахаў рукамі:

— Дзякую-дзякую. Гарбаты не трэба.

Ён сеў побач, зноў, як і той раз на двары, увайшоў у сябе, але на гэты раз не счах, захаваў нейкую сваю загадкавую душэўную моц.

— Сустрэліся мы з ім у трыццаць шостым, — неўзабаве дадаў. — У мінскай турме, у вядомай многім нашым інтэлігентам «амерыканцы». Сустрэліся адмыслова: я — як вязень, ён — як турэмны ўрач. Калі мяне прыцягвалі ў камеру пасля допыту збітага, дык ён, бывала, прыйдзе паглядзець. Не, не лячыў. Спачатку толькі абмацваў позіркам, глядзеў, ці не аддам богу душу, а пасля пачынаў гудзець, як авадзень: ведай. Янка, дарога сюды шырокая-шырокая, а назад яе няма. Зусім. Тут так: ёсць чалавек — будзе на яго справа. І чым чалавек болей разумны, вядомы — тым хутчэй трэба яе завесці. Так што не ўпірайся, расказвай, што думаў, рабіў супраць Савецкай улады, называй усіх хаўрусні́каў, дык не будуць біць, хутчэй афармяць справу, атрымаеш сваё, адседзіш — і выйдзеш новым чалавекам...

Па першым часе я не мог разабрацца, хто ён: шчыры ці падасланы. Гудзеў, заганяў у кут, збіваў мой дух. Калі ж зламалі мне нагу, і ён пальцам не паварушыў, каб памагчы, то болей зразумеў. Пасля даведаўся: ён дастрэльваў збітых ці асуджаных вязняў — рабіў кантрольны стрэл... Пасля пяцьдзесят шостага яго перавялі галоўным урачом адной з нашых бальніц, ён лячыў, стаў доктарам медычных навук, атрымаў вялікую прэмію, шмат званняў, добрую пенсію, але... памёр, а пахаваць няма каму... Ды новы час мне, каго ён не лічыў за чалавека, дае нейкую надзею, а ў такіх, як ён, забірае тое, што яны ўзялі не так, як трэба... Праўда, яны не здаюцца, чапляюцца за былое «святое», выстаўляюць сябе анёламі, бурчаць, нават гатовы затаптаць новае, але... Хоць скажу вам папраўдзе: нябожчык — не самы страшны для мяне. Такіх, як ён, было нямала. А вось адзін з самых нялюдскіх, злавесных — Чорны чалавек...

— КАЖАЦЕ, расказаць пра сябе, пра Чорнага чалавека? — калі папілі гарбаты з сухарыкамі, сумна ўсміхнуўся Чыгір.— Пра гэта можна сказаць коратка, як у анкеце, а можна апавядаць доўга, успамінаючы такое, што вам, маладому, можа, і не паверыцца... Ну, што я маю вам расказаць вось так адразу, за адзін вечар? Я ўжо, як бачыце, стары, трухлявы грыб, нарадзіўся яшчэ да першай сусветнай вайны на хутары, паблізу Коласавай Мікалаеўшчыны. Мае маладыя гады — юнацтва маіх равеснікаў, на долю якіх выпалі войны і рэвалюцыі, светлыя мары і жудасныя абманы... Калі, да слова, пачалася вайна з кайзерам, мой бацька (а ён у гэты час жыў ужо ў Стоўбцах) падаўся ў бежанцы, аж у Саратаў. Там бацька ўладкаваўся сталяром, маці мыла бялізну, а я глядзеў малодшых сясцёр і брата, там, як па-цяперашняму, скончыў тры класы. Хоць пакрыху абжыліся на чужыне, але бацькоў цягнула дадому. І ў дваццаць першым, калі падпісалі мір з Варшаваю, мы вярнуліся. Толькі ўжо не ў мястэчка, а ў бацькавую родную вёску, да яго брата. Гадоў колькі я памагаў бацькам па гаспадарцы, цёрся каля піянераў і камсамольцаў, бязбожнічаў разам з імі, а пазней, калі сталі на ногі, падаўся ў Мінск на рабфак. Прыехаў у самы пераломны час: ужо не толькі не пад прымусам, але і без лішняй агітацыі, сама па сабе ішла, як тады казалі, беларусізацыя, а заадно (чаго я, малады, гарачы, яшчэ не бачыў) пачалі ўжо ўрывацца халодныя вятры, што пачуліся выразней, калі я вучыўся ўжо ва універсітэце, калі пачалі ў навуцы, у культуры і мастацтве, а то і сярод партыйцаў выяўляць «шкоднікаў, што хацелі вярнуць стары лад, цара», калі цёмнаю хмараю пачало накрываць светлы небасхіл — надта ж над вёскай... У паветры занасілася: у нас ёсць нацдэмы! Спачатку я, як і многія іншыя, як і мая Надзя — а з ёй, студэнткай-хімікам, мы пажаніліся на апошнім курсе, — усе мы не ўбачылі вялікай пагрозы, паверылі: так, ёсць тыя, каму сніцца старое, хто не любіць новае, нас усіх. І калі пачалі браць «адшчапенцаў», мы толькі радаваліся: так вам і трэба, ліхадзеі! Тады ў вялікай цане былі горкаўскія словы пра ворагаў: калі яны не здаюцца, іх трэба знішчаць! Пасля універсітэта мяне пакінулі ў аспірантуры, і я пачаў вывучаць фальклор. Хутка напісаў дысертацыю, меўся абараняць яе, але... Уночы 15 кастрычніка 1936 года ў нашу з Надзяй і маленькім Пятром кватэрку пастукалі... Малойцы перавярнулі ўсё, забралі мае паперы, такія-сякія кніжкі і павялі... Адразу быў я сляпы, а можа, і дурны: бачыце, мяне арыштавалі па абмылцы, а вось іншых — справядліва... А іншыя так думалі пра мяне, з дня на дзень чакалі: выявіцца прыкрая памылка, і іх адпусцяць як ні ў чым невінаватых... Калі мяне цягалі на допыты, калі нават, як казаў, зламалі нагу, я вытрываў, не нагаворваў ні на сябе, ні на іншых, але вось калі пусцілі «на канвеер» — калі следчыя мяняліся па чарзе, а мне не давалі спаць запар дзень, два, тыдзень, другі, трэці, месяц, то... Як ні брыдка, я здаўся, як і падвучваў Мірман, падпісаў усё, што падсунулі. Потым многім паказвалі той мой подпіс, потым той-сёй надоўга затаіў на мяне злосць... 15 мая трыццаць сёмага мяне судзіў і цяпер жывы-здаровы чалавек, з тых, што ядуць балычкі і ні ў чым не каюцца, нават больш — гатовы ў любую хвіліну да новай расправы... Карацей, далі мне восем гадоў за тое, што я, славячы наш фальклор, «ідэалізаваў дарэвалюцыйнае мінулае, а гэтым вёў контррэвалюцыйную прапаганду»... Ужо там, у лагеры, у мяне паяснелі вочы і розум: расстрэльваюць, садзяць не толькі зладзеяў, бандзюг, шпіёнаў, але... самых звычайных — ды дзе звычайных, самых шчырых, сумленных, разумных! — вучоных, пісьменнікаў, інжынераў, урачоў, артыстаў, сялян, рабочых, старых бальшавікоў, хто сядзеў яшчэ ў царскіх турмах, рабіў рэвалюцыю і ставіў на ногі Савецкую ўладу. Сабраўшыся разам, агледзеўшыся, мы, так ужо выхаваныя, не кідалі ценю на партыю, на Сталіна, але не маглі не думаць: чаму, дзеля чаго гэта робіцца? Скажу шчыра, не разбяруся добра і цяпер, калі столькі пра тое ўсё адкрыта. Няўжо быў адмысловы зуб на нашую краіну, на яе лепшых людзей? Няўжо хацелі адкінуць нас далёка назад? Калі гэта так, то як можна было гэтак бессаромна, бязлітасна маніць, дакляроўваць і ў той жа час высякаць пад корань?! Я трохі ведаю гісторыю, але ніколі і нідзе столькі не лілі крыві, слёз і пры гэтым так не абалванілі, не застрашылі народ, каб не кляў, не ішоў супраць, а маліўся, абагаўляў крывапіўцаў...

— Мне тым больш не разабрацца: ці тут, як кажуць, нейкая хіжая сусветная змова, ці нечы прыкры характар і памылкі, ці віной і залішняя падатлівасць нашага народа... — спажыўшы паўзу, сказаў я. — Выбачайце, дзядзька Ян. Вы казалі пра нейкага Чорнага чалавека. Хто ён?

Чыгір, узбуджаны, нават трошкі хваравіта пачырванелы ад успамінаў і свайго расказу, зноў раптоўна абмяк, а ягоныя рукі дробна затрымцелі.

— Ёсць дзевяцігаловыя, ёсць шасці- і трохгаловыя Цуды-юды, а ёсць і аднагаловыя, такія, як і ўсе людзі, — прамовіў праз нейкі час Чыгір. — Гэтыя, апошнія, заўсёды побач. Бывае, яны ці ён — над душой кожнага чалавека... Мой Чорны чалавек — мой зямляк, з адной вёскі. Калі я вярнуўся з Саратава, ён зайздросціў, што я па-гарадскому апрануты, па-гарадскому размаўляю. Пасля бралі яго завідкі, што я хутка засвоіў як след беларускую мову, стаў ледзь не вясковым дырэктарам, пасябраваў з камсамольцамі, і яны лічылі мяне за добрага сябра. Я гэтага не бачыў. Я памог яму падвучыцца, паступіць на рабфак, а пазней — і ва універсітэт. Ён, лічы, на крок не адыходзіў ад мяне, ліпнуў, як аса да варэння, бялеў, чарнеў ад таго, што ўдаецца мне і што не па сіле яму, а я ўсё верыў яму, гаварыў з ім пра самае патаемнае. Расказваў яму і пра Надзю. Ды ён і сам бачыў, як у нас усё ішло добра. Паказваў: рады, што мы пажаніліся, што мяне пакінулі ў аспірантуры. Адным словам, тады я лічыў яго самым лепшым сваім сябрам... Толькі стаў відушчы, з жахам зразумеў усё на следстве, калі выпадкова агледзеў напісаныя ягонаю рукою ананімкі на мяне... Якраз ён падаў ідэю, што я, шануючы наш фальклор, ідэалізую царызм і не прымаю Савецкую ўладу... Калі я паехаў мерзнуць і рэзаць лес, яго кар'ера пайшла ўгору. Спачатку ён трапіў выкладчыкам у вайсковую школу, пасля — у органы... І, можа, самае страшнае для мяне — звёў, забраў Надзю... Паходжваў, прасіў адмовіцца ад мяне, «ворага народа», кленчыў, поўзаў перад ёю, а калі не змог дабіцца свайго ласкаю, запалохаў. Яна адраклася ад мяне, выйшла за яго і дала нашаму сыну ягонае прозвішча. Праўда, у сорак шостым, калі нас выпусцілі, і я працаваў настаўнікам у Пухавіцкім раёне, яна прыязджала да мяне, расказвала пра ўсё, плакала, прасіла, каб я дараваў, узяў яе з маім і з другім, ужо ад Чорнага чалавека, сынам, але... Канечне, каб яна прыехала з дзецьмі, каб я ўбачыў свайго сыночка, я пакінуў бы яе, перагарэў бы і жыў. А так я зацяўся, не перамог сваёй крыўды. А 15 лістапада сорак восьмага мяне зноў павезлі з Беларусі на канец свету. Віны за вамі няма, міралюбна сказаў мне раённы ўпаўнаважаны, але ёсць загад таварыша Берыі выслаць усіх былых палітычна асуджаных... Выслаць — і ўсё! У каго сіла, у таго і права! Вярнуўся я з Усурыйскага краю ў пяцьдзесят восьмым — пажылым, хворым, адзінокім і, галоўнае, адбітым ад любімай справы, нікому не патрэбным чалавекам...

— А Чорны чалавек?

— У тым жа пяцьдзесят восьмым органы ад яго адкараскаліся, выпусцілі ў званні падпалкоўніка. Ён уладкаваўся ў аддзеле кадраў аднаго нашага акадэмічнага навукова-даследчага інстытута (дарэчы, вось так прыгрэліся многія, на кім нашы слёзы і кроў). Чорны чалавек, канечне, не мог не агледзець: я спрабую знайсці сваю дысертацыю і хачу ўладкавацца ў новы інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Пятро Глебка, дырэктар, трошкі помніў мяне па трыццатых гадах, згадзіўся ўзяць на працу, але... Чорны чалавек не толькі не павініўся, не паспачуваў, а

(Працяг на стар. 10—12).

10 красавіка адкрываецца фестываль «Мінская вясна»

Скарына і... трансавангард?

З мастацкім кіраўніком Беларускай дзяржаўнай філармоніі Ю. ГІЛЬДЗЮКОМ гутарыць наш карэспандэнт

— Знайсці што-небудзь стабільнае ў сённяшнім жыцці няпроста. Таму і прыемна, што музыка ўсё яшчэ застаецца своеасаблівай выспай вечных чалавечых скарбаў—сярод здрадлівых хваляў будзённасці. Нават дзіўна, што, насуперак усім ускладненням жыцця, з нашых афіш не знікае фестываль «Мінская вясна». Тым больш, што яе папярэдніца «Беларуская музычная восень» абярнулася для філармоніі цяжкай «бітвай за ўраджай». Гасразлік, Юрый Мікалаевіч, прыйшоў і да вас...

— «Гасразлік»—для мастацтва гэта гучыць сапраўды цяжка. У нашай галіне распачаліся пошукі варыянтаў вядзення канцэртнай справы, нараджаюцца шматлікія эксперыменты, у тым ліку і гасразліковыя мадэлі. Гэта называецца «новыя ўмовы гаспадарання».

— Мастацтва—і гаспадаранне...

— Страшнае, я лічу, спалучэнне! Тым не менш, адбылася знамянальная для нас падзея: ад філармоніі аддзялілася эстрада. Мы цэнім яе творчыя набыткі, удзячныя за тое, што многія гады яна «зарабляла грошы» і на развіццё філарманічных жанраў. Але мы не павінны залежаць адно ад аднаго, і нельга масавую культуру змешваць з Культурай увогуле, прынамсі, з музычнай.

— Цяпер філармонія будзе, нарэшце, сама сабою, але ў гэтых «новых умовах гаспадарання» вам давядзецца ой як дбаць пра ўзровень кожнага канцэрта.

— Вось «Мінская вясна» і пакажа якасць нашай работы, бо паводле сваёй прыроды гэта фестываль менавіта філарманічнага мастацтва. Свае мэты ён захоўвае: гэта абнаўленне сучаснай музычнай культуры, гэта паказ новых калектываў, новых праграм, новых твораў, у тым ліку беларускіх кампазітараў. Увогуле, нашы выканаўцы іграюць беларускай музыкі нямала, Саюзу кампазітараў крыўдаваць не выпадае. Вядома, хацелася б, каб яе гучала больш, але большага хацелася б і нам ад саюза. Каб якасны ўзровень музыкі быў большы. Каб у гэтых умовах штучнага гасразліку ўсё ж такі да слухача даходзілі самыя лепшыя творы, строга адабраныя ў саюзе.

Сёлета мы імкнуліся скласці канцэрты цікавыя, нават у нечым інтрыгуючыя. Хочацца паказаць лепшае, што звязана з абнаўленнем у музыцы, таму «Мінская вясна» гэта ў пэўнай ступені супярэчнасць з традыцыямі. І не толькі з горшымі. Бо шукаць новае—гэта значыць не азірацца назад, не вяртацца да таго, што ўжо было летась. Мінула ўжо шэсць «вёснаў», і ўсе яны былі розныя, але ўсе яны былі скіраваныя на тое, каб выклікаць цікавасць у слухача.

— Юрый Мікалаевіч, сёлетняя «вясна» праходзіць у год юбілею Скарыны. Я ведаю, што вы не мелі на мэце зрабіць фестываль строга тэматычным: нельга ж фарсіраваць творчы працэс, заклікаючы мастакоў падладжваць сваю працу пад пэўную дату, нават калі гэта дарагое для ўсіх скарынаўскае свята. І ўсё ж тэма, ці, дакладней, дух Скарыны прысутнічае ў фестывальных праграмах—можна сказаць, нефармальна...

— Многія кампазітары, адгукнуўшыся на творчы конкурс, прысвечаны 500-годдзю Францішка Скарыны, распачалі шэраг праграмных работ. Мы чакаем новую сімфонію У. Дарохіна, прысвечаную нашаму выдатнаму земляку; ужо завершаны і з часам абавязкова будзе выкананы харавы твор Я. Паплаўскага «Lux aeternum» гэтаксама і сімфонія С. Бельцюкова «Гравюры Скарыны»... На жаль, так склалася, што выканаўцы па розных прычынах не змогуць прадставіць гэтыя прэм'еры пад час фестывалю. Творчы працэс і сапраўды нельга падпарадкоўваць калядарным датам. На сённяшні дзень цалкам падрыхтаваная прэм'ера «Іканастасу» Л. Шлег—араторыі для сімфанічнага аркестра, чытальніка, аргана, хору хлопчыкаў і змешанага хору. Гэты твор, прысвечаны Скарыне, і прагучыць на фестывалі.

Кульмінацыйным, на мой погляд, будзе канцэрт 17 красавіка. Малады калектыў—Мінскі камерны хор пад кіраўніцтвам І. Мацюхова, саліст В. Скорабагатаў з вялікім энтузіязмам і самааддачай рыхтуюць прэм'еру «Курантаў». Гэта помнік славянскага пісьменства, датаваны 1733 годам, які трапіў да беларускіх музыкантаў дзякуючы пошукам і даследаванням вядомага нашага вучонага А. Мальдзіса—гэтаксама некалі ўвайшоў у наш культурны ўжытак зборнік п'ес, названы «Полацкім сшыткам».

— Ці можна зараз больш грунтоўна прадставіць «Куранты» нашым чытачам?

— Не бяруся распавядаць падрабязна—няхай чытачы прыходзяць на канцэрт і там знаходзяць разгадку адроджанага помніка. Магу толькі сказаць, што ў падрыхтоўцы анатацыйнага матэрыялу нам дапамог Адам Іосіфавіч Мальдзіс, а сучасную музычную акаймоўку твора прапанаваў малады беларускі кампазітар В. Капыцько.

— Значыць, у рукапісе не было нават і намёку на нейкі музычны інструментарый?

— Так! У рукапісе толькі адзін нотны радок—для голасу. «Куранты»—гэта нізка старадаўніх кантаў, новым жыццём якіх зрабілася сучасная партытура: саліст, хор, 12 аркестравых інструментаў... Думаю, прэм'ера твора на «Мінскай вясне» (а праз нейкі час—на музычным фестывалі ў Полацку) дасць падставу пагаварыць пра пераемнасць традыцый у музыцы на беларускай зямлі, наладзіць навуковыя спрэчкі як вакол самога помніка, так і вакол вынікаў яго «рэстаўрацыі»...

— Юрый Мікалаевіч, я думаю, «Куранты» лішні раз пацвердзяць, што музыка—непарушны мастак, які злучае вельмі далёкія эпохі. І каб падкрэсліць перазовы і повязі розных часоў, вы намераваецеся ў дзень канцэрта разгарнуць у фае філармоніі яшчэ і выстаўку, так?

— Ад вас не схаваеш ніякіх сакрэтаў! Мы сапраўды звярнуліся ў Дзяржаўны мастацкі музей БССР... Але няхай сюрпрызы будуць на канцэрце.

— Тады прадоўжыце, калі ласка, пра музычныя прэм'еры.

— Ідэі гуманізму, духоўнага адраджэння, прасвятлення і яднання людзей натхняюць кампазітараў XX стагоддзя, кампазітараў самых розных, і «элітарных», і «традыцыйных». І гэта прылучае іхнюю творчасць у самым шырокім сэнсе да скарынаўскай тэмы. Магутная постаць беларускага асветніка, якая ўвабрала ў сябе цэлую эпоху, а мо і не адну, цэлы свет, паўстае такою сучаснай! Наш сённяшні дзень дазваляе збліжаць, звязваць, злучаць бясконца далёкія адно ад аднаго часавыя адрэзкі—дзякуючы музыцы, прадстаўленай на фестывалі.

Вось, напрыклад, 10 красавіка, у першым канцэрце, прагучыць новая сімфанічная паэма Г. Вагнера «Чытаючы Васіля Быкава». Дырыжыруе даўні сябра нашага аркестра В. Катаеў. Упершыню ў Мінску будзе выканана Трэцяя сімфонія А. Шнітке. Праграму другога сімфанічнага вечара рыхтуе галоўны дырыжор аркестра Ю. Яфімаў, які, дарэчы, выступіць ужо ў рангу народнага артыста БССР. Прагучаць араторыя «Іканастас» Л. Шлег, новыя творы нашага госця Э. Дзянісава—«Званы ў тумане» і інструментоўка «Детской» М. Мусаргскага, а таксама музыка чэшскага кампазітара І. Лабурды, зноў жа, новая для мінскіх слухачоў. Чакаем прыезду А. Эшпая, чый Канцэрт для габоя прадстаўляе малады, але ўжо добра вядомы беларускі музыкант Ю. Лікін.

Дзяржаўны камерны аркестр БССР выканае творы маладых беларускіх аўтараў А. Бандарэнкі (Канцэрт-трыо для фартэпіяна, скрыпкі і віяланчэлі) і С. Бельцюкова (Канцэрт для габоя).

— «ЛіМ», дарэчы, ужо досыць падрабязна знаёміў чытачоў з творчасцю А. Бандарэнкі—аднаго з найбольш цікавых і дапытлівых кампазітараў.

— І ў тым, што ён мае адметныя набыткі ў розных жанрах, слухачы змогуць пераканацца, калі наведаюць аўтарскі канцэрт «Радзіма бацькоў». Так будзе называцца вечар беларускай музыкі і паэзіі, прысвечаны Скарыне, у праграме якога, побач з творамі А. Бандарэнкі,—і творы І. Лучанка. Вось такую незвычайную форму канцэрта мы знайшлі: кампазітар, імя якога ведаюць паўсюль, нібы прадстаўляе свайго малодшага калегу, таварыша па творчым саюзе. Дарэчы, сам Ігар Міхайлавіч будзе прадстаўлены як аўтар камернай музыкі. Сярод іншага прагучыць прэм'ера ягонага хору «Курапаты».

Аналагічна пабудаваны і аўтарскі канцэрт пад назваю «Сучасны музычны эксперымент»: кампазітар В. Капыцько, які ажыццявіў транскрыпцыю «Курантаў», сустрэнецца з маскоўскім калегам У. Рабавым. Іх музыку прадставяць вядомы тэнар з Масквы С. Якавенка, струннае трыо нашай філармо-

— «ЛіМ», дарэчы, ужо досыць падрабязна знаёміў чытачоў з творчасцю А. Бандарэнкі—аднаго з найбольш цікавых і дапытлівых кампазітараў.

— І ў тым, што ён мае адметныя набыткі ў розных жанрах, слухачы змогуць пераканацца, калі наведаюць аўтарскі канцэрт «Радзіма бацькоў». Так будзе называцца вечар беларускай музыкі і паэзіі, прысвечаны Скарыне, у праграме якога, побач з творамі А. Бандарэнкі,—і творы І. Лучанка. Вось такую незвычайную форму канцэрта мы знайшлі: кампазітар, імя якога ведаюць паўсюль, нібы прадстаўляе свайго малодшага калегу, таварыша па творчым саюзе. Дарэчы, сам Ігар Міхайлавіч будзе прадстаўлены як аўтар камернай музыкі. Сярод іншага прагучыць прэм'ера ягонага хору «Курапаты».

Аналагічна пабудаваны і аўтарскі канцэрт пад назваю «Сучасны музычны эксперымент»: кампазітар В. Капыцько, які ажыццявіў транскрыпцыю «Курантаў», сустрэнецца з маскоўскім калегам У. Рабавым. Іх музыку прадставяць вядомы тэнар з Масквы С. Якавенка, струннае трыо нашай філармо-

ЧЫГІР

(Пачатак на стар. 8—9).

стаў на дарозе. Куды я потым ні патыкаўся — праз пэўны час усюды мне адмаўлялі з самымі рознымі адгаворкамі. У рэшце рэшт мне ўдалося ўладкавацца ў бібліятэку. Плата там, самі ведаеце, маленькая, але я не зважаў на гэта. Абы быць бліжэй да кнігі.

— І другі раз, у адлігу, вам зламаў лёс Чорны чалавек?

— Праз гады два-тры я асвойтаўся і напісаў новую дысертацыю, паспрабаваў абараніцца. Работа мая трапіла да майго былога знаёмага па універсітэце, а цяпер акадэміка-мовазнаўца. І ён зарэзаў яе ўшчэнт. За «нацыяналістычны ўхіл», за «прапаганду лютых савецкіх ворагаў» і, як кажуць, і гэтак далей. Я зразумеў: развітвайся, Яне, з навукай. Нікому ты не трэба са сваімі думкамі, ведамі, цяпер трэба тое, што і як пішуць многія ўгоднікі, калечачы нашу мову. Вось тады я падумаў пра самагубства. І, мусіць, засіліўся б, каб на маім шляху не сустрэлася Галя. Яна, маладзейшая за мяне на гадоў дваццаць, удава, сэрцам, душой адчула, што мне цяжка. Спачатку спачувала, грэла словам... Карацей, мы пажаніліся, і я памог паставіць на ногі яе хлопца, сам утрымаўся каля яе. Малаадукаваная, але вельмі сардэчная і культурная была кабета, я яе вельмі палюбіў у пажылыя ўжо гады... Я не пайшоў ні апраўдвацца, ні сварыцца з акадэмікам. Але аднаго разу мы выпадкова сустрэліся. Я хацеў абысці, ды ён затрымаў. «Дысертацыя твая выдатная, — кажа мне, — на галавы дзве, а то і тры вышэй за тыя, што абараняюцца, але... Ну, чаго ты прычапіўся да гэтых Тарашкевіча, Ластоўскага, Лёсіка? Я ведаю: яны былі высокаадукаваныя і культурныя людзі, незаслужана зганьбаваныя, загубленыя, іхнія працы, погляды не страцілі цаны і цяпер, але... Па-першае, яны не рэабілітаваныя. Толькі ўспомні іх—адразу дадуць у зубы. Вось і я табе даў. А па-другое, зразумей: я вось акадэмік, афіцыйны мовавед, перада мной здымае капелюшы ўвесь наш корпус мовазнаўцаў, я атрымліваю звыш тысячы рублёў у месяц, маю дачу, езджу на «Волзе», п'ю каньяк, заядаю ікрой, дык што — я дазволю іх рэабілітаваць, уславіць, а сябе зацьміць? Ніколі!»

Я разгубіўся. Ну, мог такое сам думаць пра лжэ-вучонага, чыноўніка, але каб вось так той нахабнічаў! Дзікая злосць успыхнула ўва мне, але я стрымаўся: хіба зменіш што, калі трэснеш яму па сытым рыле?!

«І ўвогуле песенька нашай мовы спета, — ухмыльнуўся ён. — Чуў: цяпер у сіле тэорыя зліцця моў?! Так што трэба не адставаць...»

«Сволач!» — сказаў я і пайшоў прэч ад гэтага мова-еда.

Нейкі час я пстрыкаўся: напісаў колькі артыкулаў, рэцэнзій. Калі ж рэдактары іх бязлітасна крэмзалі, змушалі выкрэсліваць адны і ўпісваць другія імёны, цытаваць таго акадэміка, я не дазволіў нічога друкаваць. Не скажу, што мудра рабіў, але палічыў: лепш маўчаць, чым подлічаць... Калі ў нас тут першым стаў Мазураў і захапіўся «зліваць мовы», я паслаў яму ліст. Мовы, пісаў я, не так проста зліць, а вось людскія розумы, душы — лягчэй. Але падумайце добра, які чалавек будзе без свайго розуму, без сваёй душы. Можа, з яго выйдзе паслухмяная рабсіла, але ў рэшце рэшт яна, сляпая, калі не ўсё запар, то вельмі шмат змарнуе, не будзе дбаць пра будучыню. Калі мы думаем пра будучыню, пра нашых дзяцей і ўнукаў, калі мы клапоцімся пра нашу зямлю і паветра, дык давайце не вытоптваць душы, выхоўваць патрыёта. А тое, што нашы людзі могуць быць не такімі, відаць ужо і цяпер: паглядзіце, колькі ў нас бязлітасна высякаецца лясоў, колькі спрамляецца жывых рэчак, колькі будуецца шкодных заводаў, колькі людзей жыве толькі адным днём, абы сёння быў кавал сала, колькі адракаецца ад роднай мовы, траціць інтарэс да кнігі — адным словам, мы на вачах трацім наш народ... Калі не задумвацца, угоджваць камусьці, то ўсё гэта можа здацца не страшным, нават больш—удачай. Мы першыя крочым у светлую будучыню! Не, мы першыя ідзём да сваёй вялікай бяды! Рана-позна дорага заплацім за цяперашнюю сваю дурноту! Пад канец я прасіў рэабілітаваць тых, хто гонар нашага народа, але хто па-ранейшаму зганьбаваны.

Адказу мне не было. Я не спыніўся. Напісаў вялікі ліст нашаму земляку, які займаў вялікую пасаду ў Маскве. Якраз у гэты час, як на ліха, дырэктарам нашай бібліятэкі назначылі яго, Чорнага чалавека. З акадэміі яго выкурылі за хабар. І ўжо ён на сходзе, набіраючы «палітычны капітал», зачытваў той мой ліст у Маскву, застрашыў усіх і змусіў прызнаць яго «варожым, нацыяналістычным», а заадно перадаў яго ў органы... Мяне запрасілі туды. Малады ветлівы, але халодны таварыш пагаварыў са мной, параіў «не замінаць партыі праводзіць эксперымент», памаўчаць. Я, утрапёны, сам ішоў насустрач сваёй бядзе: напісаў ліст самому Брэжневу... Копія ліста зноў прыйшла ў бібліятэку... На гэты раз і старыя супрацоўнікі, што ўцалелі, і новыя, якіх сам набраў Чорны чалавек, не толькі асудзілі мяне, але рашылі вызваліць з работы, а маю справу перадаць у суд... Карацей, я зноў паехаў у казённым вагоне на казённых харчах у далёкі край, дзе адбыў тры гады... Само па сабе зразумела, новая мая дысертацыя, усе іншыя паперы зніклі... Галя не толькі чакала мяне, але за гэты час узбілася на дачу... І ведаеце: лёс, не, нейкі злы рок ці фаталізм проста дабівае мяне! Старшынёй таго садова-агародніцкага таварыства стаў Чорны чалавек! Я нікуды не магу ад яго ўцячы! Баюся: памру 15 чысла нейкага месяца і яго неўзабаве побач пакладуць, калі не выдзеляць яму нейкага іншага, больш ганаровага, месца...

ЧЫГІР урэшце згадзіўся, каб я схадзіў туды, куды трэба, пагаварыў па яго справе, напісаў у газету пра ягоны лёс, але назваць прозвішча таго Чорнага чалавека адмовіўся. Але ведаючы, дзе яны разам вучыліся, працавалі, дзе маюць непадалёку садовыя ўчасткі, я даволі хутка выявіў: Чорны чалавек — Арцём Аляксандравіч Сыч. Увазнаўшы гэта, адразу ж уведаў і патрэбны адрас.

Аднаго дня я і пашыбаваў да гэтага Сыча. На мой званок амаль адразу адчыніліся абабітыя чорным дэрмацінам дзверы, але не шырока — толькі на кароценькі ланцужок.

— Кто там? — строга запытаў нябачны мужчына.

Я назваўся і назваў газету, дзе працую.

— Что вам надо?

— Пагаварыць з вамі.

— Пра што?

— Пра жыццё-быццё, пра ветэранаў...

— Вашы дакументы.

Я тут жа пасунуў пальцы ў верхнюю кішэньку пінжака, але, як на тое, газетнага пасведчання там не было. Забыў дома, у іншым пінжаку.

— Як — няма з сабой дакумента?! Ну і дысцыпліна ў вас, пісак!

Адчытаў як хлапчука і ляпнуў дзвярыма.

Я мусіў пайсці ні з чым. Спачатку, прадчуваючы нялёгкую гаману, думаў махнуць рукой на таго тыпа, схадзіць туды, дзе цяпер могуць рашыць больш, але ўсё ж хацелася зірнуць на яго, не мі-

ніі, цымбалістка А. Ткачова...

— Яна вярнулася на радзіму?

— Не, яна проста прыедзе з Грэцыі, дзе цяпер жыве, да нас на фестываль, будзе іграць. Бліскучая артыстка заслужыла прызнанне ў нашай рэспубліцы. Мае адбыцца цікавая сустрэча.

— І ніякіх праблем?

— Ніякіх праблем! І добра, што няма праблем. Добра, што яна іграе ў гэтым канцэрце, які павінен падарыць сапраўды свежыя, вясновыя ўражанні. Наогул, камерныя канцэрты фестывалю вылучаюцца асабліва разнастайнай палітрай. Звяртаю на гэта ўвагу таму, што менавіта ў камерных жанрах, найбольш суб'ектыўнай, інтымнай форме кампазітарскага выказвання, знаходзіцца больш тонкіх выразных сродкаў, чым, бывае, у вялізных сімфанічных палотнах.

— Увогуле, камерная музыка —своеасаблівы індыкатар стану культуры музычнай, творчай, прафесійнай...

— ...і менавіта сённяшняй! Звярніце ўвагу: сярод камерных вечароў — міжнародная трансавангардная праграма «Музыка падсвядомасці».

— Нагадвае «авіякампанію» ці «авіяканцэрн»...

— Гэта сапраўды нагадвае і «авіякампанію», і немаведама што яшчэ, а тым не менш я спрабаваў дакапацца да сэнсу такой назвы. Кіраўнік вакальнага ансамбля «Камерата» А. Шыкуноў, калектыву ўжо досыць вядомага, патлумачыў, прыкладна, гэтак. Міжнародная—таму што ў праграме поруч з «Камератай» удзельнічае шведскі паэт Э. Лапалайнен, які чытае паэзію абсурду, або паэзію фанем, заснаваную на гуках сённяшняга дня. Трансавангардная—таму што наш малады ансамбль «Класік-Авангард», пра які не так даўно пісаў «ЛіМ», прадстаўляе ў гэтай праграме музыку савецкага авангарду 20—30-х гадоў —Арцёмава, Дзешавова, кампазітараў, якія ніколі раней не гучалі, якія былі забаронены пры Сталіне, імёны якіх упершыню адкрыліся слухачам толькі летась на «Маскоўскай восені». А «Камерата» спявае суперсучасную праграму... Моладзь любіць даваць сваім праграмам кідкія, забаўлівыя назвы. Не будзем пярэчыць, лепш сходзім, паслухаем, ацэнім рэжысёрскія прыдумкі, а тады, можа, і паспрачаемся.

У камерных праграмах—і паказ творчасці маладых беларускіх кампазітараў. Гэта і тыя, хто ўжо сёння даганяе сталае пакаленне, і тыя, хто зусім нядаўна быў студэнтам: Г. Гарэлава, В. Кузняцоў, Ю. Андрэева, Д. Яўтуховіч, М. Марозава, А. Шушкевіч... Пералік досыць доўгі. У адрозненне ад кампазітарскіх пленумаў ды з'ездаў, канцэртныя праграмы якіх даюць пераважна рэтраспектыўны паказ творчасці сталых членаў саюза, мы арыентуемся на перспектыву. А перспектыва—гэта музыка маладзейшых, якой мы даём «зялёную вуліцу».

— На тое і вясна... І яшчэ асаблівасць фестывалю—удзел гасцей. Некаторых вы, Юрый Мікалаевіч, ужо называлі. А яшчэ?

— Яшчэ—цудоўны квінтэт Літоўскай нацыянальнай філармоніі, які ўзначальвае дырэктар і мастацкі кіраўнік ЛНФ Г. Кевішас, піяніст, мой калега. У праграме музыка француза А. Месіяна і літоўца В. Бяруціса. Чакаем квартэт з ФРГ, які пазнаёміць з творамі сучасных заходнегерманскіх кампазітараў.

Зразумела, нягледзячы на ўдзел гасцей, нам трэба разлічваць перш за ўсё на свае выканаўчыя сілы. Так што фестываль вымагае вялікага энтузіязму выканаўцаў, асабліва калі ў праграмах пераважае сучасная ды зусім новая музыка, якую трэба разабраць, вывучыць, шліфаваць і асэнсоўваць. Мне прыемна назваць зараз імёны такіх першапраходцаў-энтузіястаў: спявак В. Скорабагатаў, габаіст Ю. Лікін, кларнетыст Г. Забара, скрыпачы Ю. і М. Гершовічы, піяністы А. Крымер, І. Шуміліна, І. Алоўнікаў. Гэта і музыканты ансамбля «Класік-Авангард», духавога квінтэта, брасквінтэта, струннага квартэта філармоніі і многія іншыя. Пераважна моладзь.

— Дзякуй, Юрый Мікалаевіч, за размову. Няхай дапаможа яна папулярызацыі «Мінскай вясны» сярод нашых чытачоў.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

РАСКУТАСЦЬ І ДАЛІКАТНАСЦЬ

Нататкі з выставак фотамайстроў Амерыкі і Беларусі

А. ДУДКІН. Партрэт.

«Маладыя фотамастакі Амерыкі»... Пэўна, гэтая абвестка прывабіла б шмат каго, каб з'явілася, скажам, на праспекце Машэрава ці ля Траецкага прадмесця — яны, здаецца, самім гарадскім жыццём прызначаны для знаёмства з мастацкімі падзеямі. Выстаўку ж, якая праходзіла ў танцзале «Вільнюс», на жаль, пабачыла няшмат наведвальнікаў. І хтосьці з іх, напэўна, быў расчараваны, бо ўяўлення пра краіну Амерыку па тым, што было прадстаўлена ў «Вільнюсе», ніяк не складзі. Ярнія рэкламныя работы адсутнічалі цалкам. Тым не менш, выстаўка прываблівала.

Лірычныя краявіды Тэры Таўэдтэмеера «Лес да выбуху», «Сухі вадаспад», напрыклад, уражвалі гледача сваёй някідкасцю. Работы Рондала Макіні (серыя краявідаў) выклікалі роздум нязвычнасцю: парасткі, што нагадваюць след ад гіганцкай ракеты, старая ржавая машына, чалавечкі, выразаныя на камені, змяя на фоне хуткаснай аўтатрасы...

Атамная электрастанцыя, знятая Маркам Клетам, — само ўвасабленне парадку, спраўнасці і дагледжанасці — дрэўцы, воблака пары. Аднак у прасторы прыхавана ці то папярэджанне, ці то неспакой— каму-каму, а нам не трэба тлумачыць, які менавіта.

Серыя замалёвак з натуры Джыма Ламасона ўяўляе сабою каляровыя, хіба не цацачныя ўвасабленні наваколля: стара-свецкае аўто на фоне гладкай сцяны, крама садавіны з рэкламнымі кардоннымі бананамі, някідкі дамок з гафрыраванага жалеза — «Аўтасервіс Біла»...

Мяне асабіста ўразілі фотапартрэты Роя Колфа (сталага веку пара, бізнесмен, дзяўчо з маці). Гэтак зняць, магчыма, мог бы і савецкі майстар у Маскве ці Гродне: своеасаблівая эстэтызаваная рэальнасць няпростага нашага жыцця. Жыццё, нібы заўважае мастак, увогуле няпростая справа.

Выстаўка амерыканцаў запомнілася сваёю чалавечнасцю, адметнасцю аўтарскіх асоб, свабодаю асацыяцый, раскутасцю зносін з гледачом і разам з тым — далікатнасцю. Той далікатнасцю, што мяжуе са стрыманасцю. І, паўтаруся, сваёю «нерэкламнасцю» амерыканскага ладу жыцця разам з ненавязлівым позіркам на гэты лад.

Тое ж можна сказаць і пра выстаўку мінскага фотамастака Анатоля Дудкіна. Свядома не стану пералічваць ягоныя дасягненні, поспехі і ўзнагароды — яны бясспрэчныя. І няхай нікога не падмануць гады, у якія ён заявіў аб сабе. Сваё стаўленне да іх ён з далікатнаю ўсмешкаю выказаў у рабоце «Зорны кароль» у партрэце сумнавядомага «абзорнага» генсека, які прышпілены да старых пашчапаных дзвярэй гаража якраз пад надпісам па-англійску «Зорны кароль»...

Але гэта між іншым. Настрой, тон выстаўкі задаюць і падтрымліваюць краявіды, выявы, так бы мовіць, станаў роднае прыроды: серыі «Балота», «Рака Нача», «Рака Бобр», «Мядзельскі край». Дакладнасць, простатакі японская вытанчанасць краявіду «Люты», напрыклад, паяднана з тыпова беларускай няпэўнасцю: прыроды, калі не ведаеш, што сыплецца з неба, дождж, снег ці проста імжыць; настрою, калі радасць даводзіцца да слёз, а гора і скруха схіляюць да дзеяннаў.

Серыя «Зямля і людзі», распачатая майстрам у 1975 годзе, — гэта шэраг канкрэтных людскіх абліччаў, якія не прэтэндуюць на абавязковае пераўтварэнне ў вобразы. Людзі, якіх здымаў Дудкін, не пазіруюць, але і не хаваюцца ад вока фотаапарата. Чалавечы гумар на здымках супадае з настроем прыроды: людзі гэтыя блізкія да зямлі, здаецца, ціхамірныя, сціплыя, значныя ўжо адным сваім прызначэннем карміцеляў, унутрана спакойныя, крыху запаволеныя. Ды нейкую таемную прысутнасць лёсу-выраку ўгледзела я на гэтых здымках. Серыя скончана ў 1988 годзе, і можна зрабіць асцярожную здагадку: ці не прадчуванне бяды (атамнай, нітратнай, меліярацыйнай і нават сацыяльнай) кінула на гэтыя твары і постаці адбітак нетутэйшага, незямнога святла?..

Асаблівай гаворкі заслугоўваюць дудкінскія «ню», пазначаныя назваю «Акты». Агаленым жанчынам, здалося мне спачатку, неабавязкова прысутнічаць на гэтай выстаўцы (а прысутнічаюць яны, паверце, не з-за кан'юнктурных меркаванняў): навучыўшыся маляваць агаленую натуру дзеля вывучэння чалавечага цела, зусім неабавязкова штораз назаляць гэтым уменнем акалючых. Але ў Дудкіна нічога выпадковага на выстаўцы няма. Я не ўгледзела ў выявах агаленых пачцівага ні какетлівай рэкламнай «сарамлівасці», ні так званага «эратычнага заклiку» (які, дарэчы, пераходзіў у віскат на выявах нядаўняе выстаўкі «Міс фота СССР»). Жанчыны Дудкіна суіснуюць з прыродаю альбо складаюць яе гарманічную частку.

Выстаўка «Маладыя фотамастакі Амерыкі» паехала з танцзалы «Вільнюс» у горад Вільнюс, выстаўка ж Анатоля Дудкіна яшчэ некаторы час будзе сустракаць гледачоў. Застаецца дадаць, што ладзіў іх утвораны нядаўна Саюз фотамастакоў Беларусі і творчая асацыяцыя «Правінцыя». Здымкі яе членаў (У. Парфянка, Л. Ільіна, Г. Слабодскага і іншых) бываюць і на старонках «ЛіМа».

Антаніна ЗАБЛОЦКАЯ.

фічнага, а жывога сталінца, хто доўга правіў баль і цяпер «на варце святынь».

Карацей, гаспадар чорных дэрмацінавых дзвярэй зноў запатрабаваў дакумент і, калі я падаў яго ў шчыліну, узяў, доўга разглядаў, а пасля прабубніў сам сабе:

— «Орган ЦК КПБ».

Адкінуў зашчапку, упусціў.

Дагэтуль я чакаў: перада мной будзе ці бамбіза з бандыцкім выразам твару, ці, наадварот, ліслівы шпанючок. Зірнеш у вочы такому, а там сядзіць хтосьці іншы — хітры, жорсткі, бязлітасны. Я не раз ужо налятаў як на першых, так і на другіх, і трэба сказаць: другія, малыя ростам, кусалі больш, як трутні.

Не. Гаспадар быў трохі вышэйшы за мяне, чалавека сярэдняга росту, хударлявы і, як кажуць, не зусім выразны. На ім не было арыстакратычнай белізны, выпешчанасці, што звычайна бывае ў ягоных калег — дзяцей высокапастаўленых бацькоў, але не бачылася і яўных прыродных сялянскіх рыс, што кладуць след на твар ад ветру, сонца, марозаў і цяжкай працы. Як я сабе ўявіў: чалавек, абгладжаны горадам. Што да характару, то на першы позірк здалося мне: супярэчлівы.

На Сычу былі скураныя тапачкі, насок правага быў падрапаны (па сабе ведаю: гэтым тапачкам падымаў ніжнюю зашчапку на балконных дзвярах), паношанае, бліскучае на локцях, але шыкоўнае спартыўнае трыко з белымі лампасамі на штанах, на шчоках — роўны чырванец, на галаве — сівы вожык, а ў шэрых, ужо выцвілых вачах — чэпкі, калючы позірк. Чыгір перад ім, равеснік, на выгляд нашмат старэйшы і слабейшы.

— Праходзьце, — міралюбна сказаў гаспадар і неўзабаве першы стройна па-вайсковаму пайшоў па доўгім цемнаватым калідоры з высознай столлю, са старамоднай лепкай калідора, і павярнуў направа — у прасторны пакой, дзе каля балконных агромністых дзвярэй стаяў каляровы тэлевізар, злева высіліся кніжныя шафы з аднымі зборамі твораў, з партрэтамі вядомых вучоных, рускіх пісьменнікаў. На адной з паліц кінуўся ў вочы партрэт Сталіна — той быў у вайсковым мундзіры і з зоркай, нібы зычліва ўсміхаўся, хоць туманна і пагрозна прыплюшчваў тыгрыныя вочы. Справа стаялі пісьмовы стол, завалены педагагічнымі часопісамі, газетамі, і канапа.

— Я слухаю вас,—быццам не дома, а ў важным кабінеце сказаў Сыч, сеў на крэсла пры стале, а мне паказаў месца насупраць, на канапе, над якой вісеў шыкоўны дыван. Яшчэ болей дарагі дыван ляжаў на паркетнай падлозе.

— Я прыйшоў да вас як да чалавека, які нямала пражыў на свеце і шмат чаго пабачыў... — сказаў я, адчуваючы, што святло з балкона не толькі асвятляе, але б'е мне ў вочы, а вось гаспадароў твар у цяні. — Што вы, да слова, думаеце пра цяперашнія перамены?

— Спачатку ў мяне да вас два пытанні, малады чалавек. Першае: вы нейкім чынам ведаеце, дзе і кім я працаваў? Другое: вы прыйшлі сюды самі ці па заданні газеты?

Я адказаў тое, што ведаў.

— Там, —сказаў ён зусім сур'ёзна, хітнуў галавой, — пад пінжаком, маеш мікрафон?

— Не, — прамовіў я і паказаў, што пад штрыфлямі, поламі пінжака.

— Дык што ты хочаш пачуць ад мяне, ветэрана? — рэзка напаў ён, свідруючы цяжкім позіркам. — Пра змены-перамены? Пра якія? Пра тое, што найперш вы, пісакі, разышліся, бурыце ўсё, што мы мацавалі дзесяцігоддзямі? — Узяў са стала «Огонёк», склаў яго і патрос перада мной. — Усё аплявалі: Сталіна, партыю, сацыялізм... А тое, што напісана пра правасуддзе, органы, увогуле ні ў якія вароты не лезе...

Зларадна ўхмыльнуўся:

— Што здзіўлены? Дыфірамбаў ад мяне чакаў? Не, дарагі. Не пачуеш іх ад нас, для каго на першым месцы партыя, Радзіма і... Сталін, які зусім не такі, як вы малюеце, а наш выратавальнік... А цяпер наце: ні мыла, ні шыла, адна балбатня ды разброд, нахабнасць нефармалаў, народнага фронту і здранцвенне ўлады... Вы яшчэ пашкадуеце, ох, як яшчэ пашкадуеце, што так замахнуліся на наша мінулае!..

— Ясна, — сказаў я, не хочучы спрачацца.— Я ўласна, Арцём Аляксандравіч, прыйшоў да вас не дыскутаваць пра былыя святыні ці грахі, пра змены-перамены, як вы кажаце. Я вось пра што. Цяпер, як самі бачыце, аднаўляюць добрае імя многіх зганьбаваных у свой час людзей. Як асабіста вы, Арцём Аляксандравіч, цяпер гледзіцё на лёс вядомага вам Чыгіра? Можа, хопіць ужо цягаць яму цяжкі крыж? Можа, ён выпакутаваў права памерці звычайным нашым чалавекам, а не ліхадзеем?

Сыча нібы ўджалілі — ён уздрыгнуў, наліўся крывёю, адвёў вочы і пастукаў кантамі часопіса па стале.

— Вы адкуль яго ведаеце? — запытаў.

— Як сусед па доме.

У гэты час зазваніў званок. І Сыч, здаецца, радуючыся, што можа адысціся, падаўся да дзвярэй. На гэты раз нібы трошкі згорбіўшыся. Па гомане я зразумеў: зайшлі дзіця і жанчына. Неўзабаве яны былі ўжо тут: поўненькі, нават пухнаты хлапчук гадоў сямі ў школьнай форме і маладая высакаватая прыгожая маладзіца ў чорных модных калготах, шэрай спадніцы і чорным світэры, трымаючы ў руцэ вучнёўскі партфель. За імі ўвайшоў Сыч, патлумачыў дачцэ ці нявестцы:

— Карэспандэнт.

— Хадзем, Толік, у залу, — сказаўшы мне калі не халоднае, то стрыманае «здравствуйте», жанчына абцягнула на сабе світарок, які напінаўся на высокіх грудзях, паправіла чорную шапачку і павяла сына з пакоя.

— Я папрашу: пры дачцэ, а то і ўвогуле прозвішча Чыгіра не называйце... — як нейкую ўмову паставіў мне Сыч і зноў сеў на крэсла. — Прызнайцеся: гэта ён вывеў вас на мяне? — запытаў, зноў узвысіўшы мяне на «вы».

— Ён не назваў нават вашага прозвішча, вас я вылічыў сам...

— Што вы хочаце ад мяне?

— Памажыце рэабілітаваць яго, Арцём Аляксандравіч...

— Вы лічыце: усе, хто тады сядзеў, толькі анёлы?

— Я не гавару пра ўсіх.

— Крымінальнага злачынства за ім няма. Але я не ведаю, як яго рэабілітаваць палітычна. Ён — нацыяналіст!

— Ёсць доказы?

— Ёсць.

— Якія? Даносы? Паклёпы? Урэшце, ён прапаведуе нашу выключнасць, сее варожасць да іншых нацый?

— Ну, цяпер гавораць, адкрыта пішуць больш, чым ён некалі, — памякчэў Сыч. — Але... Цяпер нібы можна, а тады...

— Дык давайце вернем справядлівасць, змыем з нармальнага чалавека паганае кляймо!

— Вы лічыце: гэта ўсё так проста?

— Не, не лічу. Але хто-хто, а вы можаце зрабіць для яго больш, чым хто. І добрага, і ліхога, — загарачыўся я. — А зрабіць добрае трэба нават дзеля апраўдання перад Чыгіром, які мог бы быць вядомым вучоным, шчаслівым чалавекам. Чыгір...

Сыч прыклаў палец да вуснаў: ціха! У калідо-

(Заканчэнне на стар. 12).

УВАГА: ЖЫЦЦЁ ЧАЛАВЕКА!

Няспынны рост злачынасці — адна з праяў эканамічнай і сацыяльнай напружанасці ў краіне і рэспубліцы. У нататках намесніка пракурора Мінскай вобласці С. Скаруліса, якія мы прапануем увазе чытача, робіцца спроба асэнсаваць вытокі, прычыны некаторых злачынстваў, хоць, вядома, у межах газетнага артыкула цяжка ахапіць усе бакі гэтай надзвычай складанай праблемы.

Аўтар закранае і тэму суіцыду — самагубства, якая да апошняга часу была амаль забароненай для сродкаў масавай інфармацыі. Ды ад замоўчвання з'ява гэтая не перастала існаваць, наадварот, набыла яшчэ больш пагрозлівыя памеры. Год назад усю нашу грамадскасць скаланула трагічная вестка аб самагубстве таленавітай паэтэсы. Потым была яшчэ адна прыкметная страта: звяла рахунак з жыццём дырэктар аднаго з буйнейшых у Мінску палацаў культуры...

Па рэспубліцы ў мінулым годзе гвалтоўнай смерцю памерла больш за 9 тысяч чалавек, па Мінскай вобласці — каля дзвюх тысяч.

Забойствы ў асноўным адбываюцца на глебе п'янства, у час сямейных канфліктаў, якія часта суправаджаюцца бойкамі. Многія забойствы ўражваюць свайм дзікунствам, жорсткасцю, садызмам. Восенню мінулага года судзілі школьніка са Старых Дарог, які па-зверску забіў пятнаццацігадовую дзяўчынку, перад гэтым згвалтаваўшы яе. Сотні старадарожцаў, якія акружылі суд, з неўразуменнем пыталіся адзін у аднаго: «Як такое магло здарыцца?»

Дзесяць злачынстваў у адзін дзень, у тым ліку згвалтаванне і забойства, здзейсніў у Нясвіжы падлетак, які нідзе не працаваў і не вучыўся.

Першы месяц гэтага года таксама прынёс трывожныя лічбы: у рэспубліцы адбылося 43 забойствы, 119 цяжкіх цялесных пашкоджанняў, 60 згвалтаванняў і спроб згвалтавання, 296 грабяжоў.

Калі гаварыць пра Мінскую вобласць, дык тут за гэты час зафіксавана 7 забойстваў, 13 згвалтаванняў, 36 грабяжоў, 53 выпадкі хуліганства, што значна больш, чым за такі ж перыяд мінулага года.

Людзі з трывогай і абурэннем пішуць пра нахабства злачынцаў, успышкі гвалту і неапраўданую жорсткасць у адносінах да ахвяр, здзекі з іх, катаванні.

Адказам на гэтыя злачынствы павінна быць толькі адно — пакаранне, асуджэнне іх па ўсёй строгасці закона. На жаль, даволі часта даводзіцца чуць разважанні аб гуманным стаўленні да злачынцаў, што на практыцы нярэдка абарочваецца здзекам з пацярпелых, іх блізкіх.

Мне неаднойчы даводзілася прымаць удзел у працэсах, прысвечаных суду над забойцамі. Часам яны выклікалі складаныя пачуцці. Непрыемна было глядзець на нахабныя твары падсудных, на самаўпэўненых адвакатаў, на згуртаванаагрэсіўную заслону сваякоў забойцаў. І ў той жа час нельзя было ўстрымацца ад пачуцця спагады да родных, сваякоў ахвяры, калі амаль кожнае слова іх не абыходзілася без зласлівых каментарыяў часткі публікі, запоўніўшай судовую залу. Атрымлівалася, што шкадаваць трэба не пацярпеўшага, яго родных, а забойцаў. Такая вось мараль навыварат.

Зрэшты, і суды апошнім часам рэдка асуджаюць забойцаў да строгай меры пакарання. Па Мінскай вобласці такое пакаранне (8—15 гадоў пазбаўлення волі) вызначана толькі кожнаму пятаму забойцу. Часцей за ўсё яны атрымліваюць не больш 5—8 гадоў пазбаўлення волі, а бывае і меней.

Натуральна, пакаранне за кожнае злачынства павінна быць строга індывідуальным. Але, тым не менш, я лічу, што за наўмыснае пазбаўленне чалавека жыцця вінаваты павінен несці самую строгую адказнасць.

Ці патрэбна гуманізацыя заканадаўства? Бясспрэчна, патрэбна. Перш за ўсё ў адносінах да тых, хто выпадкова стаў саўдзельнікам злачынства, ці быў на яго справакаваны пэўнымі абставінамі.

Плыні жорсткасці трэба супрацьпаставіць сілу закона, разам з тым выкарыстоўваючы ўвесь арсенал выхаваўчых і іншых сродкаў, якія могуць паслужыць мэтам агульнай гуманізацыі грамадства.

Дэкларуючы гуманнасць, любоў і павагу да чалавека, дзяржава, фактычна, часта не мела на ўвазе жыццё, здароўе, годнасць канкрэтнай асобы. Ці не таму мы сёння часта сустракаемся з жорсткасцю, абыякавасцю, грубасцю ў адносінах паміж людзьмі? Пачалося гэта даўно. Не будзем спыняцца на гадах масавых рэпрэсій, калі гуманныя адносіны да чалавека трактаваліся як буржуазны перажытак. Успомнім, як ухваляўся нашай літаратурнай крытыкай учынак Левінсона ў фадзееўскім «Разгроме», які загадаў доктару Сташынскаму атруціць цяжка параненага партызана Фралова, каб ён не быў абузай атраду пад час выхаду з акружэння.

Нам імкнуліся давесці, што, пазбаўляючы жыцця аднаго байца, камандзір тым самым ратаваў увесь атрад, аднак неяк жудасна рабілася ад гэтай цынічнай арыфметыкі, у ахвяру якой аддавалася бясцэннае чалавечае жыццё.

Ужо колькі пакаленняў людзей выхоўваюцца на прыкладзе цяжкіх, гераічных будняў Паўла Карчагіна. Суровы час, суровыя людзі, бязлітасныя абставіны? Усё так, але ці заўсёды былі апраўданы тыя ахвяры? Успамінаю старонкі славутага рамана, дзе апісваецца, як, ратуючы Кіеў ад холаду, сотні босых і сяк-так апранутых маладых людзей едуць пракладваць вузкакалейку. Чытаеш і думаеш: можна ж было неяк і вокны «зашкліць», дзе начавалі хлопцы, і забяспечыць іх хоць бы нейкім абуткам, канфіскаваўшы яго ў тых жа «буржуяў». Вялікага арганізатарскага таленту для гэтага не патрабавалася, проста тым, хто пасылаў людзей, трэба было праявіць крыху больш увагі да іх, чалавечнасці.

Многія дзесяцігоддзі мы прысягалі пастулату: мэта апраўдвае сродкі. Лічу, што і самая вялікая мэта ніколі не можа апраўдаць пагарду да жыцця, здароўя людзей.

Мы справядліва абураемся «рэвалюцыянерамі», якія лічылі людзей проста «чалавечым матэрыялам», «вінцікамі», ігнаруючы той відавочны факт, што ў «вінціка» ёсць душа, гонар і сумленне.

Гісторыя сталіншчыны — гэта гісторыя вытанчаных здзекаў над людзьмі, жыццё якіх, на думку «правадыра народаў», было таннейшае за некалькі бульбін з калгаснага поля: «крадзеж» іх пагражаў чалавеку турэмным зняволеннем.

1 снежня 1934 года ЦВК СССР прыняў пастанову, якая вызначыла, што следства па справах аб тэрарыстычных арганізацыях і тэрарыстычных актах супраць работнікаў Савецкай улады павінна быць закончаным у тэрмін не больш за 10 дзён. Справы слухаліся без удзелу бакоў. Касацыйнага абскарджання прысуду, як і падачы хадайніцтваў аб памілаванні не дапускалася. Прысуд да вышэйшай меры пакарання прыводзіўся ў выкананне адразу ж пасля вынясення.

7 красавіка 1935 года пастановай ЦВК і СНК СССР была ўстаноўлена крымінальная адказнасць для няпаўналетніх: дзеці з 12-гадовага ўзросту падвяргаліся ўсім мерам пакарання.

Аб гэтым цяпер неяк не прынята ўспамінаць, а, здаецца, трэба было б успамінаць частей, каб такое больш ніколі не паўтарылася.

Неацэннае чалавечае жыццё... Застанецца ў нашай удзячнай памяці подзвіг чарнобыльскіх пажарных, якія палезлі ў атамнае пекла. Але ж не можам мы не думаць і пра тое, што ішлі яны туды ці не ў адных гімнасцёрках. Я не памылюся, калі скажу, што гібель некаторых з іх ляжыць на сумленні тых, хто праектаваў, ствараў АЭС, не прадугледзеўшы пры гэтым бяспеку людзей, якім прыйдзецца там знаходзіцца ў выпадку аварыі. Што і казаць, за подзвігам адных часта стаіць абыякавасць, злачынная халатнасць другіх.

Шмат людзей гіне на вытворчасці. У мінулым годзе, напрыклад, толькі ў Мінскай вобласці загінула 87 чалавек. Нядаўна, у выніку адступлення ад тэхналагічных патрабаванняў і парушэнняў правілаў тэхнікі бяспекі, адбыўся выкід аміяка ў халадзільным цэху Барысаўскага мясакамбіната. У выніку атручвання загінула работніца камбіната, 9 чалавек трапіла ў бальніцу. Хачу заўважыць, што за ўсе гэтыя трагічныя выпадкі толькі 10 службовых асоб было прыцягнута да адказу.

Усё гэта праяўленне нашага дэкларатыўнага гуманізму, пры якім клопат аб чалавеку, яго жыцці і здароўі знаходзіцца на другім плане. Дастаткова сказаць, што асоба, вінаватая ў гібелі людзей на вытворчасці, нясе меншае пакаранне, чым злодзей за кватэрны крадзеж.

Сумны пералік нашых чалавечых страт гэтым не абмяжоўваецца. Летась на Міншчыне амаль 500 чалавек загінулі ў аўтаварыях, 119—у выніку пажараў, 86 — утапілася, больш за 200 атруцілася рознымі сурагатамі спіртнога.

Каб зменшыць гэтыя страты, неабходна выконваць усе прадпісанні ДАІ, паляпшаць дысцыпліну на аўтатранспарце, строга захоўваць пажарную бяспеку, інструкцыі выратавальных службаў. Аздараўленне жыцця, правільная антыалкагольная палітыка спыніць аматараў ужывання любых, самых падазроных ваднасцей — абы ў роце паліла... Калі мы не гатовы яшчэ да ўсеагульнай цвярозасці, хай якаснае, «высакароднае» віно стане даступным без кіламетровых чэргаў. Змагацца з п'янствам вялізнымі чэргамі ля вінных магазінаў, высечкай вінаградзінкаў, рознымі забаронамі — нельга.

З кожным годам у нас павялічваецца колькасць выпадкаў суіцыду. У мінулым годзе, напрыклад, у вобласці пакончылі жыццё самагубствам больш за 400 чалавек. Раней самагубства мы схільны былі тлумачыць або п'янствам, або псіхічнымі адхіленнямі. Зручная пазіцыя, але шкодная, бо затушоўвала праблемы маральнага стану грамадства. Мы, работнікі праваахоўных органаў, гэтаму пытанню таксама не надавалі асаблівай увагі. Мала таго, кожны выпадак самагубства выклікаў не спачуванне да ахвяры, а нейкае ўнутранае незадавальненне: трэба ехаць складаць пратакол, займацца непрыемнай справай, якая і скончыцца гэтым самым пратаколам. Сапраўды, як вызначыць, хто, напрыклад, вінаваты ў тым, што сямікласнік з Любані, атрымаўшы двойку па хіміі, пайшоў з жыцця? Ці вось такі факт. Педагогі Лядненскай школы Слуцкага раёна звярнуліся з пісьмом да кіраўніцтва мясцовага саўгаса «Рачкавічы», каб яно ўздзейнічала на маці вучня 9-га класа, які дрэнна вучыўся. І вось вынік: хлопчык пакончыў з жыццём. Вінаватых зноў не аказалася.

А каго цікавіць лёс адзінокіх людзей? Ні сабесы, ні грамадскасць, ні дэпутатаў, ні школу. Прасцей стаяць «на часах» ля Вечнага агню ў гонар памяці аб загінуўшых на вайне, чым праяўляць клопат аб канкрэтных людзях.

Валянціна С., што жыла на Маладзечаншчыне, праз 10 дзён пасля смерці мужа скончыла самагубствам. Можна не сумнявацца, што штурхнула яе на гэты страшны крок не толькі страта любімага чалавека, а боязь застацца адной, нікому непатрэбнай. Звёў рахункі з жыццём і яе зямляк Іван Г. Следства адзначыла такую дэталь: перад смерцю ён адвёў сваю карову да сына, аднак апошняга гэта ніяк не насцярожыла... А маладая работніца з Жодзіна, якая пакончыла з сабой з-за непаладак у жыцці і рабоце?

Трагічныя выпадкі, пра якія я апавядаю,—папрок усім нам, усім, хто не прыйшоў на дапамогу гэтым людзям, чулым словам, увагай, спагадай не перашкодзіў ім зрабіць трагічны крок.

Сямён СКАРУЛІС.

Ганарар за артыкул аўтар просіць перавесці ў Фонд «Дзеці Чарнобыля».

ЧЫГІР

(Пачатак на стар. 8—11).

ры пачуліся мяккія крокі. Тут жа сюды зайшла гаспадарова дачка. Мы заціхлі.

Маладзіца не была падобная на бацьку, удалася ў іншага чалавека, відаць, у маці, але цяпер, як і бацька, свідруюча зірнула на мяне, што я, скажу шчыра, сцяўся ад гэтага цяжкога позірку.

— Тата, што ты дазваляеш розным... чытаць табе натацыі? — накінулася яна на бацьку, і я здзівіўся, як можа на вачах мяняцца чалавек. Была красуня, тут жа — змяя.

— Выбачайце, — прамовіў я ўзбуджаючыся яшчэ болей. — Я не мараліст.

— Надакучыла!—нервова ўзарвалася яна. — Надакучыла, як усякія папікаюць яго, як тыцкаюць на мяне: твой бацька тады і тады, тое і тое... Што—бацька быў галоўны, усё наладзіў? Бацька тады быў малады, выхаваны на рэвалюцыі і верна служыў. Можа, і ў яго былі памылкі, хібы, але... Не было, чуеце, не было столькі бруду, погані, крыві, як цяпер панапісвалі!

Яна прыпынілася каля кніжнай шафы, запунсавелася і, адчуўшы гэта, паляпала сябе прыгожымі пальчыкамі па поўненькіх шчочках, а пасля раз за разам пачала папраўляць масіўныя акуляры.

— Я ведаю гэтага Чыгіра, мамінага першага мужа, — дадала ўзбуджана. — Ведаю: мама кахала яго, ганарылася ім, верыла ў ягоную вялікую будучыню, як і ўсе маладзенькія дзяўчаткі. Хоць тата і выратаваў яе ад ганьбы, можа, нават і ад смерці, але яна пасля вайны хацела вярнуцца да Чыгіра, памагчы яму акрыяць. Яна згаджалася на ўсе ахвяры, абы быць з ім. Але Чыгір не перамог самалюбства, не ўзяў яе і дваіх дзяцей. Калі яго ў сорак восьмым зноў пасадзілі, мама кляла Цанаву, Берыю, Сталіна, пасварылася з татам. Мяккая, добрая, яна магла зноў загубіць і сябе, і ўсю нашу сям'ю. Яе змаглі суцішыць, але яна назаўсёды ўжо зненавідзела тату і вельмі рана пайшла на той свет. Дык, скажыце, гэты Чыгір ні ў чым невінаваты?

— Не нам судзіць яго, як ён пасля першага вызвалення аднёсся да вашай маці... —сказаў я.

— Не, я не пра гэта, — перапыніла мяне расчырванелая красуня. — Я асабіста рада, што ён адмовіўся тады ад яе. Ну, што ён даў бы ёй, дзецям, мне, каб быў маім бацькам? Нягоды і нягоднасць, пакуты і гібенне! А ён,—кіўнула на бацьку, — даў нам усё. Мы заўсёды мелі хлеб і да хлеба, былі апранутыя і абутыя. І, галоўнае, паўнацэнныя! Я не з тых, хто ганарыцца нястачамі, тым, што з-за іх не шмат дабіўся ў жыцці! Я гляджу на жыццё цвяроза. Калі ласка: мамін першы сын — інжынер-будаўнік, лаўрэат, нікольні не пакутуе ад таго, што не носіць прозвішча Чыгіра, татаў сын, мой родны брат — армейскі маёр, я — кандыдат педагагічных навук, пішу доктарскую... Хоць я стала на ногі, але хіба мне кепска, што бацька мае вялікую пенсію, прымацаваны да добрага стала заказаў, прыладзіў нас да добрай паліклінікі? Хіба блага, што будзе забяспечана будучыня і майму дзіцяці? Дык, паўтару, што — мне ганьбіць бацьку?

— Выбачайце, я ж ні слова не сказаў вам пра гэта, — прамовіў я. — Прыйшоў да Арцёма Аляксандравіча зусім з іншымі, добрымі намерамі, я хачу папрасіць яго...

— Ведаем мы вас, газетчыкаў! — перапыніла мяне Сычава дачка. — Напішаце такое!.. А дзіця маё і так ужо траўміраванае. Не раз, калі па радыё, па тэлебачанню чуе жудасці пра тыя гады, пытае: мама, а што — і дзед наш быў такі, тое рабіў? Я не хачу, каб яно не паважала галаву сям'і, расло непаўнацэнным. Непаўнацэнныя — няўдачнікі ў жыцці...

— Ды, кажу ж, я не прыйшоў абняславіць Арцёма Аляксандравіча. Я хачу, каб ён памог Чыгіру.

— Не штурхайце тату туды, дзе яму можа пашкодзіць!..

— Ціха, Таня, — папрасіў Сыч. — І ўвогуле гэта ўсё ж мужчынская размова...

— Што — «ціха»? — зноў напала на яго дачка. — Не трэба маўчаць, лішняе дазваляць ахмялелым ад гэтай перабудовы... Дарэчы, — перавяла позірк на мяне, — я не чытаю цяперашніх газет, дзе пішуць пра Сталіна і пра ягоныя так званыя злачынствы... Скажу нават больш: Сталін, можа, і мусіў рабіць якраз так. У рэшце рэшт ён выйграў вайну, падняў на ногі краіну і навёў лад. Так што і такія, як мой бацька, рабілі тое, што трэба было... Мой муж, каб вы ведалі, там маёр ужо... І я ганаруся гэтым.

— Гэта ваша справа, Таццяна Арцёмаўна, — спакойна адказаў я. — Як і любіць ці не любіць перабудову.

— Я ненавіджу яе!— разышлася яна. — Жадаю ёй краху! І веру: прыйдзе той, хто завяжа распушчаныя языкі, зноў навядзе лад, ушануе тых, каго цяпер бэсцяць!

— А як вашай маці?

— Што — маці? — здаецца, незразумела маладзіца.

— Хіба ёй там, на тым свеце, не хочацца, каб нарэшце, калі можна, змылі пляміну з таго, каго яна кахала?

Сыч нахмурыўся, зацерабіў касмылістае брыво; яго дачка нібы сумелася, нейкі час завагалася, а потым, здаецца, ужо не мне, а якраз свайму бацьку сказала цвёрда:

— Не, тата нікуды не пойдзе! А калі не паслухаецца, дык я ніколі не дарую яму!

Мар'ян ДУКСА

З новай кнігі

Нашы дзесяцігоддзі

Дзесятыя — нібы ганцы
расплаты...
Падкопы, звяганні і войны.
Фінал прароцтва:
«Брат на брата...»
Маркотны гул айчыннай бойні.

Дваццатыя — галаднаватыя,
калі цвіло надзеяй гора.
Пад гоман рыначны аратаю
пятлю падсоўвалі пад горла.

Ах вы, сібірскія трыццатыя —
сталіцы, вёскі і мястэчкі.
Замёрлі ў страху, як зацятыя...
Вам хочацца паставіць свечкі!

«Саракавыя ракавыя»,
раструшчванне фашысцкай
клеткі,
пароўну — мёртвыя, жывыя...
Прыміце сённяшнія кветкі!

Пяцідзесятыя — наш ранак
вясны — няхай з жытамі
нізкімі.
Уздым. Агонія тырана.
Усмешкі першыя калымскія.

Няроўнасці шасцідзесятых,
раскрадванні сямідзесятых,
дзе дрэмлюць на пярыне штаты
ў чаканні кругленькай
зарплаты.

Васьмідзесятыя — не босыя,
але па-людску не абутыя.
Крыклівыя, мнагагалосыя —
нарэшце, вольныя, раскутыя!

Як хочацца пажыць у радасці,
у цеплыні, святой лагодзе.
Без шуму, плачу і без
крайнасцей
прыйдзіце вы, дзесяцігоддзі!

І будзьце лепш
мануфактурнымі,
чым толькі одамі хвалебнымі.
Не столькі маршамі
бравурнымі —
вы станьце шчырымі
і хлебнымі.

●

О як ты дзіўна любіш!
Паклон адбіўшы злу,
сваіх герояў губіш,
пасля — пяеш хвалу.
Зямля мая, ну штосьці
бяда ў цябе адна:
ўсё пачынаць са злосці,
з крутога бізуна.
Душу найперш каб выняць,
замоўкнуць загадаць —
язык спачатку вырваць,
а потым слова даць.
Але спачатку — пстрычкі,
пасля ўжо — доўг бяры.
Чаму такая звычка,
з якой яна пары?
Жыццё бязбожна секла
сыноў, хто славіў край...
Чаму заўжды праз пекла
яны ідуць у рай?

●

Мы перад імі — на калені:
яны ж — святыя на зямлі...
А што было б, каб Маркс
і Ленін
ажно дагэтуль дажылі?
Мы знаць не можам,
безумоўна.
Ды Маркс — наш слынны
капітан, —
не сумняваюся, грунтоўна б
перарабіў свой «Капітал».
Не будаваў бы Ленін, пэўна,
казарменны сацыялізм.
Тым больш упэўнены, што
гнеўна б
не адпяваў капіталізм.
Яны чарговай кнігай білі б
па іншай цэлі мо якраз.
Яны б карэкцыю рабілі,
як штурманы, дзесяткі раз.
На той дарозе невядомай,
дзе праўда скача, як алень...
І прачыналіся б не з догмай,
а з новай думкаю штодзень.
Засвоіць цяжкія урокі
мы мусім сэрцам і слязой,
што нават моцныя прарокі
не знаюць будучыні ўсёй.

●

След вінаватых прастыў.
Ёсць указальнік падманны.
Вось ён, злачынца, — стыль
бюракратычна-камандны.
Вострыя шышкі — яму.
Ён і з'яўляецца варвар.
Ён збудаваў Калыму.
Ён наша шчасце развальваў.
Гнеў свой жывы пагасі
і супакойся на хвілю.
Толькі з яго, як з гусі...
з гэтага вашага стылю.
Хтось ад народа свайго
ім свой парог адгароджваў.
Нехта ж усё-ткі яго
і запрагаў, і абходжваў.
Нехта і зараз яшчэ
коніка тога старога
гоніць і пугай сячэ,
хоць не спрыяе дарога.

Завіруха 40-га года

Калі б не ты, сляпая завіруха
былой зімы саракавога года,
загінулі б усе мы, нібы мухі,
перетварыўшыся ў кавалкі
лёду.
Не выжыў бы ніхто з маёй
сямейкі —
ні бацька з маці, ні браты
з сястрою.
Нямыя душы выпалі б на рэйкі,
абнятыя сібірскаю зарою.
Напэўна, лёсу страшная пагоня
дагнала б нас. І прастагнаўшы
глуха,
заціхлі б мы ў прастуджаным
вагоне,
калі б не ты, сляпая завіруха.
Калі б не ты, як сіла дапамогі,
што прашумела над маркотнай
хатай
І заваліла гурбамі дарогі
у зборны дзень да станцыі
праклятай.
На гэты раз, відаць,
пашанцавала,
быў люты дзень да нас
надзвычай шчыры.
Пра нас на час, — хоць
верылася мала —
забыліся раённыя вампіры.
А покуль іншых слалі
ці стралялі
у Курапатах пад сваёй зарою,
пакуль чарговы выклік
афармлялі —
вайна загрукатала за гарою.
Калі б не ты... і сэрца пройме
скруха.
Калі б не ты — не зведаў свет
бы мілы...
Ты загадзя, сляпая завіруха,
маё з'яўленне ўсё ж
благаславіла.

●

Над страшным шматгалоссем
салютаў і журбы, —
вы чуеце? — пранёсся
адбойны кліч трубы.
Ён радасны — не грозны.
І чуецца здалёк.
Шкада, што вельмі позні —
вось-вось наступіць змрок.
Спявае кліч адбою.
Узрадуйцеся вы,
хто ўсё ж на полі бою
і цэлы, і жывы.
Вам доля з тварам феі
змагла жыццё сыграць.
Усе свае трафеі
з сабой не трэба браць.
Хоць боль дагоніць востры,
прыцісне, як гарой, —
хай не заве да помсты
ніводзін ваш герой.
Аб чым там злосць варожыць,
прыўзняўшы меч стары?
Няма сцягоў варожых —
ёсць толькі сцяг зары!
За дзень да вечных святаў,
гудзі, трубы набат.
Не танкавых парадаў —
жыві, шароў парад!

«Нас сабраў Скарына»

30 сакавіка ў Доме літаратара мастак Аляксей Марачкін прадставіў грамадзе сваю новую карціну — трыпціх «Скарына і Парацэльс. Дыялог аб вечнасці». Гэты твор жывапісец прысвяціў 500-годдзю вялікага палачаніна. Палатно ў метафарычнай форме адлюстроўвае малавядомы эпізод з жыцця Францыска Скарыны — дыспут у Вільні са швейцарскім урачом Парацэльсам. Гісторыя захавала толькі факт сустрэчы двух геніяў Адраджэння. Канкрэтны змест іх навуковай дыскусіі, аргументы, якімі абменьваліся ў ёй Скарына і Парацэльс, нам невядомыя. Адно відавочна: гэта быў дыялог аб ісціне, вечнасці, фундаментальных каштоўнасцях чалавецтва.

Сваю Скарыніяну А. Марачкін распачаў больш як дзесяць гадоў назад палатном «Скарына. Пачатак». Так, Скарына — пачатак беларускай нацыі. Ягоная асоба нібыта ўвабрала ў сябе святло беларускай зямлі, духоўную моц папярэднікаў — гарачы патрыятызм Рагнеды і Усяслава, мудрасць Кірылы Тураўскага, мужнасць Вітаўта, каб потым асвяціць шляхі Касцюшкі, Каліноўскага, Купалы.

«Нас сабраў Скарына, — сказаў, звяртаючыся да гасцей вечарыны, А. Марачкін. — Яго імя аб'ядноўвае нас ужо амаль 500 гадоў, і будзе аб'ядноўваць вечна». Мастак расказаў пра свой новы твор, пра шляхі, якімі ён ішоў да разумення Скарыны і ягонай эпохі.

Аб творчасці мастака і яго новым творы гаварылі гісторык В. Грыцкевіч, паэт А. Разанаў, мастацтвазнаўца М. Раманюк. На вечарыне гучалі беларускія песні і вершы нашых паэтаў ад часоў «Песні пра зубра» па сённяшні дзень. Харысты капэлы Акадэміі навук БССР выканалі творы беларускай і заходнееўрапейскай класікі. Самадзейныя артысты прадставілі гасцям вечарыны народныя абрады каляндарнага цыкла.

Аўтары і ўдзельнікі літаратурна-мастацкай кампазіцыі мелі за мэту не толькі аповяд пра нашу адвечную спадчыну, але паказ сённяшняга стану беларускай культуры.

П. ВАСІЛЕЎСКІ.

Мартыралог Беларусі: імёны і факты

ЗАПОЗНЕНЫ ПРЫСУД

У дзяцінстве, слухаючы бацькавы аповяды, усё намерваўся іх занатаваць. Выйшла так, што збіраць звесткі і пісаць пачаў пасля ягонай смерці. Шукаў ягоных знаёмцаў, распытваў крэўнікаў, звяртаўся ў архівы...

На пачатку вайны майму бацьку, Уладзіміру Паўлаву, было 16 гадоў. У 1942 годзе ён пайшоў у партызаны, ваяваў у Першым атрадзе 3-й Беларускай брыгады. Летам 1943 года на захад Беларусі рушыла група партызанаў на чале з Васілём Саўчанкам. Ягоным ардынарцам быў мой бацька. Праз паўгода група перарасце ў атрад «Баграціён» і ўвойдзе ў склад брыгады імя Варашылава Вілейскай вобласці. У снежні 1943 года пад час адной з сутычак з праціўнікам на Ашмяншчыне бацька трапіў у палон. Ад смерці на месцы выратавала вайсковая уніформа (палічылі за дэсантніка). Нейкі час бацька знаходзіўся ў турме ў Вільні, потым у лагеры «Правінішкі». У сакавіку 1944 года быў вывезены ў Францыю, дзе ўтрымліваўся ў лагерах для ваеннапалонных «Аш» пад Шэрбургам, з красавіка — у лагеры «Ібервіль». У чэрвені ўцёк з лагера, але быў злоўлены і пасаджаны ў турму горада Рэн, цэнтра дэпартамента Іль-э-Вілен правінцыі Брэтань. З турмы быў пераведзены ў лагер «Бідэй», адкуль на прыканцы ліпеня 1944 года ўсё ж такі ўцёк і натрапіў на байцоў французскага Супраціўлення. Са жніўня 1944 па лістапад Паўлаў (у адной з даведак запісана — Якоб) знаходзіўся ў іншаземнай секцыі 3-га батальёна Ф. Ф. І. дэпартамента Іль-э-Вілен (батальён Андрэ Леклёрка). Пад назвай Ф. Ф. І. (Французскія Унутраныя Сілы) ужо з пачатку 1944 года Нацыянальнай Радай Супраціўлення былі аб'яднаны ўсе ўзброеныя атрады розных груп Супраціўлення. У жніўні 1944 года пасля прарыву фронту нямецкіх войскаў пачалося агульнанацыянальнае паўстанне, так што бацька паспеў, безумоўна, узяць удзел у баявых аперацыях у Брэтані.

Сумесныя дзеянні англа-амерыканскіх войск і сіл Супраціўлення ў Брэтані далі бліскучыя вынікі: атрады Супраціўлення ва ўзаемадзеянні з саюзнікамі вызвалілі амаль усю Брэтань. Уласнымі сіламі байцы Супраціўлення вызвалілі звыш 20 гарадоў Брэтані, у тым ліку Кампер, Канкарно, Ванв. Яны ачысцілі ад рэшткаў нямецкіх войск Брэтань, ізалявалі фашысцкія гарнізоны. Як сведчыць французская даведка, падпісаная камандзірам узвода лейтэнантам Бурзеем, свой пісталет-кулямёт № 4213 баец Паўлаў здаў 13 лістапада 1944 года.

Па сканчэнні баявых дзеянняў у амерыканскай зоне Францыі, у лагерах для рэпатрыянтаў «Катнедан», «Басо», «Барэгар» бацьку, відаць, неаднойчы схілялі застацца на Захадзе. Толькі цяга да родных мясцінаў, да сваёй радзімы, да зямлі аказалася непераадольнай. Праўда, ступіць на родную зямельку і пабачыць сваіх крэўных давялося толькі праз доўгіх сем гадоў.

Сталася так, што пасля праверак у фільтрацыйным пункце НКУС пад Драгобычам бацька быў адпраўлены на Беламорбуд. Добра памятаю горкую бацькаву заўвагу — нашы правяральшчыкі былі значна больш пільныя і жорсткія, чым немцы. Наканавана было бацьку пасля пакут нямецкіх лагераў зведаць і савецкія.

У даведцы 1946 года, дасланай на імя бацькавай маці, а маёй бабулі Лукер'і Сямёнаўны, пракурор Беламорбуда і намеснік начальніка ўпраўлення тлумачыць, што «Паўлаў Уладзімір Максімавіч не можа быць вызвалены ад працы на Беламорбудзе, бо з'яўляецца асобай прызыўнога ўзросту. Ягоны год не дэмабілізуецца з Чырвонай Арміі, таму ён працуе на правах вольнанаёмнага, да асобага распараджэння». Але вольнанаёмнасць гэтая была кароткай. За нястачу куля з рысам, які нейкі прайдзісвет украў з экспедзіраванай бацькам машыны, ён быў спецлагерным судом Беламорбуда асуджаны па артыкуле 162 п. Д Крымінальнага кодэксу РСФСР на пяць гадоў пазбаўлення волі. (Згодна адказу з Вярхоўнага Суда Карэльскай АССР судовая справа знішчана). Перад судом была магчымасць сплаціць нястачу грашыма, але дзе ж было ўзяць тыя грошы, калі сям'я пасылала яму ў якасці харчовай падмогі бульбяное шалупінне?

У лагеры бацька захварэў на сухоты. Свой тэрмін ён дацягваў ужо ў Рэспубліканскай бальніцы Упраўлення выпраўленча-працоўных лагераў і калоній Карэльскай АССР. Дыягназ гучаў як смяротны прысуд: фіброзна-кавярнозны туберкулёз лёгкіх.

У роднае Селішча на Гарадоччыну былы беларускі партызан і баец французскага Супраціўлення вярнуўся толькі ў 1951 годзе. Праглядаю пакінуты ім невялічкі архіў. Дзве даведкі Ф. Ф. І., некалькі пасляваенных фотаздымкаў. Асноўную частку займае перапіска з органамі сацзабеспячэння аб прызначэнні пенсіі. Працаваць бацьку хутка не стала змогі, а патрэбнага на пенсію стажа не хапала. Да таго ж, доўга не мог пацвердзіць сваё знаходжанне ў партызанах — некаторыя былыя народныя мсціўцы адмаўлялі ў сведкаванні нядаўняму зэку. Праўда, знайшліся сумленныя людзі. Пасля доўгай цяганіны бацька ўсё ж дамогся пенсіі інваліда Вялікай Айчыннай вайны.

Памёр бацька 24 лістапада 1976 года. Ён не дужа любіў распавядаць пра свае ваенныя пуцявіны, больш наракаў: за што такая нешчаслівая доля? Але менавіта ад яго мы з братам даведаліся пра знішчэнне беларускай інтэлігенцыі, пра лісты беларусаў да Сталіна, пра лёс бліскучых военачальнікаў грамадзянскай вайны. Ад яго ж нашчадзілі захапленне чытаннем. У шэсць год мой брат на памяць цытаваў усяго «Тараса на Парнасе».

Нічога адметнага бацька быццам і не зрабіў у выхаванні, але здолеў надаць сваім сынам пэўны духоўны патэнцыял. Дай жа божа, каб і ў майго сына з дачкой засталіся не толькі падобныя на мае вочы і рысы твару, але і ўсё тое, што хвалюе і непакоіць мяне.

Міхась ПАЎЛАЎ.

Віншуем!

28 сакавіка споўнілася 50 год літаратуразнаўцу Уладзіміру Мархелю. Праўленне СП БССР павіншавала яго з юбілеем і пажадала ўсяго самага добрага ў жыцці і творчай працы.

Супрацоўнікі «ЛіМа» далучаюцца да гэтага віншавання.

ПАДЗВІЖНІКІ

Гісторыя стварэння аднаго музея

НЕВЯЛІКІ ПАКОЙ застаўлены старымі пацямнелымі абразамі, падрамнікамі, фрагментамі іканастасу. За сталом чалавек дваццаць. Твары ўсе маладыя, усе адзін з адным на «ты», адчуваецца атмасфера дружбы, агульная захопленасць.

З прысутных мне знаёмая толькі Нора Вецер, худзенькая шаравокая маладая жанчына, навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Побач з Норай за сталом — мажны малады чалавек гадоў пад трыццаць. Светлыя кароткія валасы, твар круглы, праставаты, але з жывымі дапытлівымі вачамі. Да яго часта звяртаюцца: «Юра, давай вырашым, калі выязджаем... Юра, паглядзі на гэты абраз...»

— Мы абследавалі пакуль чатыры раёны, семдзесят сем помнікаў,—кажа ён.—У майскія дні зноў паедзем на Брэстчыну. У будучым годзе, думаю, «возьмем» Гродзенскую вобласць. Складзём каталог. А Нору папросім напісаць уводзіны...

За доўгім сталом разгараецца гарачая дыскусія пра вытокі беларускага іканапісу. Ідзе пасяджэнне Клуба аматараў старажытнабеларускага мастацтва.

Узнік ён па ініцыятыве маладога супрацоўніка Інстытута фізікі АН БССР Юрыя Хадыкі. Акрамя фізікі, у яго было захапленне выяўленчым мастацтвам. Сваім захапленнем заразіў некалькіх калег. Яны зацікавіліся імпрэсіяністамі. Захацелі даведацца пра іх як мага больш, звярнуліся ў Дзяржаўны мастацкі музей. Адгукнулася мастацтвазнаўца Элеанора Вецер. Яна прачытала некалькі лекцый пра сучаснае заходнееўрапейскае мастацтва, а потым аднойчы заявіла:

— Не пра тое мы гаворым. Трэба пачынаць з сябе. З вытокаў сваёй культуры...

Вырашылі арганізаваць некалькі паездак па Беларусі, каб апісаць цэрквы, якія яшчэ захаваліся, усё, што ў іх засталося. Зрабіць татальную інвентарызацыю!

Чаму менавіта цэрквы? Ды таму, што іменна там трэба шукаць вытокі нацыянальнага мастацтва. У цэрквах, у манастырах тварылі першыя жывапісцы, рэзчыкі, скульптары. Там пісаліся і захоўваліся першыя летапісныя кнігі.

«Фізікі-лірыкі» дабіраліся да самых малых, амаль забытых цэркавак. Абследавалі там усё: ад сутарэння да паддашка. Сярод смецця і пылу адшуквалі старыя іконы. На свае «семінары» члены клуба запрашалі буйнейшых у рэспубліцы спецыялістаў — гісторыкаў, археолагаў, этнографаў, архітэктараў, рэстаўратараў. Паступова самі рабіліся прафесіяналамі.

У клуба хутка з'явіліся «навабранцы», людзі розных прафесій, захопленых той жа страсцю—знайсці, аднавіць, захаваць усё, што яшчэ магчыма. Душой клуба заставалася Нора Вецер, яе першым памочнікам—Юрый Хадыка, прыроджаны лідэр і арганізатар.

Пачалі з'яўляцца на семінарах некаторыя супрацоўнікі акадэмічнага інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ) з сектара зводу помнікаў, нядаўна арганізаванага. Хутка туды пяройдзе працаваць Э. Вецер. Там яна знойдзе аднадумцаў. Адна з іх—Вольга Васільеўна Церашчатава, энергічная дзелавая жанчына, шчыра захопленая новай для яе справай. Цяпер у экспедыцыі выпраўляліся некалькімі групамі. Усе знаходкі звозіліся ва ўжо знакамітую 119-ю аўдыторыю.

...За доўгім сталом трэці час кіпелі спрэчкі. Хаця, гэта былі хутчэй не спрэчкі, а калектыўны працэс спазнання, адкрыцця «новых зямель».

Я ціха прычыніла за сабою дзверы і выйшла на вуліцу. Быў позні зімовы вечар 1971 года...

ТАК, усё, што апісана вышэй, адбывалася амаль дваццаць гадоў назад. І маладыя фізікі, апантаныя адной гуманнай ідэяй, і пакой, застаўлены старымі іконамі,—усё гэта засталося там, у сямідзесятых гадах. І ў маёй памяці. Той клуб аматараў старажытнабеларускага мастацтва праіснаваў дзесяць гадоў. Потым распаўся.

Але вернемся ў сённяшні дзень.

Ля ўвахода ў будынак аднаго з інстытутаў АН БССР на белым аркушы ватмана выразна выведзена: «Музей старажытнабеларускай культуры». Каб дабрацца да яго, трэба прайсці праз складаныя пераходы некалькіх паверхаў. Нарэшце, перада мной жаданыя дзверы. За імі—першая экспазіцыя музея: жывапіс і пластыка XIV—XVIII стагоддзяў.

Дзесяткі ікон, драўляныя скульптуры. Скрозь пацямнелыя—векавой даўніны—фарбы праступаюць аблічча святых, апосталаў, праведнікаў. Жывыя чалавечыя вочы глядзяць на нас са сцен. Нават для няверніка з гэтых ікон бруіцца святло дабра, вышыні чалавечага духу.

— Вось ікона Багамацеры з Брэстчыны, самая старажытная ў экспазіцыі. Час яе напісання прыблізна XIV—XV стагоддзе, —тлумачыць мне добраахвотны гід Юрый Віктаравіч Хадыка. Гэта ён дзевятнаццаць гадоў назад старшыняваў за сталом у маленькай 119-й аўдыторыі. За мінулыя гады ён стаў доктарам фізіка-матэматычных навук, загадчыкам лабараторыі ў інстытуце фізікі АН БССР. Не згасла і яго захапленне старажытнабеларускім мастацтвам. У гэтай галіне стаў знаўцам, рэдкім спецыялістам, друкуе мастацтвазнаўчыя артыкулы ў сур'ёзных навуковых выданнях. А колькі энергіі страціў гэты чалавек, каб спыніць варварскае разбурэнне цэркваў на беларускай зямлі! Не стамляўся даказваць, што там, у старых храмах,—вытокі нацыянальнай культуры, найкаштоўныя работы невядомых майстроў, якія трэба захоўваць для нашчадкаў. Штосьці яму ўдавалася выратаваць, спыніць нечую руку, гатовую разбурыць безабаронную царкву.

Тут, у самым пачатку музейнай экспазіцыі старажытнага жывапісу, мы развітваемся з Юрыем Віктаравічам.

Цяпер маім гідам робіцца Аляксандр Адамавіч Ярашэвіч. Ён—адзін з былых удзельнікаў таго знакамітага клуба. Ярашэвіч таксама трапіў у поле прыцягнення тых «семінараў». І яно аказалася мацнейшым, чым свет малых часцінак, якім ён аддаваў свае рабочыя гадзіны. Настолькі мацнейшым, што малады вучоны-ядзершчык пакінуў назаўсёды фізіку і стаў супрацоўнікам музея старажытнабеларускага мастацтва.

Але паміж гэтымі падзеямі ён перажыў драму. «Для ўсіх нас, хто наведваў тады семінар, гэта было крахам, сапраўдная драмай»,—гаворыць Аляксандр Адамавіч.

Адбылося гэта ў сярэдзіне семідзесятых, калі пачалі па ініцыятыве «зверху» кампанію па выяўленні злосных «нацыяналістаў». Шукалі іх, у першую чаргу, у асяроддзі інтэлігенцыі, у навуковых і творчых арганізацыях. Вось тады і быў узняты меч над клубам празмерна цікаўных фізікаў. Больш за ўсё сяго-таго біянтэжылі сабраныя іконы і прадметы рэлігійнага культу. І загадалі: усе сабраныя «семінарыстамі» работы (а іх было каля чатырохсот!) без прамаруджання перадаць Дзяржаўнаму мастацкаму музею БССР.

Як ні пратэставалі Э. Вецер, Ю. Хадыка і яго сябры супраць гэтага рашэння—хадзілі, пісалі, даказвалі,—нічога не памагло. Аўдыторыя № 119 апусцела, уся сабраная калекцыя пайшла ў фонды дзяржаўнага музея. Дзіўны лёс аказаўся ў гэтых знаходак. То яны дзесяцігоддзямі марнелі ў невядомасці, у пыле і сажы паўразбураных храмаў, то цяпер аселі ў сутарэннях музея, зноў недаступныя людскім вачам. Толькі частка з гэтай калекцыі (і не самая каштоўная) вернецца потым да тых, хто яе збіраў.

Клуб аматараў старажытнабеларускага мастацтва спыніў сваё існаванне. Паклала заяву аб звальненні з інстытута Э. Вецер.

На шчасце, тая кампанія «палявання на вядзьмарак» у айчынным варыянце цягнулася нядоўга. Успомнілі пра ўрадавае рашэнне — арганізацыю аховы помнікаў культуры. Нельга ж адначасова ахоўваць іх і разбураць, падтрымліваць высакародную справу і забараняць яе! Групе збору помнікаў ІМЭФ далі ўказанне: работу прадаўжаць, помнікі апісваць, экспанаты збіраць (але лепш што-небудзь з этнаграфіі). Зноў выправіліся экспедыцыі ў розныя раёны Беларусі. У іх складзе былі нашы старыя знаёмыя—Ю. Хадыка, ягоныя калегі і аднадумцы — В. Філіпаў, А. Ярашэвіч, Э. Максімава, В. Карэлін, В. Яфімаў. Яны не здолелі парваць з тым, што так глыбока іх захапіла. Аднавілі семінары (клубам гэта цяпер ужо не называлася). Пачала паяўляцца тут і Э. Вецер, часам нават ездзіла ў экспедыцыі са сваімі вернымі аднадумцамі, хоць працавала цяпер у іншым месцы.

Новыя ветры падзьмулі ў самой Акадэміі навук. Набліжаўся яе юбілей—50-годдзе з дня заснавання. Натуральна, хацелася паказаць сябе з найлепшага боку. А тут група энтузіястаў прапанавала: адчынім музей старажытнабеларускай культуры. Ідэю ўхвалілі. Вялікую энергію праявіла Вольга Васільеўна Церашчатава, прызначаная дырэктарам музея. Памяшканне, мэбля, план экспазіцыі, стварэнне сховішча, усё гэта патрабавала часу, сіл, нерваў. Экспанатаў набралася ўжо некалькі тысяч.

У сярэдзіне мая 1979 года, у дні юбілейных урачыстасцяў АН БССР музей быў урачыста адкрыты. З таго часу ён стаў гордасцю Акадэміі навук. Сюды прыводзяць высокіх гасцей. Сюды самі ідуць аматары нацыянальнага мастацтва—дарослыя, падлеткі, дзеці. Тут студэнты мастацкіх ВНУ праходзяць практыку.

Зойдзем разам у залу этнаграфіі і народнага мастацтва музея. Якое свята фарбаў, яркіх, сакавітых, у дзіўных спалучэннях, перапляценнях—на посцілках, ручніках, на ўзорах жаночых убораў! Як многа чырвонага, сіняга колеру! Можна падумаць: над гэтай зямлёй заўсёды ззяла сонца, адбіваючыся ў блакітных вачах азёраў. Але ж мы ведаем, колькі выпрабаванняў выпала на долю беларускага народа, як пераворвалі войны яго нівы, пакідалі ад жытла попел і руіны, абяздольвалі тысячы і тысячы людзей. Здаецца, сама зямля дасюль гэта памятае: ці не ад таго такія няяркія, прыглушаныя яе фарбы, так часта пахмурна-журботныя над ёй нябёсы.

А ў памяці народа, у душах яго мастакоў—не толькі трагедыя, але і вера, спадзяванні, радасць. Дастаткова зірнуць на драўляныя скульптуры народных умельцаў. Колькі ў іх душэўнасці, дабрыні, народнага гумару! Відаць, маюць рацыю тыя, хто сцвярджае, што мастацтва нельга параўноўваць з люстэркам, у якім адбіваецца навакольная рэчаіснасць. Хутчэй гэта люстэрка душы, люстэрка нацыянальнага характару. У ім—бясконцыя жыццястойкасць і аптымізм. Вось адкуль агульны мажорны тон усіх сабраных у гэтай зале рэчаў.

Калі, у якой далечыні часу з'явіўся гэты народ? Адкуль пайшла зямля беларуская? Адказ на гэтыя пытанні—у наступнай зале музея (плён намаганняў археолагаў акадэміі). Кожны стэнд тут—пагружэнне ў далёкае мінулае. Дзесятае, пятае тысячагоддзе назад. Першыя стаянкі людзей... Прашумяць над гэтай зямлёй стагоддзі. Не раз зменяцца плямёны, пакаленні. Нарэшце, узнікне беларускі народ. Рэчы, якія стваралі нашы продкі, карысталіся імі, упрыгожвалі сваё жыллё, свой побыт—вось яны, на стэндах.

Так выстройваецца ад залы да залы музейная экспазіцыя, адлюстроўваючы гісторыю беларускай культуры.

У РЭСПУБЛІЦЫ з'явіўся, дзейнічае адзіны ў сваім родзе музей, які спалучае ў сабе каштоўную мастацкую калекцыю і навуковую базу для сур'ёзных даследаванняў. А першыя цаглінкі ў падмурак гэтага культурнага збудавання былі пакладзены бескарыслівымі людзьмі, энтузіястамі, якія палымнелі высакароднай ідэяй.

Мне зноў захацелася ўбачыць Э. Вецер, чыё прозвішча аказалася такім сімвалічным. Ці ж не з яе дапамогай, не з яе падачы напоўніліся ветрам ветразі гэтай ладдзі, якая рушыла насустрач крутым хвалям?

...Сціплая двухпакаёвая кватэра. Стол, канапа, кніжная шафа. Гасцінная гаспадыня — Элеанора Іванаўна Вецер. Як раней — худзенькая, стройная. І размовы тыя ж — аб праблемах старажытнабеларускай культуры. Гэтаму Э. Вецер аддала, па сутнасці, усё жыццё, выхаваўшы цэлую плеяду паслядоўнікаў. Для сябе ж ніякай выгады не набыла, ніякіх высокіх пасад не заняла. Нават «абараніцца» не паспела, хоць кандыдацкая дысертацыя даўно напісана. Пашкадавала часу на гэтую доўгую і пакутлівую працэдуру. Ёсць у яе і гатовая манаграфія, якую, аднак, не спяшаюцца выдаць. А прабіваць свае работы яна не ўмее. Уся яе энергія па-ранейшаму ідзе ў даследаванні, прапаганду старажытнабеларускага мастацтва. Падзвіжніца, захавальніца старажытнасцей не толькі культурных, а і маральных. Элеанора Іванаўна — чалавек глыбока інтэлігентны — у нашай размове не дазволіла сабе ні слова папроку ў адрас тых, хто некалі адхіліў яе ад семінараў, потым ад музея, хто забывае назваць яе імя сярод яго заснавальнікаў. Яна і сёння лёгка адгукаецца на просьбу правесці экскурсію ў гэтым музеі.

А туды ідуць і ідуць людзі. Многія пакідаюць захопленыя запісы ў кнізе водгукаў. Прывяду толькі адзін—групы мастакоў з РСФСР, якія нядаўна пабывалі тут: «З радасцю і здзіўленнем пазнаёміліся з музеем старажытнабеларускай культуры, які ўзнік літаральна, як фенікс з попелу. Беларуская культура прадстала ў экспазіцыі, як магутны пласт сапраўды народнага мастацтва —цудоўнага ў адвечнасці, самабытнасці, невычэрпнасці. Духоўная культура народа тут матэрыяльна адчувальная».

...У які раз пераконваюся: на падзвіжніках зямля трымаецца.

Д. МАНАЕВА,
журналістка.

ТРЭЦІ ТУР, ЦІ ЎСЁ СПАЧАТКУ?

Як вядома, і другі тур рэспубліканскага конкурсу на помнік Францыску Скарыне ў Мінску быў безвыніковым. Безвыніковым у тым сэнсе, што ніводны з праектаў не можа быць прапанаваны да рэалізацыі; вспыт, які набылі ўдзельнікі — справа іншая, зараз не пра гэта. Што рабіць далей? Добра ўжо тое, што дырэктыўныя органы, здаецца, адмовіліся ад намеру паспець з помнікам да Скарынаўскага свята. Зараз задача-максімум—прадэманстраваць гасцям маючага быць святкавання праект помніка, а саму рэалізацыю праекта адкласці на больш позні час. Гэта ідэя абмяркоўвалася на сустрэчы беларускіх скульптараў з прадстаўнікамі Міністэрства культуры і Фонду культуры, якая праходзіла 30 сакавіка ў канферэнц-зале Палаца мастацтваў.

З боку скульптараў было выказана пажаданне аб змене складу журы конкурсу, увядзенні ў яго асоб, кампетэнтных у галіне архітэктуры і манументальнай пластыкі. Было б няблага, каб узначальваў журы архітэктар (зараз на чале журы—жывапісец М. Савіцкі). Некаторыя ўвогуле прапаноўвалі ануліраваць рашэнні журы па абодвух турах, пачаць зноўку. І на новы конкурс прадставіць як напрацаваныя праекты, але з новай архітэктурнай прывязкай, так і новыя. На пошук новага месца для помніка ці пераасэнсавання прывязкі да каланады Акадэміі навук трэба не меней двух-трох месяцаў. Прыблізна столькі ж часу неабходна і на эскізную распрацоўку помніка.

Прадстаўнік Міністэрства культуры У. Уродніч абяцаў прыняць гэтыя думкі да ўвагі, давесці іх да ўрада рэспублікі, улічыць у новым палажэнні аб рэспубліканскім конкурсе.

В. БОГУШ.

Старонкі ўспамінаў

МОЙ НАСТАЎНІК

Я ведаў акадэміка Гаўрылу Іванавіча Гарэцкага амаль на працягу чвэрці стагоддзя. Наша знаёмства адбылося ў 1965 годзе, калі я прывёз Гаўрылу Іванавічу на водгук сваю кандыдацкую дысертацыю. Я ведаў больш яго як аўтара выдатных прац, многія з якіх непасрэдна тычыліся маёй тэмы, вядома, вывучаў я іх вельмі старанна.

Будучага свайго апанента я наведаў на кватэры. Аказалася ж яна не ў Маскве, а амаль за 100 кіламетраў ад сталіцы ў г. Дзедаўску. Цяпер я ведаю, што нават пасля рэабілітацыі жыць у Маскве Гаўрылу Іванавічу не дазвалялася, каб трапіць на працу, яму трэба было ехаць амаль тры гадзіны электрычкай. Сціплая кватэра ў драўляным доме з выгодамі «ў двары» — такія ўмовы жыцця былі створаны аднаму з першых акадэмікаў Беларусі (падкрэслю: было гэта ў 1965 годзе).

Не буду апісваць прадмет нашай гаворкі. І сёння я ўспамінаю вочы гэтага чалавека, якія глядзелі на мяне добразычліва і ў той жа час пыталі: «Што ты за чалавека? З якой нагоды ты прыйшоў да мяне? Што табою кіруе? Жаданне далучыцца да навукі ці штосьці зусім іншае?» Усе, хто хоць нядоўга працаваў з Гаўрылам Іванавічам, адзначаюць яго добразычлівасць, павагу да людзей. Але гэта не былі адносіны мэтра ці мецэната да малодшага, гэта была павага да чалавека, кім бы ён ні быў. Гэтую павагу можна было і страціць, калі меліся да таго падставы. Мне ўсяго некалькі разоў давялося бачыць Гаўрылу Іванавіча жорсткім. Але гэта была жорсткасць да тых людзей, якія паказвалі сваімі паводзінамі, сваёй працай здраду навуцы, жаданне жыць лёгка, працаваць абы-як, але атрымоўваць тое, што прызначана шчырліўцам...

Шырокая абалонь Бярэзіны. Паміж векавых дубоў стаяць нашы палаткі. У аднолькавых умовах жывуць усе — і лабаранты, і акадэмік. Цяпер шмат гавораць аб прывілеях. Гаўрыла Іванавіч меў адну прывілею — працаваць больш за іншых, кіраваць працай, бачыць усё і ўсіх. Праца ў полі — гэта не проста адпачынак на прыродзе. Калі-нікалі трэба ўзяць у рукі і рыдлёўку, скрынкі з узорамі пород са свідравін — кернам. Часта мы гаварылі чалавеку, якому ўжо было далёка за 60 гадоў: адпачніце, мы самі гэта зробім, але заўжды чулі ў адказ: «Не, я такі ж удзельнік экспедыцыі, як і вы ўсе!»

У Гаўрылы Іванавіча былі два, як цяпер кажуць, хобі — збіраць баравікі і сядзець ўвечары каля вогнішча. Калісьці я чытаў пісьмы Якуба Коласа, які скардзіўся, што стала мала баравікоў. У яго сябра, Гаўрылы Іванавіча, была адмысловая кніжачка, дзе ён натаваў вынікі сваіх баравіковых здабыткаў. У час адпачынку ён часам даставаў яе і прылюдна рабіў выснову: і сапраўды, баравікоў становіцца ўсё менш і менш. Каля вогнішча Гаўрыла Іванавіч часцей за ўсё быў маўклівы і нерухомы. Мне ўсё здавалася, што менавіта ў гэты час ён вырашае самыя складаныя навуковыя пытанні. Аднойчы я запытаўся ў яго, пра што ён думае. Гаўрыла Іванавіч доўга глядзеў на мяне, нібы не разумеючы майго пытання, а пасля сказаў: «Вы ведаеце, сёння я чуў па радыё нейкую мелодыю, дык вось яе і спяваю!»

Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі не раз падкрэсліваў, што Беларусь з'яўляецца класічнай вобласцю старажытных зледзяненняў. Яскравымі прыкметамі, сведкамі гэтых часоў служаць ледавіковыя валуны, велізарныя глыбы крыштальных пород, прынесеных з Карэліі, з раёнаў Скандынавіі. Вядома, што гэтыя каменныя сведкі знікаюць, выбухамі многія з іх ужо перамолаты ў друз, выкарыстаны ў будаўніцтве.

Ідэя Гаўрылы Іванавіча аб захаванні валуноў была адначасова і сціплая і грандыёзная: стварыць на плошчы ў 10 гектараў штучную рэльефную карту Беларусі і звезці з розных куткоў Беларусі валуны, паклаўшы іх на штучныя ўзвышшы і раўніны. Калі вы будзеце ехаць у новы Акадэмгарадок, то каля будынка Інстытута геахіміі і геафізікі вы ўбачыце гэты музей. Ён яшчэ ўладкоўваецца, адбудоўваецца, але галоўнае зроблена, больш чым тысяча найбольш тыповых і цікавых валуноў занялі сваё месца на штучнай рэльефнай карце Беларусі.

Дык кім жа быў акадэмік Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі? Вучоным-геолагам, краязнаўцам, эканамістам, філолагам, арганізатарам навукі?

Па-першае, гаворачы словамі вядомага барда Сержука Сокалава-Воюша, ён быў «нефармальны беларус». Я нарадзіўся і вырас у Беларусі, але толькі ад Гаўрылы Іванавіча чуў сапраўдную, літаратурную беларускую мову, якая была яму роднай. Яна гучала і ў лабараторыі, і ў полі, і на пасяджэннях, дзе прысутнічалі калегі. Мы цяпер маем Закон аб мове. Але чаму ад кіраўніцтва нашай рэспублікі, што выступала па тэлебачанні 25 лютага, мы не пачулі ніводнага роднага слова? Не ведаюць? А, можа, грэбуюць? Па-другое, гэта быў чалавек культуры і інтэлігентны, яго культура была ў сціпласці — сціпласці ў адзенні, ежы, паводзінах, адносінах да людзей. Гэтай вонкавай культуры адпавядала глыбокая ўнутраная культура, асновай якой былі шырокія і ўсебаковыя веды, талент і інтэлект.

Па-трэцяе, гэта быў спецыяліст, прафесіянал, вучоны і практык, імя якога вядома спецыялістам гэтай галіны ва ўсім свеце. Па-чацвёртае, гэта быў працаўнік, зробленае ім за кароткі час, пачынаючы з 1964 года, цяжка пераацаніць: пяць манаграфій памерам больш чым 230 друкаваных аркушаў, амаль 5000 старонак машынапіснага тэксту, не кажучы ўжо пра шматлікія артыкулы, справаздачы...

Сярод навуковых твораў Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага амаль няма напісаных у саўтарстве, чым яго бібліяграфія рэзка адрозніваецца ад спісаў друкаваных прац многіх яго знакамітых калег. Чаму так? Мне здаецца, таму, што ён перш-наперш хацеў быць асабіста адказным за сваё друкаванае слова, за сваю ідэю, вынікі пошуку.

У красавіку ў Маскве і ў Мінску пройдуць чытанні, прысвечаныя Г. І. Гарэцкаму, выйдуць прысвечаныя яму зборнікі навуковых прац і ўспамінаў.

Але ж павінна быць зроблена нешта большае, зроблена і ўрадам і АН БССР, каб ушанаваць памяць аднаго з пачынальнікаў беларускай навукі, вучонага-энцыклапедыста, змагара за шчаслівы лёс свайго народа.

Барыс ГУРСКІ,
доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар.

І. МЕЛЕЖ, Г. ГАРЭЦКІ. 1976 г.

Фота Ул. КРУКА.

ПАМЯЦІ ПАЭТАЎ

На філалагічным факультэце Мінскага педінстытута імя А. М. Горкага адзначана 90-годдзе з дня нараджэння Аркадзя Моркаўкі. Былі запрошаны жонка паэта Ксенія Лаўрэнцьеўна, дачка Ларыса Аркадзьеўна Проніна (якая зберагла ненадрукаваныя творы бацькі), у недалёкім мінулым настаўніца гісторыі, дырэктар школы; унучка паэта Ірына Качаткова — рэдактар выдавецтва «Полымя» і іншыя родзічы.

Яны расказалі пра жыццё А. Моркаўкі, яго любоў да кніг і мастацтва, адданасць педагагічнай працы (ён доўгі час працаваў выкладчыкам у Беларускім політэхнічным інстытуце, які закончыў яшчэ да вайны), незвычайную сціпласць і інтэлігентнасць.

Думкамі пра творчасць таленавітага творцы падзяліліся дацэнты М. Мішчанчук і А. Рагуля, паэт А. Камароўскі.

Вершы А. Моркаўкі прагучалі ў выкананні студэнтаў-філолагаў, у тым ліку і тых, што прыехалі да нас з сонечнай Туркменіі.

І. БАРКОЎСКІ,
студэнт філалагічнага факультэта.

●

Прыдняпроўе маё,
Прыдняпроўе,
Пералескі, крыніцы, лугі...

Гэтыя і іншыя радкі, вершы Васіля Матэвушава гучалі ў Княжыцкай сярэдняй школе Магілёўскага раёна ў дзень, калі б паэту-земляку споўнілася 75 гадоў. Гэтаму быў прысвечаны ў школе і нумар насценгазеты. Пра тое, як В. Матэвушаў падтрымліваў сувязі з роднымі мясцінамі расказаў настаўнік беларускай мовы і літаратуры сябра паэта М. Міхалёў.

Святлана Дубінава, Ала Баранава, Андрэй Арышчанка, Лена Гарбачова, Валя Юркова і іншыя школьнікі прачыталі вершы В. Матэвушава. І. Аношкін і П. Шасцерыкоў выступілі з успамінамі пра паэта.

А. НОВІК.

ВІНШАВАЛІ ЗЕМЛЯКА...

У СШ № 1 г. п. Хоцімска сабраліся настаўнікі гарадскога пасёлка, вучні, прадстаўнікі грамадскасці, каб павіншаваць з 70-годдзем паэта П. Прыходзьку, які калісьці заканчваў гэтую школу. Выкладчыца беларускай мовы і літаратуры М. Мамлієнка расказала аб яго жыцці і творчасці. Вучні старэйшых класаў і настаўнікі прачыталі вершы П. Прыходзькі.

Прысутныя з увагай слухалі расказ юбіляра пра першую настаўніцу, маці А. Куляшова Кацярыну Фамінічну Ратабыльскую. Цёпла сустрэлі хацімчане выступленні П. Прудніка, А. Пісьмянкова, Г. Дзмітрыева.

Літаратурны вечар адбыўся таксама ў клубе калгаса «Перамога». Пісьменнікі пабывалі ў рэдакцыі раённай газеты «Шлях Кастрычніка», дзе адбылася сяброўская гутарка гасцей з членамі мясцовага літаратурнага аб'яднання.

НАШ КАР.

Па старонках друку

«...І рідна Білорусь, як дівчина»

Даўнія сувязі ва ўкраінскага пісьменніка, заслужанага работніка культуры БССР, лаўрэата прэміі «Пачуццё сям'і адзінай» імя Паўла Тычыны Алексы Юшчанкі з нашай рэспублікай. Тут ён бываў неаднойчы, мае нямала сяброў як сярод літаратараў, так і сярод простых чытачоў; беларускай зямлі прысвяціў шмат шчырых паэтычных радкоў.

Летась А. Юшчанка завяршыў паэму «Беларуская сімфонія», якую апублікаваў у адным з нумароў газеты «Літаратурна Украіна». Твор гэты — хутчэй публіцыстычны маналог, у якім поруч з вершамі суседнічаюць празаічныя разважанні пра найбольш значныя падзеі, кантакты і ўзаемасувязі ўкраінцаў і беларусаў, сведкам якіх надаралася быць А. Юшчанку. Арганічна ўваходзяць у тканіну твора і вытрымкі з вершаў некаторых беларускіх паэтаў.

Прызнанне ў любові... Гаворка на пачатку твора мае ў многім традыцыйны характар. Аўтар прыгадвае адну са сваіх паездак на Гомельшчыну, якая дала яму так багата назіранняў, дазволіла яшчэ раз дакрануцца да хараства тутэйшых мясцін, адчуць вабнасць і прыгажосць беларускай мовы: «В словах — і грім, і сонце, й шовк; в словах звучання пребагате, відтінків безліч, кольорів...»

Адразу ж адбываецца пераход да больш даўняй сустрэчы з Беларуссю. У 1962 годзе святкавалася 80-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы. У нашу рэспубліку завіталі і ўкраінскія сябры. Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, незабыўная цётка Уладзя, перадала тады дзве вазы з партрэтам песняра П. Тычыну і М. Рыльскаму. Паўло Рыгоравіч не толькі ўспомніў свае сустрэчы з Купалам і Коласам, але і запытаўся ў прысутных: «Ці ведаеце Купалавага «Паэта і цэнзара»? Пераклад гэтага Купалавага верша, упершыню надрукаванага 17 кастрычніка 1919 года ў газеце «Звон», А. Юшчанка прыводзіць у паэме. Думаецца, неблагі мастацкі прыём. Той, хто знаёмы з гэтым Купалавым творам, ведае, што пясняр прысвячаў яго ранейшым, цяперашнім і... магчыма, будучым цэнзарам. Спашлёмся на арыгінал: «Цяпер ці калісьці— не ўцямлю, а толькі не лгу ні на міг, — паэты пісалі паэмы, а цэнзары рэзалі іх». Праўда, аднойчы цэнзар паступіў інакш: ён «паэмы не сек і не рэзаў, а толькі... пагладзіў крыху». Пасля такога «прыгладжвання» паэта не перажыў, «узяў і памёр». А цэнзар?! Вось як гэта гучыць у перакладзе:

Сидить, від безділля тупіє,
Жбурнув олівець навмання,
І молиться, молиться щиро
За цензорів там він щодня.

Як кажуць, падстава для роздуму. Ды яшчэ якая, пакуль Закон аб друку толькі ў зародкавым стане.

Яшчэ адна сустрэча, пра якую згадвае А. Юшчанка, не на беларускай зямлі, а на ўкраінскай, праўда, на самай мяжы. Памятаецца, тады пра яе і «ЛіМ» расказваў. Творчая група ў складзе А. Асіпенкі, П. Макаля, А. Махнача, У. Крука, Б. Спрынчана зрабіла свайго роду рэйс на цеплаходзе па Прыпяці. Канечне ж, маршрут пралёг і ў Чарнобыль. Яшчэ б, працуе атамная электрастанцыя! Так шмат дае «бяспечнай» электраэнергіі. Сказаць папраўдзе, удзельнікі той паездкі выказвалі і некаторую трывогу, ды, як бы лепш мовіць, толькі ў кулуарах. Афіцыйна ж...

У Чарнобилі—чорнобривці...
Вітерець — по дзвінкій росі.
В хлопця квітка в грайливій гривці.
Чорнобривці — в густій косі.

Сапраўды, «хто б подумав, що горем-бідою день веселий колись вгорне дим», прыйдзе агульная бяда, якая і па сённяшні дзень не толькі не змяншаецца? Яшчэ доўга і доўга не адпусціць нас ад сябе Чарнобыль...

Балючая памяць аб ахвярах сталінізму. У нас — Курапаты, ва ўкраінцаў — свае: «під Києвам, у Биківні, в сосновому лісе, знойдено поховання жертв того ж террору». Сярод ахвяр пазналі па муштуку з надпісам брата народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля Уладзіміра, расстралянага 23 верасня 1938 года. І шле А. Юшчанка паэтычны «Ліст Янку Брылю»— балючы, трывожны.

У паэме пачаргова ідуць гэтыя два пласты — радасці і болю, упэўненасці і трывогі, шчасця і бяды... Што ж, такое жыццё, асабліва ў наш трывожны і неспакойны век, які яшчэ нядаўна з гэткай лёгкасцю мы называлі нават і атамным.

І ўсё ж у «Беларускай сімфоніі» пераважаюць светлыя, лірычныя фарбы. А. Юшчанка згадвае імёны К. Кірэенкі, М. Багдановіча, звяртаецца да рамана «Сэрца на далоні» І. Шамякіна, расказвае пра сваю сустрэчу з П. Прыходзькам у Кактэбелі, прапануе пераклад верша Максіма Танка «Родная мова»... За ўсім гэтым — ода Беларусі, яе народу: «І рідна Білорусь, як дівчина...»

Слова любові гучыць і ў заключных, празаічных радках твора: «...Чую могутню весняну симфонію радості життя, чую пераможний гомін незчисленних морських хвиль, шум зеленокрілля лісів і борів з білоруської землі і хвилі чуттів вливаються в нашу спільну симфонію. Кланяюсь тобі, добрий світе сябрів, квітчаю табе барвінком закоханої душі. Удари чорних вітрів не можуть похитнути нашого братерства».

...Яшчэ адна старонка ў анталогію нашага сяброўства і ўзаемасувязяў!

НАШ АГЛЯДАЛЬНІК.

«ТАКСАМА ПАМЫЛЯЮЦЦА І ТЫЯ...»

Позірк у мінулае

Ідэя суцэльнай калектывізацыі, што выспела ў канцы 20-х гадоў у імперскай свядомасці Сталіна і яго аднадумцаў, закранула не толькі сельскую гаспадарку, але і мастацтва. Яна выдатна адпавядала канцэпцыі цэнтралізацыі ўлады, засяроджання яе ў руках нямногіх людзей, што трымаліся на вяршыні адміністрацыйна-каманднай піраміды з «пікам» Сталіна.

Шматлікія літаратурна-мастацкія арганізацыі, што існавалі ў 20-х гадах, зразумела, не давалі магчымасці трымаць як след «лейцы» ў адных руках, каб скіроўваць адначасова ўсіх мастакоў у пажаданым кірунку, замаруджваць ці, наадварот, паскараць увесь мастацкі рух... Менавіта гэтым тлумачыцца роспуск ва ўсіх рэспубліках у гады «вялікага пераломy» літаратурна-мастацкіх арганізацый. У Беларусі былі ліквідаваны «Узвышша», «Маладняк», «Полымя» і некаторыя іншыя, закрыты іх перыядычныя выданні, асобныя пісьменнікі абвінавачаны ў «нацдэмаўшчыне». Было праведзена своеасаблівае «раскулачванне» ў літаратуры, што ў той час, як правіла, завяршалася арыштамі і ссылкамі. Тым больш, што «кампрамат» знайсці было няцяжка: у гарачай палеміцы паміж асобнымі літаратурнымі суполкамі пісьменнікі нагаварылі шмат лішняга адзін на аднаго, даходзіла нават да палітычных абвінавачванняў...

Урэшце, засталася адна БелАПП (Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў), у якой галоўную скрыпку ігралі Бэндэ і «падбэнднікі» (слова Якуба Коласа): прымалі ў свае шэрагі «ісцінна пралетарскіх пісьменнікаў, каралі або мілавалі «папутчыкаў» і «адраджэнцаў», на смерць змагаліся з «нацдэмамі»... Актыўна сілкуючыся вульгарна-класавымі ідэямі РАППа (Расійскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў), белаппаўцы распаясаліся ваўсю, лічачы, што толькі яны — асноўная моц і надзея савецкай літаратуры.

І вось як гром з яснага неба—пастанова ЦК ВКП(б) «Пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый» (23 красавіка 1932 года). Гэтай пастановай распускаліся ўсе існаваўшыя на той час літаратурна-мастацкія арганізацыі. Ставілася задача стварыць у краіне адзін пісьменніцкі саюз — з адзіным кіруючым цэнтрам, адзіным кіраўніцтвам. Зразумела, найбольш адчувальна гэта пастанова закранула саму БелАПП, якая распускалася (іншыя арганізацыі проста ўжо не існавалі). Янка Купала, Якуб Колас і іншыя пісьменнікі, якіх белаппаўцы пагардліва называлі «спадарожнікамі», «папутчыкамі», безумоўна, не хавалі радасці: яны ўраўніваліся ў правах з усімі астатнімі літаратарамі. Думалася: раз не будзе розных літаратурных плыняў, то скончацца пісьменніцкія сваркі, узаемныя нападкі, настане творчы мір.

Пастанова ЦК ВКП(б) была надрукавана ў «Літаратуры і мастацтве» 30 красавіка. А ўжо ў наступным нумары газеты публікаваліся ўхвальныя пісьменніцкія водгукі на гэту падзею. Выказваліся Янка Купала, Якуб Колас, Сымон Баранавых, Я. Скрыган, П. Галавач, А. Кучар, Максім Лужанін, Кандрат Крапіва, У. Хадыка, М. Кульбак. Каб надаць водгукам дакументальную верагоднасць, друкаваліся факсіміле подпісаў пісьменнікаў.

Безумоўна, усе літаратары віталі партыйную пастанову, гаварылі пра яе надзённасць, своечасовасць. Яшчэ не настаў час востра крытыкаваць БелАПП, і таму амаль усе (за выключэннем народных паэтаў) рабілі рэверансы ў бок гэтай арганізацыі. Так, У. Хадыка нагадваў, што «БелАПП за ўвесь час свайго існавання прайшла вялікі пераможны шлях змагання за кадры пралетарскай літаратуры, за яе гегемонію». Цішка Гартны, (ён разам з М. Зарэцкім і Алесем Дударом выступіў у той жа газеце праз нумар) успомніў «вялікую працу» БелАПП «па арганізацыі пралетарскай літаратуры, па змаганні з нацдэмаўскімі плынямі ў літаратуры, па закліку ўдарнікаў і інш». Сапраўды, у белаппаўцаў былі такія «заслугі»...

Разам з тым у асобных выказваннях утрымліваліся і папрокі ў адрас БелАПП, якая «далёка недастаткова цікавілася работай, творчымі шуканнямі, «творчымі мукамі» пісьменнікаў-саюзнікаў, мала дапамагала ім» (П. Галавач, А. Кучар). Не рэдкімі былі «аднабаковы падыход да адных пісьменнікаў і мінанне другіх» (У. Хадыка), «левыя загібы ў крытыцы спадарожніцкай літаратуры, некрытычнае навешванне ярлыкоў.., адзнакі групаўшчыны і лішнія сваркі паміж асобнымі гурткамі і пісьменнікамі ў самой БелАПП» (Цішка Гартны).

Аднак нягледзячы на такую крытыку, БелАПП не давалася ў крыўду. Кандрат Крапіва, мяркуючы, што «знойдуцца адзінкі, якія зразумеюць пастанову «пасвойму», папярэджваў: «У сувязі з гэтым трэба цвёрда заявіць: пастанова ні ў якім разе не азначае таго, што пралетарская літаратура не апраўдала сябе і таму адбіраюцца ад яе прывілеі, а якраз наадварот: пралетарская літаратура так вырасла і ўмацавалася, што для яе не страшны цяпер уплывы варожых элементаў, што яна здолее пастаяць за сябе ў любы час». Адзін з «варожых элементаў», Алесь Дудар, тут жа, на старонках «Літаратуры і мастацтва», прылюдна «раззбройваўся»: «Перад тымі беларускімі пісьменнікамі, да якіх належу я, якія ў сваім мінулым маюць цяжкі багаж актыўнага супрацоўніцтва з класавым ворагам (?! — **В. Р.**], ва ўсю веліч паўстае задача шчыльнейшага ўключэння ў сацыялістычнае будаўніцтва...»

У тым жа нумары «Літаратуры і мастацтва», дзе былі надрукаваны выказванні пісьменнікаў, змяшчаліся (толькі на апошняй, чацвёртай, старонцы газеты) эпіграмы Цішкі Гартнага на чатырох «спадарожнікаў» — Янку Купалу, Якуба Коласа, Змітрака Бядулю, М. Зарэцкага. Вось як, у прыватнасці, пасміхаўся адзін з пачынальнікаў беларускай пралетарскай літаратуры з Янкі Купалы:

У шкапу за шклом
«Жалейка» з «Шляхам»,
А побач зморaны «Гусляр»...
На іх глядзіць з-пад акуляр
Паэта сумны з нейкім жахам.

Прайшло-мінула шэраг год —
Здалёк напеўныя рулады...
Ён твор змяніў на пераклады,
А юрку нават на фанстрот.

І толькі прыдзе тое лета,
Як думкі шмыгаюць у сад.
Там ліра дбайная паэта
Бранчыць рыдлёўкай каля град.

Крыху весялейшы быў жарт з Якуба Коласа. У адрозненне ад Янкі Купалы, якому амаль не было чым пахваліцца перад бурнай сучаснасцю (калектывізацыю прывітаў усяго адным вершам «Сыходзіш, вёска, з яснай явы»), ён напісаў пра новае калгаснае жыццё аповесць «Адшчапенец». Хаця, праўда, і над ім вісіць груз ранейшых памылак, памылковых твораў...

«Зямля» яго зусім не тая —
Знясла яна на нівах межы...
І вось глядзіць на след іх свежы
«Сымон-музыка», а не грае.
Канцы схавалі «Шляхі волі»
Кудысьці ў цёмнае падполле.
Адзін Прахор — стары праныра —
У калгасе нішчыць непаладкі,
Змяніўшы назву свайго кныра
На свіна-татку.

Ці ж не павінны былі ў такой сітуацыі Янка Купала і Якуб Колас радавацца партыйнай пастанове, якая адкрывала новыя гарызонты творчасці, свяцілася зарою новай надзеі? Якуб Колас у выказванні «За літаратуру, вартую эпохі...» запэўніваў чытачоў, што «пісьменнікі апраўдаюць гэта высокае давер'е партыі сваёй практычнаю высокамастацкай работай...».

«Новы напрамак, які надае пастанова ленінскага ЦК літаратурна-мастацкай справе, сведчыць аб тым, што і ў гэтай галіне мы таксама дасцігнем нявіданых сусветных поспехаў,— пісаў Янка Купала. — Вялікае давер'е, аказанае партыяй савецкім пісьменнікам, якія стаялі па-за пралетарскімі пісьменніцкімі арганізацыямі, само сабой абавязвае іх апраўдаць гэта давер'е і тварыць рэчы, годныя нашае вялікае эпохі».

Спакойная развага чалавека, які намераны сур'ёзна і грунтоўна працаваць на карысць роднага народа. Вера ў тое, што будзе лепш, у тым ліку — і ў літаратурнай гаспадарцы...

Але дзе ж тут будзеш спакойны, калі побач Алесь Дудар, б'ючы сябе ў грудзі, каючыся ў неіснуючых грахах, заклікае: «Класавая пільнасць і баяздольнасць павінны быць даведзены да найвышэйшай ступені». Калі Майсей Кульбак пагрозліва-прароча папярэджвае: «Таксама памыляюцца і тыя, якія думаюць, што з пастановай ЦК паслабне класавая барацьба ў літаратуры, і ластаўка зможа ляцець, куды яна захоча. Якраз наадварот...»

М. Кульбак, на жаль, як у ваду глядзеў.

Неўзабаве ў полымі «абвостранай класавай барацьбы» згарэла большасць з тых, хто вітаў пастанову ЦК ВКП (б) «Пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый»: С. Баранавых, П. Галавач, Цішка Гартны, Алесь Дудар, М. Зарэцкі, М. Кульбак, У. Хадыка... Абгарэў моцна, але ацалеў Я. Скрыган... Усе — члены адной пісьменніцкай арганізацыі.

Ластаўка так і не змагла паляцець, куды яна хацела...

Вячаслаў РАГОЙША.

ЗВІНЕЦЬ ЦЫМБАЛАМ І ГАРМОНІКУ

У рамках III Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці ў Беларускай ССР з мэтай прапаганды народнай інструментальнай музыкі, узбагачэння рэпертуару самадзейных калектываў і выканаўцаў лепшымі ўзорамі нацыянальнай музыкі, эстэтычнага выхавання моладзі калегія Міністэрства культуры БССР, прэзідыум праўлення Музычнага таварыства БССР, сакратарыят Белсаўпрофа, калегія ўпраўлення Магілёўскага аблвыканкома і сакратарыят аблсаўпрофа пастанавілі правесці 7—8 ліпеня 1990 г. у г. Магілёве рэспубліканскае свята народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік».

Падрыхтоўка і правядзенне свята народнай музыкі ўскладзена на Рэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр культуры, рэспубліканскі міжсаюзны Палац культуры прафсаюзаў Беларусі, Музычнае таварыства БССР, упраўленне культуры Магілёўскага аблвыканкома. Свята народнай музыкі заклікана садзейнічаць далейшай прапагандзе народна-інструментальнай музыкі, павышэнню ідэйна-мастацкага ўзроўню рэпертуару выканаўцаў, узбагачэнню яго лепшымі ўзорамі беларускай народнай музыкі і творамі савецкіх кампазітараў, — арганізацыі вольнага часу насельніцтва, больш шырокаму далучэнню моладзі да самадзейнай мастацкай творчасці.

Свята будзе праводзіцца ў два туры — абласныя святы (май—чэрвень 1990 г.) і заключны канцэрт у г. Магілёве 7—8 ліпеня 1990 г. Рэспубліканскаму святу народнай музыкі папярэднічаюць абласныя святы народнай музыкі. Вобласці прадстаўляюць на Рэспубліканскае свята народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» канцэртную праграму (да 4—5 хвілін) з удзелам лепшых аркестравых калектываў, ансамбляў народнай музыкі, ансамбляў гарманістаў, салістаў, гарманістаў, выканаўцаў прыпеван (каля 50 чалавек ад вобласці). Пры падборы рэпертуару неабходна звярнуць увагу на творы, якія адлюстроўваюць рэгіянальныя асаблівасці. Гэта могуць быць апрацоўкі народных мелодый, арыгінальныя творы для аркестраў народных інструментаў, ансамбляў, п'есы беларускіх і савецкіх кампазітараў.

Пры ацэнцы выступленняў аркестравых калектываў, ансамбляў народнай музыкі, ансамбляў гарманістаў, салістаў, выканаўцаў прыпеван улічваюцца выканаўчае майстэрства, мастацкі ўзровень рэпертуару, зберажэнне мясцовых традыцый у музычных творах, рэжысура канцэртнай праграмы, сцэнічная культура, вобразнае рашэнне сцэнічнага касцюма, мастацкае афармленне канцэртнай праграмы.

Лепшыя выканаўцы па выніках абласных свят адзначаюцца памятнымі дыпломамі. Удзельнікі заключнага этапу рэспубліканскага свята па рашэнню журы ўзнагароджваюцца дыпломамі і каштоўнымі падарункамі.

У «КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА»

Ф. БАГУШЭВІЧ. Дудка беларуская. Вершы. Факсімільнае выданне. Мн., «Мастацкая літаратура», 1990.—35 к.

Н. МАЦЯШ. Шчаслівай долю назаві... Лірыка. Мн., «Мастацкая літаратура», 1990.—35 к.

П. ПРУДНІКАЎ. Познія ягады. Вершы, паэмы. Мн., «Мастацкая літаратура», 1990.—70 к.

Б. САЧАНКА. Сняцца сны аб Беларусі. Мн., «Мастацкая літаратура», 1990.—1 р. 20 к.

СЛАВАЦКАЯ ПАЭЗІЯ. Мн., «Мастацкая літаратура», 1990.—1 р. 40 к.

АБ'ЯВЫ

ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ АН БССР аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад

загадчыка аддзела па вывучэнні міжнацыянальных адносін, старшага навуковага супрацоўніка — філолага, навуковага супрацоўніка — мастацтвазнаўцу.

Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы накіроўваць на адрас: 220600, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 01588

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі і нарыса — 33-19-65, аддзела пісьмаў і грамадскай думкі — 33-19-65, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і тэлебачання — 33-21-53, аддзела музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў — 33-24-62, аддзела народнай творчасці і культасветработы — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і фотаілюстрацый — 33-44-04, 33-24-62, карэктарскай — 32-20-64, бухгалтэрыі — 23-73-37.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Андрэй ГАНЧАРОЎ.